НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Газета заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991 №11 (132) 14 ЧЭРВЕНЯ 1999 Г. HTTP://MEMBERS.XOOM.COM/NASA_NIVA



Васілю Быкаву 19 чэрвеня споўніцца 75 гадоў. Крыху больш за год пісьменнік жыве і працуе ў Фінляндыі. Тым ня менш, у дзень свайго юбілею ён атрымае шмат віншаваньняў з Бацькаўшчыны і з усяго сьвету. Добрыя людзі пажадаюць Васілю Быкаву здароўя і натхненьня, а таксама хутчэйшага вяртаньня ў Менск. Рэдакцыя «Нашай Нівы» далучаецца да гэтых віншаваньняў і зычэньняў.

БЕЛАРУСКІ АРМАГЕДОН

Яны кажуць: нельга было прадугледзець... нельга было прадухіліць... Яны цяпер кажуць: віноваты дождж. Спрачаюцца, колькі хто чаго піў, так, нібыта ад гэтага вартасьць чалавечага жыцьця зьмяняецца.

Працяг на старонцы 4.

Ці даводзілася вам калі-небудзь рыхтаваць уласнае дзіця да іспытаў па беларускай гісторыі? Звычайна дарослыя лічаць сябе знаўцамі айчыннай мінуўшчыны, прынамсі, у агульных рысах. Але варта засесьці за экзамэнацыйныя пытаньні, як разумееш, што ступіў на шлях многіх асабістых адкрыцьцяў.

... Першае экзамэнацыйнае пытаньне і адкрыцьцё, якое прыцягнула маю ўвагу — гэта хрысьціянізацыя Беларусі. Растлумачу чаму. Па-першае, нераліґійнасьць беларусаў, пра якую мы пісалі ў адным

ТЭМА НУМАРУ

Даруй нам, Гісторыя

з папярэдніх нумароў, ня можа быць зразуметая без разуменьня пачатку. Як і калі нас хрысьцілі? Па-другое, яшчэ з савецкіх падручнікаў засталося ў памяці тое, як хрысьцілі Кіеў і Ноўгарад. Тады хрышчэньне Русі ўспрымалася ў кантэксьце гісторыі СССР як (дазволю сабе непазьбежны каламбур) хрышчэньне ўсяго савецкага народа, гэта значыць, і нас таксама. Але з набыцьцём незалежнасьці і з распадзелам агульнай гісторыі мы — выпалі. Не знайшоў я ў кнігах пра Беларусь такой велічнай сцэны, як гэта было ў Кіеве, дзе князь Уладзімер заганяе народ у ваду, або як гэта падаецца ў гісторыі Літвы, дзе хрышчэньне літоўцаў ажыцьцяўляе Ягайла. Там, дарэчы, ёсьць забаўны эпізод пра тое, што кожнаму літоўцу, якога Ягайла заганяў у ваду, пасьля выдавалі цёплы швэдар, прывезены з Польшчы.

Працяг на старонцы 9.

Васіль Быкаў

ХУТАРАНЦЫ

Хрэстаматыйная казачка для маленькіх

Пад лесам жыла сямейка. Не багата і ня бедна, дзень і ноч працавала, бяз хлеба ня ела. Зямлі было няшмат, але клопату сямейцы хапала. Сьпярша поле апрацоўвалі бацькі з дзедам, пасьля, як памёр дзед, — бацька з маткай. Пакрысе падрасьлі сыны — Янка і Васіль, упраўляцца стала лягчэй, і хутаранцы былі задаволеныя.

Неяк на пачатку восені, калі, павячэраўшы, сямейка зьбіралася класьціся спаць, у дзьверы пастукалі. Госьцяў у хаце не чакалі, але бацька мусіў адамкнуць дзьверы, — ці мала каму выпала пільніца па начы. Увайшоў сьціпла, хоць і прыстойна апрануты чалавек, сеў на лаве, закурыў гарадзкую папяросу. І пачаў гаманіць. Аказаўся на дзіва гаманкі, дасюль у тутэйшых мясьцінах такіх не трапляла. Увесь сэнс ягонай гаманы палягаў у тым, што хутаране жывуць незаможна, бадай кепска, адстала, і трэба інтэгравацца. Гэта значыць, далучыцца да недалёкай вёскі. Гаспадары недаўменна ўтаропіліся ў чалавека — ужо яны ведалі, як жывуць у суседняй вёсцы. Кожнай вясны адтуль прыбягалі на хутар то па кошык бульбы, меру збажыны, а то пазычыць капейчыну ці даць каня прывезьці дровы. Яны так і сказалі захожаму. А той — сваё. Трэба інтэгравацца, бо іначай не выпадае, увесь сьвет інтэгруецца, трэба сіла, каб супрацьстаяць таму сьвету. Хутаранцы маўчалі, яны не разумелі, чаму трэба супрацьстаяць сьвету?

Працяг на старонцы 14.



Артыкул пра творчасьць Васіля Быкава чытайце на 14-й старонцы.

ШУФЛЯДА

Вязень Ляшук зь вёскі Паніквы

«Я стаў ахвяраю рэпрэсіяў не таму, што «нешта ня тое сказаў», не «па памылцы» пасьля нечага паклёпу... Я сьвядома на гэта йшоў, толькі ня быў дастойны пакараньня — таму, што ня йшоў супраць рэжыму са зброяй у руках. Я проста гаварыў праўду — тую, якую разумеў».

Гэткімі словамі пачаў нашу размову Іван Ляшук – жыхар Пінску, змагар супраць таталітарнага рэжыму, былы палітвязень. Ураджэнец вёскі Паніквы Камянецкага раёну Берасьцейшчыны, ён меў 21 год, калі апынуўся ў берасьцейскай турме за свае антысталінскія вершы. У чэрвені 1953 году быў асуджаны на дзесяць гадоў лягераў і тры гады паражэньня ў правох па двух крымінальных артыкулах: «антысавецкая агітацыя» і «стварэньне злачыннай групы з мэтай падрыву ўлады». Апошнія 45 гадоў гэты чалавек ня бачыў сонца: з ласкі «сонца савецкага народа» Сталіна ды ўсяе камуністычнае сыстэмы ён цалкам страціў зрок. Але гэтае няшчасьце няздолела зламаць ягонага духу.

1.

Спадар Іван быў сямігадовым хлопчыкам, калі ягоную родную вёску ды ўсю Заходнюю Беларусь «вызвалілі» камуністы. З малых гадоў адчуваў на сваім ўласным жыцьці, якую «волю» нясе калгасны лад бацькам, сям'і, аднавяскоўцам... На вёсках пачынаўся голад, за працу ў калгасе людзі нічога не атрымлівалі – ім толькі ставілі «палачкі».

– Часам за дзень і палову «палачкі» не паставяць, – згадвае спадар Іван. – Пашпарты такія былі, што нікуды ня маеш права сысьці з гэтага калгасу. «Вольны» быў чалавек, нібыта пад прыгонам. Памятаю, як у нас не было чаго есьці, а прыходзілі й забіралі апошняе збожжа...

Старшынёй сельсавету была непісьменная жанчына. Ейнае прозьвішча было Гаўрылюк – яна пісала толькі «Гаўр...», далей ня ўмела. І мая маці зьвяртаецца да яе: «Прузына!..» – «Я табе не Прузына!» – хоць сама з тае самае вёскі. «Чым жа сеяць будзем?!» – у роспачы працягвае маці. А яна адказвае: «Пяском сей!»

Памятаю, як прыходзілі ноччу зь ліхтарамі, трывожылі майго бацьку, каб вёз сена, мяса, апошнюю карову... Пакінулі нас, малых дзяцей, без малака.

Як можна было чалавеку, які ўсё гэта разумеў і адчуваў, не шукаць нейкага выйсьця? Я з дзяцінства меў рамантычныя погляды, верыў, што справядлівасьць усё адно хутка настане. У дзевятай клясе, ведаючы, які я ёсьць, мне прынесьлі дзьве старонкі, вырваныя з яшчэ раней забароненае кнігі.

Працяг на старонцы 7.

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду – у панядзелак і пры гэтым эканоміць час і грошы, афармеце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку».

З ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымае 31 газэтны шапік. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (з ліпеня) – 175 000 руб. (4 нумары ў месяц, газэта будзе выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 ў спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі, вул. Жукоўскага, 5, к. 1		18. Крама № 15	вул. Танкавая, 16
2. Партызанскі пункт падпіскі, вул. А. Кашавога, 8		19. Крама № 16	вул. В. Харужай, 24
3. Першамайскі пункт падпіскі, пр. Ф. Скарыны, 113		20. Крама № 17	вул. Някрасава, 35
4. Фрунзенскі пункт падпіскі, вул. Раманаўская Слабада, 9		21. Крама № 18	ст. м. «Плошча Перамогі»
5. Крама № 1	вул. Жукоўскага, 5	22. Крама № 19	пр. Машэрава, 51, к. 1
6. Крама № 2	пр. Ф. Скарыны, 44	23. Крама № 20	вул. Ясеніна, 16
7. Крама № 3	пр. Ф. Скарыны, 76	24. Крама № 21	станцыя мэтро «Пушкінская»
8. Крама № 4	вул. Леніна, 15	25. Крама № 23	вул. Славінскага, 39
9. Крама № 6	вул. Філімонава, 1	26. Крама № 24	вул. Жылуновіча, 31
10. Крама № 7	вул. Якуба Коласа, 69	27. Шапік № 34	гатэль «Менск», пр. Ф. Скарыны, 11
11. Крама № 8	вул. Сурганава, 40	28. Шапік № 136	станцыя мэтро «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі Фізкультуры
12. Крама № 9	пр. Ракасоўскага, 140		
13. Крама № 10	вул. Асіпенкі, 2		
14. Крама № 11	пр. Пушкіна, 77	29. Шапік № 187	гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
15. Крама № 12	вул. Кіжаватава, 80		
16. Крама № 13	вул. Калініоўскага, 82, к. 2	30. Шапік № 262	гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
17. Крама № 14	вул. Валадарскага, 22	31. Шапік № 78	гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19

З ліпеня «НН» стане штотыднёвай

НАША МЯСТЭЧКА РАДУНЬ

Беларускае культуровае жыццё мусіць быць ня толькі ў сталіцы, але і ў мястэчку. Тым больш у Радуні зь яе традыцыямі і калярытам.

За польскім часам Радунь была жыдоўскай. Мясцовыя габрэі трымалі маленькія прыватныя крамы ва ўласных дамах. Ад вуліцы стаяў ганак і сама крама. На ганку віселі рэклямы. Купіць тут можна было ўсё: ад запалак да лейцаў. Тавары прывозіліся пераважна зь Вільні. Заможныя жыды трымалі корчмы, а на радуньскі кірмаш у цэнтры мястэчка зьяжджаліся з усяе акругі. Мясцовая школа рабінаў навучала будучых юдэйскіх сьвятароў для ўсяе Цэнтральнае ды Ўсходняе Эўропы. Срайльмэер Гайм Гавіс Геймніц стаў клясыкам юдаісцкае тэалёгіі.

Жыдоўская Радунь загінула ў час галакосту. Хлопцы Адольфа сагналі яе насельніцтва ў гета, вывелі на ўскраіну (туды, дзе разьмяшчаліся жыдоўскія могілкі) ды застрэлілі жыдоў. Ацалеў толькі адзін.

Пасьля 1944 году ў Радунь прыцягнуліся з усходу саветы з саветкамі (голыя, у вайсковай форме, парваных кірзавых ботах і галодныя, бо кідалі масла ў гарбату) ды занялі дамы забітых жыдоў у цэнтры мястэчка. Гэтае насельніцтва ператварыла сярэднявечнае мястэчка ў савецкі «городской поселок», з яго тыповымі атрыбутамі: правінцыйнасьцю ды аднастайнасьцю.

Такім чынам, жыдоўскае мястэчка стала савецкім.

Неўзабаве хлынуў мясцовы вясковы люд, а затым аднекуль узяліся цыганы, якія заснавалі сваё маленькае паселішча. Во так жыла Радунь.

Мы доўга думалі, як можна нешта зьмяніць, і вырашылі выдаваць сваю местачковую газэту. Ужо больш за паўгады, як «Мястэчка. Першая местачковая газэта ў Беларусі» выходзіць вялікім, як для Радуні, накладам (299 асобнікаў) і карыстаецца стабільнай папулярнасьцю. Свае допісы апублікавалі больш дваццаці аўтараў — гісторыкі і географы, філёлягі й работнікі, прадпрымальнікі й сяляне. Выдаецца наша газэтка на беларускай (тарашкевіцай), польскай і летувіскай мовах. Мы пішам пра ўсё. Асаблівую ўвагу даем актуальнай інфармацыі. Нягледзячы на складаныя ўмовы сёньняшняй Беларусі, выдалі ўжо 9 нумароў (з сьнежня 1998 году). Вакол газэткі склалася суполка аднадумцаў: гісторык, паэт і драматург Алесь Сакалоў, філёляг і паляніст Юзаф Кірвель, гісторык і палітык Іван Піскун, географ і краязнавец, стваральнік Радуньскага гісторыка-краязнаўчага музэю Іван Фясенка, філёляг і паэт Генрых Даржынкевіч.

Нас чытаюць, пра нас гавораць, з нас сьмяюцца і нам зайздросьцяць — адны з чорнай зайздрасьцю, іншыя — з белай. Большасьць жа — паважае. Кола чытачоў стабільнае, адных цікавяць актуаліі, а іншых — сур'ёзнае, вечнае, тое, што застанецца надоўга.

«Мястэчка» пайшло ў масы. Прадпрымальніку Валеру Бучынскаму не падабаюцца разьбітыя дарогі, а таксама адсутнасьць мэра ў месцы. Найбольшае ж раздражненьне выклікае Лукашэнка, ды настолькі, што Валер аж стаў пісаць вершаваныя радкі:

Бацька, хопіць шаманіць,
народ свой дурманіць,
усё болей людзей апускаць у беднату.
Бачна, дарожку ты выбраў ня ту!

Качагар Тадзюк Струхоўскі стварае вершаваную гумарыстычна-сатырычную кроніку Радуньскага сушыльнага заводу.

Цікава, чым адрозьніваецца мястэчка ад «городского поселка». Мястэчка — яно наша, яно непаўторнае, яно эўрапейскае, тое, што застаецца ў сьвядомасьці, у памяці. Інакш бы не прыяжджалі мяцовыя жыды ды іх нашчадкі з далёкіх Амэрык і Ізраілю, не хадзілі б вуліцамі, не разглядалі будынкаў, не здымалі б сваіх родных месцаў на камэры. Жыды маюць настальгію па мястэчку. Саветы й саветкі жывуць у «городском поселке», і таму нічаму не зьдзіўляюцца, бо не разумеюць, чаму тут можна зьдзіўляцца. Звычайны пасёлак, нічым не адрозьніваецца ад іншых, такіх жа звычайных з цэнтральным пляцам і будынкам пасялковага савету ў стылі шырспажыву сямідзясятых гадоў. Жыды тут шукаюць эўрапейскасьці ды самабытнасьці, гармоніі. Саветы й саветкі нічога не шукаюць, бо нічога ня здатныя знайсьці, бо тут няма нічога іхнага — яны прыехалі на чужое і засяліліся ў жыдоўскія хаты.

Нарэшце я дадумаўся, чым адрозьніваюцца жыды й жыдоўкі ад саветаў і саветак. Жыды з Эўропы. Яны прыяжджаюць у Эўропу, у эўрапейскае мястэчка. Саветы з Азіі, і «поселкі» іхныя — нешта азіяцкае. Казалі, што жыды прасілі вярнуць ім будынак мясцовага клюбу, дзе раней была школа рабінаў (пры тым, што абяцалі пабудаваць новы клюб), але саветы ім не вярнулі. Яшчэ жыды прасілі ў будынку «апорнага пункту» заснаваць музэй радуньскага габрэйства. Таксама не.

Адзін радуньскі міліцыянт у запале дыскусіі са мною абураўся, на якіх падставах жыды здымалі на камэры дамы, вуліцы, сьмецьце, бруд і г.д. Вось, маўляў, паедуць і пакажуць па заходніх СМІ, што тут так дрэнна і г.д. Як сьмеціць, то сьмецяць, а як каб людзі пабачылі, дык крыўдуюць «пасялкоўцы».

Віталь Куплевіч, м. Радунь

* * *

Niejak, prahladajučy prahramu telebačańnia, ja zaŭvažyŭ abviestku ab pieradačy z cyklu «Pa rodnym krai» na kanale BT pra Dziaržynsk (Kojdanava). Sčyra kažučy, ja ad hetaj pieradačy ničoha dobraha nie čakaŭ. Dumaŭ, sto ŭ hetaj pieradačy buduć hanarycca dutymi dasiahnieńniami niesmatlikich kojdanaŭskich zavodaŭ, jak heta zaŭsiody robicca na Biełaruskim telebačańni. Vielmi pryjemna było adčuć pamyłku. Vyrasyŭsy pahladzieć pieradaču ab svajoj baćkaŭščynie, ab horadzie, u jakim prajsło majo dziacinstva, ja ŭbačyŭ piśmieńnika, jakoha z čystym sumleńniem možna ličyć nacyjanalnym hierojem — Adama Hlobusa, pačuŭ ź jaho vusnaŭ sapraŭdnuju biełaruskuju movu, pryhožy raspovied ab horadzie majho dziacinstva.

Upiersyniu za aposnija niekalki hadoŭ u mianie źjaviłasia žadańnie vykazać pasanu ŭ adras BT. Heta było tak pryjemna — siarod vialikaha akijanu chłuśni pačuć cikavy histaryčny raspovied na sapraŭdnaj movie ad sapraŭdnaha biełarusa.

Druhim pryjemnym vyklučeńniem z brydkich praviłaŭ, jakich prytrymlivajucca dziaržaŭnyja SMI, źjaŭlajecca Biełaruski hit-parad na dziaržaŭnym radyjo. U hetaj pieradačy časta možna pačuć pieśni, jakija hučać na maładziovych nacyjanalnych tusoŭkach.

Va ŭmovach adsutnaści sapraŭdnych biełaruskich elektronnych SMI treba hramatna rabić vybar z taho, sto jość.

Jahor Hančaroŭ

НАЕЗДЫ НА «СЛОВА НАЦЫІ»

24-га траўня менчукі ладзілі акцыю ў падтрымку засаджанага за краты «агента расейскае алігархіі» Чыгіра. На акцыю прый-шлі таксама хлапцы з стосам газэты «Слова Нацыі» і распачалі продаж. Адразу ля іх непадалёк прымасьціўся барадаты мужык з дыпляматам яшчэ савецкае вытворчасьці. Стаяў-стаяў, дэманстратыўна жмурыўся-касавурыўся. Нарэшце падышоў, злосна запытаўся, што за газэта, што за арганізацыя. «Вольныя Нацыяналісты!» — «А што такое нацыяналізм?» — «Вернасьць, адданасьць сваёй Нацыі». Тады барадаты кажа: «Валіце отсюда, тут мітінг демократов, а не фашістов». Барадзе запярэчыў Славамір Адамовіч, спытаўся, а хто ён такі. Барада пасьведчаньня ня даў, абмовіўшыся, што ён «арганізатар, з АГП».

Адметна, што за мітынгам убаку назіраў вусаты чалавек з напаўазіяцкім тварам, куратар беларускае філіі РНЕ (прозьвішча мы шчэ ня ведаем.) Пакуль агэпэшнік-лібэрал наяжджаў на беларусаў, фашыстовец спакойненька назіраў. Вось так, спадары белоруссы!

Ня любяць нас, беларускіх нацыяналістаў, расейскамоўныя лібэралы. Ну й халера зь імі. Бо расейскі фашызм можа быць зьніштожаны толькі адным. І вы ведаеце чым.

Амелька Злыдзень

* * *

Падтрымаўшы ініцыятыву НАШАЙ НІВЫ «ДЗЕНЬ БЕЗ ЧУЖОГА СЛОВА» Беларуская Музычная Альтэрнатыва прапанавала адмовіцца таксама і ад чужой музыкі. Было вырашана распачаць шырокую акцыю «СЛУХАЙ СВАЁ! ПАТРАБУЙ БЕЛАРУСКАЕ!» Асаблівая увага ў гэтай акцыі надаецца FM станцыям. Усім сьвядомым беларусам прапануецца тэлефанаваць на радыё і замаўляць беларускія песьні. Як аказалася, FM станцыі ня супраць пускаць у эфір беларускія кампазыцыі, але якасьць аўдыякасэтаў (большасьць беларускай музыкі выдаецца менавіта на іх) іх не задавальняе. Таму БМА разаслала ўсім беларускім і некаторым замежным радыёстанцыям CD «ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ: СЛУХАЙ СВАЁ!», выдадзены сумесна з Беларускім Хельсынскім Камітэтам, на якім ёсьць запісы практычна ўсіх беларускіх гуртоў. Будзем спадзявацца, што зараз сытуацыя зьменіцца. Інфармацыю аб тым, якім чынам замаўляць песьні, можна атрымаць шточацьвер на паседжаньнях МАЛАДОГА ФРОНТУ з 19.00 па адрасе Менск Варвашэні 8. Зацікаўленым у супрацоўніцтве можна зьвяртацца: а/с 5 Менск 220085

Такім чынам: «СЛУХАЙЦЕ СВАЁ і ПАТРАБУЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ!»

Знакам тым

Цана ўсёдазволенасьці

Вольга КАРАТКЕВІЧ

Пра трагедыю я даведалася ўвечары 30-га траўня... Затэлефанавалі са Швэцыі. Шакаваныя скандынавы, якія нядаўна перажылі жахлівае здарэньне ў Гётэборгу, калі пад час выбуху на дыскатэцы загінулі дзясяткі маладых людзей, задавалі адно пытаньне: ці праўда, што жывыя йшлі па жывых, зьнявечаных і мёртвых? На наступны дзень сябры з усяго сьвету спачувалі і задавалі ўжо два пытаньні: ці праўда, што маладым раздавалі піва і як гэта няма вінаватых? Праз больш як тыдзень трэба даваць камэнтары — чаму ня ўзбуджаная крымінальная справа па факце здарэньня 30-га траўня ў пераходзе станцыі мэтро «Няміга», і генпракурор Бажэлка дакладае Лукашэнку аб хадзе рассьледаваньня, чаму ўтвораная адмысловая камісія ня выканала заданьня падрыхтаваць справаздачу прэзыдэнту да 10-га чэрвеня, а Аляксандар Лукашэнка таго ж 10-га гаворыць, што няма вінаватых...

Бываюць сытуацыі, калі хочаш і можаш адно маўчаць. Гаварыць пра гэта прымусілі два факты. Першы: 31-га траўня ў невялікай хлебна-кандытарскай менскай краме было ўключанае радыё «Альфа». Прадавачка гаркнула на чаргу: «Цішэй». І паклікала супрадавачак — ідзеце, слухайце... Быў ужо, відаць, 5-ты выпуск навінаў пра ахвяры на Нямізе, з усё той жа інфармацыяй. Прадавачка выглядала задаволена — яна працягвала быць правайдэрам гэтай інфармацыі... І другі факт. У пераходзе станцыі мэтро «Кастрычніцкая» ў той ціхі панядзелак — 31-га траўня — некалькі маладых хлопцаў гульліва папіхвалі адзін другога. І мяне за кампанію. Я зрабіла заўвагу, а яны проста пажартавалі: «Ну, трэба ж да круглай лічбы...»

Мне ня хочацца верыць, што ў пераходзе на станцыі мэтро «Няміга» 30-га траўня пад час трагедыі пасьля воклічаў, што паміраюць людзі, іншыя, тыя, хто стаяў мінімальна камфортна, пілі піва. Мне ня хочацца верыць, што кіроўцы, якіх спынялі і прасілі адвезьці напаўпрытомных дзяцей у шпіталі, адмаўляліся і аргумэнтавалі, што, маўляў, забрудзяцца сядзеньні. Мне ня хочацца верыць у тое, што можна пераканаць грамадзтва ў тым, што няма вінаватых. Мы, журналісты, так і не дазналіся пра тое, ці быў плянаваны рэглямэнт паводзінаў органаў правапарадку на мерапрыемстве 30-га траўня. Мы, людзі, так і не зразумелі, што рухала натоўпам... Бо нас там не было. Ацэньваць праз дадумваньне ці аналіз — цынічна набіраць дробныя ўласныя дывідэнды. Каб толькі ня чуць ад маладых хлопцаў пра «круглую лічбу»...

Аднак The Show Must Go On. Як жа йнакш трымаць народную ўвагу? Віктар Ілюхін заклапаціўся пра Гарадзенскую вобласьць Рэспублікі Беларусь і лёс беларускага прэзыдэнта. Маўляў, у дзеяча расейскіх камуністаў ёсьць зьвесткі пра рыхтаваную правакацыю ў гэтым рэгіёне супраць ППРБ і ягонай нацыянальнай палітыкі. Апошні, наведваючы прадпрыемствы міністэрства сувязі, падхапіў і зазначыў, што розныя спэцслужбы сяброўскіх краінаў пра пляны НАТО даносяць, але ж Беларусь — не Югаславія. І зь Беларусяй так размаўляць, як зь Югаславіяй, нікому дазволена ня будзе. Чарговая «кузькіна маць» падрыхтаваная. Сродкі СПА кантралююць усю тэрыторыю краіны. А калі Мілошавіча будуць крыўдзіць і надалей, дамо яму палітычны прытулак. Так гаварыў прэзыдэнт. А я ўзгадваю словы свайго прыяцеля з апазыцыйнага Мілошавічу бялградзкага радыё Б92, якое Мілошавіч неаднаразова закрываў. Мой прыяцель прызнаваўся: «Не хацелася б жыць у краіне, падобнай да Югаславіі. Як ваша, напрыклад...»

Аляксандар Лукашэнка не пакідае шанцаў сваім апанэнтам хоць неяк перахапіць ініцыятыву. Балканы? «Прайгралі мы ўсе, — гаворыць прэзыдэнт. — Яшчэ гэта пабачым». Круглы стол у Бухарэсьце? Паважаем АБСЭ. Але на тэрыторыі Беларусі. 20-га ліпеня? Калі ласка, «Славянскі базар». Верасень? Выбары? Няма часу — усе на Шклоўшчыну, на «Дажынкі».

Інфляцыя рацыяналнага і градацыя ўладаненажэрства спарадзілі татальную ўсёдазволенасьць. Кошт гэтай усёдазволенасьці — мазаіка гульбішчаў і сьлёзаў, безагаворачнае апраўданьне свайго бязглуздага існаваньня, разбураны імідж краіны, узгадаваны новы «суаўтар эпохі» — беларус-чалавек-спажывец, які стравуе аднолькава хутка трагедыі, паразы, ганьбу, дробненькі посьпех, каханьні, не адрозьніваючы атруты ад бальзаму.

Год Скочку – год пракурору

Барыс ТУМАР

У пятніцу 11 чэрвеня судзілі Яўгена Скочку, намесьніка Паўла Севярынца з «Маладога Фронту», за тое, што ён павёў моладзь на Дзень Сьвятога Валянціна лісты насіць па пасольствах заходніх краінаў, а пасьля каля рэстарану «Белая вежа» вялікага фаервэрку нарабіў з пэтардаў, напалохаўшы моцна міліцыянтаў. Гэта ўжо ня першы і ня трэці раз, што яго цягаюць па судах. Упершыню ён трапіў за краты яшчэ 26 красавіка 1996 году пасьля «Чарнобыльскага шляху», калі яго схапілі ва Ўправе БНФ. На гэты раз Я. Скочку засудзілі на год умоўна з высылкай «на месца прапіскі» ў Гомель. Пракурор прасіў два гады, але суд столькі ня даў. Пасьля суду юны партызан прыехаў у рэдакцыю «Нашай Нівы».

«У 96-м амонаўцы кінулі ў машыну і сказалі, што павязуць у Курапаты, – расказвае Я. Скочка. – Дык пасьля гэтага ўсіх судоў ужо не баішся. А ў Гомель мяне могуць запраторыць толькі пасьля разбору «касаткі» ў Вярхоўным судзе, недзе месяцы праз тры. Так што ў ліпені я буду тутака. Удзельнічаць мне забараніў суд, але ж я пазаштатны карэспандэнт «Беларускай маладзёжнай», і не магу не выконваць свайго прафэсійнага абавязку. А са жніўня мяне бяруць у Менску на працу, і таким чынам у мяне зьявіцца менская прапіска, і я застануся тут. Апроч таго, я паступаю ў Акадэмію мастацтваў на рэжысэра».

Мабыць, па прадмеце «вулічная рэжысура» М. Пташук, які робіць набор сёлета, паставіць Скочку «5». Акторскае ж майстэрства абітурыент правяраў у турэмных камэрах.

«Калі трапляю ў «хату», я пачынаю моўчкі хадзіць, сам першы не загаворваю і не сядаю, пакуль да мяне ня скажуць. А калі адзавуцца, размаўляю па-беларуску, і мне адразу прапануюць лепшы «шканар».

На суд прыяжджаў Скочку падтрымаць сам нядаўні палітвязень Уладзімер Плешчанка.

Зянон Пазьняк: словы, справы, працэс

Адзін з важных вынікаў травеньскіх прэзыдэнцкіх выбараў — гэта нацыянальна-дзяржаўная эвалюцыя беларускіх дэмакратаў. Шарэцкі, Ганчар, Чыгір гавораць пра прыярытэт нацыянальных інтарэсаў, пра безумоўную незалежнасьць краіны і яе эўрапейскую арыентацыю. Старшыня БНФ характарызуе іхныя словы як блеф. І вось чаму. Іх сапраўды аб'ектыўна зносіць у тую нішу, якую дагэтуль манапольна займаў Фронт і ягоны лідэр, а гэта значыць, што БНФ страчвае сваю манаполію на патрыятызм, што ня можа ня выклікаць незадаволенасьці Пазьняка і паслабленьня або рэфармаваньня БНФ.

Аб'ектыўна гэтая манаполія, якая ў свой час адштурхнула ад Фронту нацыянальную інтэлігенцыю, выяўлялася найперш у прамовах лідэра, які падзяляў беларускіх палітыкаў на нацыянальна чэсных і нацыянальна нячэсных. БНФ у гэтым сэнсе часьцяком нагадваў сабаку на сене. Аб'яднаньне дэмакратычнае апазыцыі было праблематычным з-за таго, што Шарэцкаму катэгарычна забаранялася шчыра любіць Войшалка, а Багданкевіч проста ня мог гаварыць па-беларуску, бо адчуваў, нібы без дазволу бярэ чужое. Словы незалежнасьць і беларушчына сталі прыкметамі «прапазьнякоўскай» пазыцыі. Трэба думаць, што трохгадовая віртуальнасьць старшыні Фронту толькі затрымала названаю манаполію, для якой у рэальнасьці падставаў не засталося.

І вось пасьля выбараў прэзыдэнта лёд скрануўся. Нават апальны міністар Лявонаў у сваім адкрытым лісьце на імя Лукашэнкі заклікае не гандляваць незалежнасьцю Бацькаўшчыны. Яшчэ трохі, і ён скажа пра расейскі імпэрыялізм. Што тады застанецца казаць Пазьняку, чый палітычны капітал па частках расьцягваюць то той, хто загаварыў па-беларуску, то той, хто загаварыў пра незалежнасьць? Пазьняку застаецца паўтараць, што яны гэта робяць цынічна, што яны блефуюць.

Даўно заўважаная дэталь — наймацней дастаецца ад Пазьняка тым, хто нібыта блізкі да яго паводле палітычных поглядаў. Менавіта за гэта і дастаецца — заходзяць на «ягоную тэрыторыю». З апошніх такіх уварванцаў — беларуская служба Радыё Свабода і... намесьнікі старшыні БНФ. Яшчэ раней Пазьняк не знайшоў паразуменьня з Барысам Рагулем, калі той спрабаваў памірыць лідэра Фронту з Шушкевічам, і Радаю БНР. І тут, як і ў сытуацыі з БНФ, дзе на замену сваім даўнім паплечнікам і адданым беларушчыне людзям Пазьняк шукае асобаў, якія, акрамя асабістае адданасьці, не вызначаюцца нічым, на замену Радзе БНР, як абсалютнаму аўтарытэту, падшукваецца іншае «кола старэйшынаў». Харызматычнаму лідэру патрэбны вышэйшы адстаронены аўтарытэт, дзеля чаго Лукашэнка, да прыкладу, выкарыстоўвае мітрапаліта Філарэта. На гэткую ролю Пазьняком была абраная Рада Таварыства Беларускай Культуры ў Літве.

1 чэрвеня лідэр БНФ, вяртаючыся з канфэрэнцыі ў Латвіі, правёў з сябрамі Рады ТБК гутарку, запіс якой мы сёньня прапануем чытачам «НН».

КУТУЗАЎ БЫЎ ВЯЛІКІ ЧАЛАВЕК

Сябра Рады ТБК: Нас зьдзівіла, што Вы адмовіліся ад удзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах. У нас былі надзеі, што выбары выкрышталізуюць сытуацыю ў Беларусі, былі надзеі на, можа, ня поўную перамогу, але на сілу, якая ўмацуе дэмакратаў, якія ідуць на гэтае мерапрыемства. Чаму з гэтага ўсяго атрымаўся нейкі пшык, плюс Лукашэнку?

Пазьняк: Тады давайце па сутнасьці. Усе вы сілком навучаныя рускай гісторыі, усіх вучылі ў сталінскай школе. Там ёсьць і павучальныя моманты. Вось вайна з Напалеонам. Адбылася Барадзінская бойка, дзе Напалеон разьбіў рускія войскі, але вам гэтага не казалі, казалі наадварот. Поўнасьцю армію рускую ён ня зьнішчыў, армія руская засталася. І Напалеон прадаўжае наступ на Маскву. Дарога адкрыта. Руская армія ўжо ня можа процістаяць Напалеону. Яшчэ адна бойка, і ад яе нічога не застанецца. Зьбіраюцца ўсе генэралы на нараду, савет у Філях. І ўсе выказаліся за такую пастанову – легчы касьцьмі, не пусьціць француза ў Маскву, па-сталінску. І адзін Кутузаў сказаў: здаём Маскву і сахраняем армію. Ён быў фэльдмаршал, і яго слова значыла ўсё. Каб гэта быў дэмакратычны парлямант, дык Расеі быў бы канец – і арміі, і ўсяму. Так вот, гісторыя паказала, што Кутузаў зрабіў вельмі правільны крок, хаця яго праклінаў цар, пракліналі ўсе. Цар нічога ня мог зрабіць. Але пасьля таго, калі ён ужо і вайну выйграў, цар яму гэта не дараваў. Кутузава адправілі на вёску гусей пасьвіць. Калі ж разабрацца, то ён Расею выратаваў.

Сытуацыя з выбарамі ў Беларусі абсалютна ідэнтычная. Толькі Кутузаву ня трэба было тлумачыць ні цару (цар гэтага ўсё роўна нічога не разумеў), ні тым генэралам, якія хацелі, як там кажуць, памерці пад Масквой, ні салдатам, нікому. Ён узяў на сябе гэту ролю і ён зрабіў. У гэтым сэнсе, хоць гэта наш вораг, але гэта быў вялікі чалавек.

ХАРТЫЮ МЫ ПРАВАЛІЛІ

Сытуацыя з выбарамі такая самая. Усё не растлумачыш усім, таму што гэта складаная палітыка, якую цяжка растлумачыць у грамадстве, пазбаўленым інфармацыі. У грамадстве, дзе адкрытая інфармацыя, усё робіцца на віду. Вот я жыву ў Амэрыцы, і мяне часам аж сьмех бярэ, таму што там усё на віду: што нехта рот раскрыў, што Пэнтагон думае, усе сакрэтныя планы... Яны ня знаюць, куда ад этага дзецца. Грамадзтва там ведае ўсё. Я ўжо не кажу, што кожнай жонцы там пад спадніцу заглядваюць усе гэтыя таблоіды, гэта ладана, але гэта поўнасьцю адкрытае грамадзтва. У такім грамадзтве палітыкам з аднаго боку, як кажуць, цяжка, з другога боку, лягчэй. Таму што грамадзтва інфармавана.

А вот на Беларусі мы жывём у такім стане, калі людзі ня толькі пазбаўлены інфармацыі, але яны яшчэ дэзынфармаваны і замбіраваны. Яны сур'ёзна баяцца вайны – зараз на Беларусь НАТА будзе кідаць атамныя бомбы! Яны вераць гэтаму, таму што так працуе прапаганда. Спачатку напалі на Сэрбію, а цяпер на нас нападуць. Таму ў гэтым грамадзтве тую ролю, якую ўзяў я на сябе па выратаваньню Беларусі, выратаваньню Фронту, бо нічога б ужо не было, я павінен быў узяць на сябе, і ўсе пляўкі, і ўсе крыкі, і воплі, і ляманты, і прапаганду, і ўсё. І я гэта ўзяў не таму, што я ня ведаў, што так будзе, я ўсё ведаў. Але я вам скажу, што я адчуваю сябе духоўна вельмі моцна, таму што калі ты адчуваеш сваю правату, то гэта як веруючы чалавек, хай увесь сьвет будзе супраць цябе, але ў цябе ёсьць вялікая ўпэўненасьць, што ты нешта выратаваў. Праходзіць час, і гэта ўсё ўстанаўліваецца. Такая лёгіка. Дык вот, пройдзе час, ня будзе Лукашэнкі і гэта ўсё ўстане на свае месцы.

Але я вам раскажу, бо чым болей людзей, якія ў эліту нашу нацыянальную ўваходзяць, будзе ведаць, тым будзе лепш, бо ніхто, акрамя іх, не давядзе да іншых.

Сытуацыя з выбарамі атрымалася такая. Усе важныя палітычныя акцыі, якія на Беларусі робяцца ўжо даўно, кантралююцца Масквою. Паколькі Масква ажыццявіла акупацыю, яна паставіла свайго прэзыдэнта, і агенты ФСБ займаюць усе ключавыя пазыцыі ў Беларусі. Міністры: Латыпаў, скажам, замежныя справы, ключавая пазыцыя, палкоўнік КГБ, ён жа не скрывае гэтага, яны адкрыта праводзяць палітыку. Старшыня КГБ, намесьнік старшыні КГБ, кіраўнік савета безапаснасьці Шэйман і ўсе члены безапаснасьці, літаральна ўсе – гэта супрацоўнікі ФСБ і грамадзяне Расеі. Праводзіцца такая акупацыйная палітыка.

Так вот, галоўная задача Масквы – зьнішчыць Народны Фронт. Таму што калі яны захапілі ўладу ў Беларусі, то павінны захапіць і апазыцыю. Яны павінны стварыць сваю апазыцыю. Гэта правіла спэцслужбаў. Таму ўсе гэтыя чатыры гады ішоў іхны накат, маўляў, аб'едзініць усех дземакратаў, зрабіць каардынацыйны савет... Гэта ўсё элемэнтарныя нормы працы спэцслужбаў. Ствараюць мноства маргінальных партый і вялікі рух стараюцца ўцягнуць у агульную працу з імі. А працы ніякой ня можа быць, таму што за імі нічога не стаіць. Але ў іх ёсьць галасы. Яны ўводзяць гэтае балота, пачынаецца валтузьня і вялікая арганізацыя зьнішчаецца, расьцягваецца. Так была створана Хартыя. Але Хартыю ўжо раскусілі даўно, яна ўжо нічога ня значыць. Але яна была створана з мэтай расьцягнуць Народны Фронт, замяніць яго другой, больш шырокай канцэптуальна як бы ідэяй і выкарыстаць гэта на выбарах. Гэта мы правалілі ўсё.

ТАКІХ ЗАРПЛАТ НЕ БЫВАЕ

Год назад я пісаў у артыкуле «Вяртаньне БНР» аб тым, што рыхтуецца Чыгір на прэзыдэнта Беларусі. Што ён будзе прадстаўлены як лідэр, пад гэта была падрыхтавана Хартыя і гэтак далей. Гэта выклікала скамарошы сьмех усіх гэтых аналітыкаў, гэтых дзіўных людзей. Праходзіць год, паяўляецца Чыгір.

Была праведзена адпаведная падрыхтоўка, каб гэты працэс выбараў кантраляваць. Масква павінна ўзяць іх у свае рукі. Было б непрафэсійна, каб апазыцыя ў Беларусі пачала бескантрольныя выбары праводзіць. Гэта выключаецца. Я мог бы гаварыць пра гэта дакладна, нават ня ведаючы фактаў.

Чыгір рыхтаваўся даўно. Гэта чалавек зь мяккім характарам, даволі далёкі ад палітыкі і быў бы лёгка кіруемы. Потым гэта чалавек мала вядомы, ня вельмі замазаўся, яго вывелі, каб пра яго трохі забылі. І псыхалягічна прыходзіць як бы чалавек збоку. Тут усё было нядрэнна прадумана. Чыгіра выводзяць у Маскву, цэлы год ён там працуе, яму даюць зарплату 10 тысяч даляраў у месяц. Я вам скажцу, што чалавек з вышэйшай адукацыяй, ступеняй доктара ў Амэрыцы атрымлівае пяць тысяч даляраў у месяц – гэта высокая зарплата. Ганчар едзе ў гэты час працаваць у Латвію, быццам бы ў нейкай фірме, дзе ў яго зарплата была 20 тысяч даляраў у месяц. Такіх зарплат не бывае. Але гэта адпаведная, так сказаць, форма, за якую даюцца адпаведныя грошы на адпаведную работу. Я ўжо не кажу, што ў апошні час я атрымаў дакладныя агентурныя зьвесткі з гэтай жа арганізацыі, так сказаць, КГБ, што Ганчар у Латвіі быў завербован ФСБ. Яны прыехалі да мяне ў Варшаву...

– Ну вы ўжо ведалі?...

– Да.

БЕЗ МЯНЕ НЕМАГЧЫМА

Прыехалі ў Варшаву Чыгір, Ганчар...

Калі б мы правялі гэтыя выбары, калі б, скажам, разьведка не спрацавала, то мы мелі б рэальнага прэзыдэнта. Мы б у гэтым годзе Лукашэнку выгналі. Але яны гэта ўсё палажылі на нуль. Іхная задача была выкарыстаць Народны Фронт, бо няма іншай арганізацыі, самі б яны не арганізавалі. Чаму яны да мяне прыехалі? Таму што трэба, каб я пайшоў, і трэба каб Фронт падключыць, безь мяне немагчыма. Яны адкрыта пра гэта сказалі.

Далей. Яны на Фронце выяжджаюць. Паколькі кіраўнік ЦВК Ганчар, у любой сытуацыі яны робяць прэзыдэнтам Чыгіра. Як толькі Чыгір робіцца прэзыдэнтам, яму ствараюць інфармацыйнае поле адпаведнае, міжнароднае і пад яго пачынаюць падцягваць усю гэту маргінальную крыклівую масу, усіх гэтых там Шушкевічаў, Шарэцкіх ды ўсю гэтую дзіўную публіку, за якімі нічога не стаіць. І аб'яўляецца што вот утварылася апазыцыя, вот ужо ёсьць прэзыдэнт.

Для Лукашэнкі гэта чыгунная баба, якую вешаюць у яго над галавой, і кажуць: ты вот хочаш інцегріравацца, дык вот ты давай сначала пусьці нашыя банкі туда (а ён жа не пускае!) рускія, ты дай нам нафтавы комплекс, ты заплаці нам за газ і гэтак далей. А не будзеш – так мы Чыгіра зробім прэзыдэнтам. А Лукашэнка хоча быць прэзыдэнтам Расеі. Яны яму прапануюць губэрнатара. Ня хочаш – так мы Чыгіра зробім прэзыдэнтам. Яны вешаюць на яго Чыгіра як альтэрнатыву, і гэта рэальна. Чыгір ужо як бы ёсьць прэзыдэнт. Калі б Лукашэнка пайшоў на канфлікт з Масквой, яны б яго маглі элемэнтарна прыбраць. Лукашэнка гэта разумеў, барацьба была вельмі складаная. І вот калі яны прыехалі, яны прапанавалі, каб я ўдзельнічаў у выбарах, таму што трэба падцягнуць наш электарат, трэба зьняць Лукашэнку, Чыгір расколе вэртыкаль, мы паднімем усё грамадзтва. Канешне ж вы, Зянон Станіслававіч, ня можаце ў этай сытуацыі выйграць, но для обшчэга дзела і так далей...

– Вам сказалі, што вы ня можаце?..

– Ну а як жа, хо! Як быццам бы я ня знаю, што іменна я і выграў бы ў этай сытуацыі.

МАСКВА ЎСЕ ГРОШЫ АБРЭЖА

Некатарыя рэчы, якія я вам расказваю, ніхто ня ведае, акрамя маіх бліжэйшых памочнікаў і намесьнікаў.

Значыць, я да іх прыезду падрыхтаваў мэмарандум «Аб дзяржаўнай пазыцыі» і прапанаваў Чыгіру падпісаць. Там сказана, што мы абодва выступаем на выбары, абодва працуем на адну справу і прытрымліваемся такіх дзяржаўных пазыцый: беларуская мова дзяржаўная, незалежная Беларусь і поўнае адкіданьне палітыкі інтэграцыі з Расеяй, ніякіх саюзаў, ніякіх узаемаадносін з Расеяй не павінна быць, толькі на аснове міжнароднага права і сваіх нацыянальных інтарэсаў, дагаварныя, так сказаць. Так як Літва, так як Эстонія. Чыгір, як чалавек не палітычны, а даволі прасты, адразу сказаў: ну, калі я гэта падпішу, то мне Масква ўсе грошы абрэжа. І пасьля гэтага я яму задаю пытаньне: а хто вас фінансіруе. Ну, есьць із Масквы саатветствуюшчые кругі, фірмы. Ганчар кажа: із Канады бізнесмэны... А Чыгір, будучы прэм'ерміністрам, даў крэдыт 30 мільёнаў даляраў канадзкім фірмам. І за гэта яго Лукашэнка цяпер цягае. Ён даў крэдыт (усё па закону было зроблена) і пайшоў у адстаўку. Ён пайшоў у адстаўку, а крэдыт не вярнулі. Юрыдычна ён ні пры чым, але пракурор можа пачаць сьледзтва, таму што крэдыт не вярнулі, па факту.

Так вот якая сытуацыя. Мы ня можам, бо нам грошы абрэжуць. Мне ўсё ясна. Хаця я ўжо ведаў. Я ведаў, што грошы ідуць ад ВПК і зьвязаных зь ім фірмаў і ад Беразоўскага. Агульная сума 6 млн. даляраў. Гэта каласальная сума. Ельцын страціў на свае выбары 2 мільёны, здаецца. Далей. Гэту справу курыравала ФСБ і ў канцы ланцужка стаяў Прымакоў. І вот этыя хлопцы прыяжджаюць да мяне з этымі сьветлымі вочкамі размаўляць аб агульных дзеяньнях. А я знаю іх. Я ўжо не кажу, што Ганчара я знаю як аблупленага, я з ім у парламенце сядзеў пяць з паловай гадоў – ён і я, праз аднаго. Я знаю дакладна, чым ён дыша, на што ён здольны.

Цяпер другое. Яны прапанавалі – Фронту трэба ісьці на выбары. Што нам рабіць? Нельга ісьці на выбары, таму што нас аблапошаць у любой сытуацыі, і што б мы ні рабілі, – іхныя ключавыя пазыцыі і яны робяць прэзыдэнтам Чыгіра. На нашай сьпіне, бо мы ж будзем працаваць. Фронт будзе пахаць, а прэзыдэнтам зробяць Чыгіра... Што нам рабіць? Гэта ня проста так, гэта вырашаецца лёс Беларусі і Фронта, і мой асабісты. І трэба прымаць рашэньне.

Першы варыянт – не ідзём на выбары. Што адбываецца? Мы Канстытуцыю 94 года прызнаём, мы ўвесь час казалі, што павінны быць прэзыдэнцкія выбары, што канчаецца яго (Лукашэнкі) тэрмін, а тут паяўляецца Чыгір, і мы кажам – мы не ідзём на выбары. Чым мы растлумачым народу? Што Ганчар – ФСБ, што Чыгіра Масква падтрымлівае? Яны скажуць – чэпуха, вы с ума сашлі! Мы сябе асьмяём, мы нічога не дакажам. Нават калі б дакументы былі – гэта ня доказ. Гэта каму, электарату дакажаш?..

Гэта так гуляў Кебіч, які асноўны свой факт прыпас на самы пасьледак. Калі Лукашэнка абакраў сьцюардэсу. Мы ўсе ведалі ў парламенце, што так было. Таму што ў яго параноя, праяўленьне фізычнай хваробы, ён сапраўды абакраў гэтую сьцюардэсу. І Кебіч прыпас гэты факт на апошнія дні. Думаў, што зваліць Лукашэнку. І ён гэты факт выдаў. А ўсе пашлі за Лукашэнку, бо ніхто не паверыў. Ёсьць правілы, якія дзейнічаюць у псыхалёгіі.

Так вот, калі б мы не пайшлі на выбары, мы нічым бы гэтага не растлумачылі. У нас не было аргумэнтаў, а супраць нас аргумэнтаў было дастаткова: Фронт струсіў, іспугаліся Чыгіра, ані не хацят удзельнічаць, ані прэдацелі... І пайшла вална такая (у нас жа няма сваіх сродкаў масавай інфармацыі). І вось пад гэту хвалю яны пачынаюць выбары. Чыгір і гэтак далей. І ім вялікія сродкі. Яны ідуць у фронтаўскія структуры, нас не пытаюць. Ідуць у Смаргонь і кажуць – рэбята, памажыце, нам трэба сваліць этава Лукашэнку, мы гатовы, нам памагаюць таварышчы із Масквы, долар за подпісь даём. Частка Фронту сказала б што Пазьняк здурэў, бо трэба ісьці Лукашэнку заваліць, а частка... Раскалолі б Фронт, перакупілі б і зьнішчылі. І гэта сур'ёзнае дзела. Значыць, на выбары трэба ісьці. Я павінен быў ісьці на выбары і я цудоўна ведаў, што нас растопчуць, толькі потым. Мяне зьнішчаць, толькі потым.

ПРАВЕСЬЦІ РЭАЛЬНЫЯ ВЫБАРЫ БЫЛО НЕМАГЧЫМА

Я што прапанаваў тады? Добра, мы ідзём на выбары, але адна ўмова – строга прытрымліваемся заканадаўства. Я канешне знаў, што яны парушаць закон, але трэба было, каб яны далі такую гарантыю, бо калі строга прытрымлівацца закона, дык немагчыма зрабіць фальсіфікацыю. Я знаў, што яны будуць толькі на фальсіфікацыю разьлічваць. Правесьці рэальныя выбары было немагчыма.

Спачатку ўсё ішло нармальна, пасьля пачаліся фальсіфікаты. Першы фальсіфікат быў па зборы подпісаў. Мы правялі вялікую работу, мы занялі фактычна ўсе камісіі, кіраўнікі нашы былі, мы стварылі кантроль за зборам подпісаў – ня толькі сваім, але і як зьбіралі ў Чыгіра, мы гэта ўсё падлічылі. Чыгір сабраў 90 тысяч, а я 114. На першым жа этапе мы правалілі Чыгіра. Усё! І ставілася задача – пракантраліраваць, паглядзець, што робіць Ганчар.

Па закону трэба 10 дзён праверкі і тады зьбіраецца камісія і аб'яўляе вынікі, колькі хто сабраў. А ён на наступны ж дзень выступіў і сказаў: група Пазьняка сабрала 137 тысяч, Чыгіра 120 тысяч. Дабавіў мне, дабавіў яму. На працягу гэтых дзесяці дзён я пісьмы пісаў, ставілі пытаньні зрабіць праверку, кантроль. Ганчар уцякаў, тыя хто там быў, разьбегліся, нікога не злавіць. І так і не ўдалося прымусіць іх зрабіць кантроль. Ігнаравалі проста напрач, бо яны праігралі з першага раўнда. Не ўдалося ім подпісы сабраць, хоць яны плацілі, а мы... Фронт задарма ўсё робіць. І потым пайшла ўжо цэлая чарга.

Па-першае, Ганчар аб'явіў, што будуць 10 дзён галасаваць. 10 дзён галасаваў Лукашэнка ў 96-м годзе і гэта было парушэньне закону, фальсіфікацыя была даказана, міжнародная супольнасьць не прызнала Лукашэнкі, яго канстытуцыю, яго рэфэрэндум. Тое ж самае пачынае рабіць Ганчар. Ужо ясна, што робіцца фальсыфікат, на аснове якога вынікаў выбараў ніхто не прызнае.

Далей. Бяром алавік і робім разьлікі. Усіх членаў камісій было 1600 зь нечым чалавек, падзяліць на два, бо па два трэба было хадзіць – гэта 800. І калі памножыць на чалавекадні, то гэта трэба год хадзіць, каб сабраць пару мільёнаў галасоў. Нідзе на сьвеце выбары не адбываюцца 10 дзён з хаджэньнем па хатах, таму што гэта немагчыма тэхнічна зрабіць. Гэта можа ў Эстоніі можна было зрабіць за месяц, калі пусьціць некалькі тысяч хаджэньне, а ў нас гэта немагчыма, у нас 7,5 млн выбаршчыкаў...

БЕЛАРУСКІ АРМАГЕДОН

СЬВЕДЧАНЬНІ ПАЦЯРПЕЛЫХ

Таццяна Сьнітко

У гутарках пра трагедыю на Нямізе 30 траўня, у ацэнках і высновах вылучаецца адзін настойлівы матыў — Няміга жорстка нагадала людзям пра патрэбу жыць у гістарычным часе. Ня толькі днём сёньняшнім, ня толькі ў рамках праўленьня Аляксандра Лукашэнкі або ўласнай кар'еры, або нават уласнага жыцьця, а з адчуваньнем папярэдніх і наступных часоў і пакаленьняў, з прысутнасьцю вечнага. Інакш незразумелыя і таму ня надта патрэбныя такія паняцьці як чалавечая прыстойнасьць, вера, свая краіна і яе незалежнасьць. Інакш магчымыя самыя неверагодныя маніпуляцыі з падставовымі і неаспрэчнымі ісьцінамі. Інакш пачынаецца хлусьня.

Чалавек абураецца — як можна пражыць на такі закробак! І тут жа «адумваецца» — заробак малы, затое рэгулярны. Наш чалавек часьцяком адвучаны думаць і жыць у гістарычным часе. Ён ня ставіць пытаньне: што я на гэткі заробак здолею пакінуць сваім дзецям і ўнукам? А калі б ставіў, дык патрабаваў бы ад уладаў ужо не вышэйшага заробку, а эканамічнай свабоды. Бо нашчадкам трэба пакінуць шмат, каб адтрымаўся дом і працяг роду. Няміга напомніла нам пра нашых дзяцей і ўнукаў.

Няміга напомніла нам пра нашых бацькоў і дзядоў, пра Беларусь. Ня тую, з 1917 году, а тую, тысячагадовую, у «Слове пра паход Ігаравы». Гістарычнае прадоньне страшыць, калі ня маеш у сэрцы любові да ўласнага краю. А каб любіць — трэба ведаць. А калі зьведваеш, тады разумееш, што твая Беларусь — нармальная эўрапейская краіна, а не прыдатак да Расеі. Няміга трагічна нагадала пра тое, што сваё трэба любіць.

Пасьля Нямігі беларусы мусяць лепей распазнаваць хлусьню і меней верыць у інтанацыйную шчырасьць словаў. Інакш канца Нямізе ня будзе.

Яны кажуць: нельга было прадугледзець... нельга было прадухіліць... Яны цяпер кажуць: вінаваты дождж. Спрачаюцца, колькі хто чаго піў, так, нібыта ад гэтага вартасьць чалавечага жыцьця зьмяняецца. Прыносячы спачуваньні, думаюць ня столькі пра бязьвінных людзей, колькі пра свае ўласныя іміджы, кар'еры, пасады, бясьпеку.

А мы... Прыйшло пачуцьцё віны. Адчуваньне, што ты (а калі ня ты, дык хто?) мог нешта зьмяніць...

Вы бачылі той пераход на Нямізе. Вы ведаеце, колькі разоў на сьценах Нямігі паўтараюцца словы: «Прабачце, што нас не было побач».

Той, хто зьбіраўся на ***тое*** месца менавіта ў ***той*** час, але цалкам выпадкова збочыў, не дайшоў, адышоў патэлефанаваць і г.д., зразумее. Але гэта толькі адзін бок мэдалю. Калі хто з вас трапляў выпадкова ў разборку крымінальнікаў, гуляў полем, якое аказвалася мінным, адыходзіў убок за хвіліну да страшэннага пабоішча, выходзіў з машыны за пяць хвілінаў да аўтакатастрофы – той зразумее гэты цяжар да канца.

Я зьбіралася туды двойчы за вечар. Добра памятаю, як не магла ні на чым засяродзіцца: сьвядомасьць настолькі не ўспрымала часопісаў, тэлеперадачаў, музыкі, размоваў...

Кніжка, якую я чытала 30 траўня, так і ляжыць на тым самым месцы ў тым самым стане. Старонку нумар 99 няма сілаў закрыць альбо перавярнуць на сотую. Бо ранкам наступнага дня, даведаўшыся пра Нямігу, я глянула: што чытала, з чаго цяпер ня памятаю ні слова?

«Мёртвым не баліць» Быкава.

Хаджу цяпер, гутару з людзьмі. Некаторыя баяцца гаварыць. Некаторыя хацелі б, але мала памятаюць падзеі, бо ледзьве апрытомнелі. А тыя ўжо не загавораць ніколі.

Падае дождж, падаюць людзі...

Шмат каго з іх ужо проста ня будзе...

У пераходзе потым зьявіцца безьліч такіх вершаў. Сьцены ведаюць шмат, нездарма штоночы нехта размазвае на сьценцы нечыя імёны, нечыя надпісы. Гэта не зьдзіўляе. Зьдзіўляе, што частка людзей раней проста не разумела: па сьценцы размазваюць нас усіх і ўжо ня першы год.

Сяргей, 15 гадоў:

«Я ня памятаю... Мяне задушылі ўсярэдзіне ўсяго гэтага. Я страціў прытомнасьць. Спачатку мы стаялі каля сцэны. Сабралася хмара. Ніхто не зьвяртаў увагі, каб усе пачалі разыходзіцца – мы б таксама разышліся. Стаялі, проста сяброў чакалі. Пачаўся дождж. Куды бегчы? Бліжэй за ўсё быў гэты пераход. Падбеглі пад пераход – не, ня пойдзем, там натоўп. Але нас ужо занесла туды натоўпам. Першыя прыступкі мы прайшлі нармальна, проста трохі штурхаліся, як у звычайным натоўпе. На пляцформе паміж першым і другім шэрагам прыступак нейкі мужчына расставіў рукі і сказаў: «Тут дзіця ляжыць!» Але ззаду яго ніхто ня чуў. І вось я бачыў, як мужчына наступіў на дзіця: я аб гэтае дзіця спатыкнуўся й вывіхнуў нагу. Я яго нават ня бачыў, гэтае дзіця, толькі чуў, як мужчына сказаў... Потым я ўбачыў, што ў канцы другога шэрагу прыступак пачынаюць спатыкацца й проста класьціся пластамі. І ўвесь натоўп пачаў спатыкацца і класьціся пластамі. Мне прыціснула правую руку і грудзі, уздыхнуць не магу. Я кагосьці ўдарыў ззаду, каб уздыхнуць, і вось я і чалавек, які быў перада мною, уздыхнулі. Другі раз мне прыціснула абедзьве рукі. Я глянуў наперад, там быў такі душаразьдзіральны лямант, усе спрабавалі неяк вырвацца на двор. А ззаду, я нават ня ведаю, хто яны, моладзь, проста з жыцьцярадасным крыкам перлася наперад. Пабраўшыся за рукі.

Я страціў прытомнасьць. Ня памятаю, як мяне выцягнулі. Далей я памятаю, як сон, што апынуўся ў нейкай цёмнай, змрочнай палаце ў другой бальніцы. Там было шмат народу, хто плакаў, хто кагосьці адкачваў... Мы былі зь сябрам, ён ішоў на тры прыступкі сьпераду мяне. Я хадзіў сярод людзей, глядзеў ім у твары і шукаў яго. Потым зноў нічога ня памятаю. Апрытомнеў, абапершыся на сьценку, на падлозе. У калідоры пару чалавек ляжыць. Падыходзіць нейкая жанчына: «Дадому дойдзеш?» – «Дайду». Я ўстаю. Мяне пахіснула. Яна: «Выхад там». Я ўстаў і пайшоў. Я жыву на Заслаўскай, там побач.

Памятаю, што ўпаў у лужыну ў Траецкім прадмесьці, там, дзе спуск ад бальніцы да «востраву сьлёз». Памятаю, як стаяў на прыпынку, абапершыся, на мяне ўсе глядзелі. Тралейбус пад'ехаў, я рукой хапаўся, мяне нехта ззаду занёс, паставіў у гэты тралейбус, спытаў, дакуль я еду... Ня памятаю, як я ехаў – памятаю, што на маім прыпынку мяне таксама вынесьлі з тралейбуса й паставілі. Я сустрэў сябра, які ня быў на Нямізе. Ён потым распавядаў, што думаў, быццам я накалоўся, ужыў наркотыкі. Потым памятаю свой пад'езд: я літаральна паўзком узьбіраўся на прыступкі. Клямку навобмацак шукаў, бо... Ну вось як касавокасьць: бачыш, а ўхапіцца ня можаш! У ліфце я намацаў кнопку паверху. Сумясьціў два шэрагі кнопак і неяк намацаў. Выйшаў зь ліфту. Бацькі потым расказвалі: там быў такі званок, што ажно суседзі павыбягалі. Руку націснуў і стаяў... Гэта было недзе а палове на адзінаццатую ночы.

Бацькі падумалі таксама, што я «накалоўся, напіўся й пабіўся». Пакуль не прыйшоў мой сябра ды не распавёў, што была цісканіна – тады яны паверылі майму расказу. Выклікалі «хуткую», мяне адвезьлі ў бальніцу хуткай дапамогі, зрабілі здымкі. Лекары сказалі: «У нас тут цяжкія, вязіце яго ў інстытут траўматалёгіі», нешта побач там такое. Трэба было везьці на каталцы па калідорах. Бацькі: «А куды везьці? Хоць дарогу скажыце». Лекары сышлі. Гадзіны паўтары я спаў у чаканьні, каб мяне завезьлі. Прыехала «хуткая». У інстытуце зрабілі здымкі, сказалі везьці ў іншую бальніцу: «Усё нармальна». У прыймовым пакоі дзявятай бальніцы было многа міліцыі. Як быццам нічога ня ведалі, сядзелі й распытвалі. Што там было, як там было...

... Я ўвогуле ня бачыў каля пераходу нікога зь міліцыянтаў. Міліцыянтаў я бачыў толькі каля сцэны. Я ня бачыў, каб было марадзёрства, але сам я прыйшоў дадому бяз кепкі, байка была разарваная, капюшон на плячы, адарваны кавалак джынсаў і ў кедзе не было падэшвы.

Мае сябры ўцалелі. У сябра, які прыйшоў са мной, было нешта з мозгам. Ён два ці тры дні знаходзіўся ў коме ў рэанімацыі. Цяпер прыйшоў у сябе, здаецца, нармальна. Але яму яшчэ там штучнае дыханьне падключана».

Я запыталася ў Сяргея, як выглядалі людзі, якія з крыкамі беглі, напіраючы ззаду. Менавіта гэтую групу людзей адзначалі амаль усе пацярпелыя. «Гэтыя людзі былі лысыя і апранутыя ў чорную скуру. Яны ўзяўшыся пад рукі, ішлі напралом з крыкам, сьвістам. Калі я першы раз азірнуўся паглядзець, хто мяне здушыў, я ўбачыў іх, а не таго, хто мяне душыць. Ім было па 18-20 гадоў. І, было бачна, п'яныя. Гэта яўна было бачна».

«Мне казалі, што там стралялі. У паветра, – распавядае яшчэ адзін удзельнік падзеяў, таксама Сяргей. – Ці гэта былі пэтарды? Я ня ведаю, мне распавядалі, што міліцыянты стралялі ў паветра, каб спыніць. Каб людзі ня ціснулі, а проста спыніліся і ўздыхнулі. Страляў нехта з натоўпу. Здаецца, я й сам чуў адзін стрэл – перад удушшам. Я быў у самым пачатку... А сярэдзіну ўсю насьмерць задушылі.

Мы беглі разам зь сябрам Сашам. Яго ўчора выпісалі са шпіталю. Ён бег на колькі прыступак раней. Яму проста пашанцавала – шокам абышоўся. Я яго згубіў проста зь віду, і перада мной апынулася дзяўчына. Меншая за мяне ростам на пару сантымэтраў, валасы чорныя і ў джуце яна была. У мяне неяк так атрымалася, што левая рука схапілася за жывот яе. Правая была свабодная, наверсе. Я ня мог уздыхнуць, і яна не магла ўздыхнуць. Яна крычала. І за мной мужык стаяў, я лакцём яго раз! – ударыў. Ён неяк паварухнуўся. Я адчуў, што дзяўчына ўздыхнула. І я ўздыхнуў адразу за ёй. Зноў пачалі душыць. Я зноў ударыў лакцём па мужчыну, трапіў у твар. Ён адрэагаваў рухам. І зноў: і яна ўздыхнула, і я. Я пачуў крык: «Натоўп!...», і ўсё, потым пачалося ўдушша. Бачыў (калі не памыляюся, бо ўжо задыхаўся), там былі ў мэтро трое дзьвярэй адчынены. І здаецца, адны дзьверы пад ціскам чалавек вынес. Ня бачыў, мужчына то быў ці жанчына. Ці мне гэтак здалося, ці што... Але адтуль, з мэтро, даставалі людзей. Там былі рукі мужчынаў, жанчынаў; трэція дзьверы былі адчынены, і яны іх даставалі адтуль, з гэтага натоўпу.

Мне казалі – я ня бачыў – што калі ўжо трупы ляжалі, дык тады толькі марадзёрствам займаліся. Пярсьцёнкі залатыя здымалі... Гэта мне маці распавядала. Хто памёр, хто не памёр – здымалі залатыя пярсьцёнкі, ланцужкі, з вушэй усё. Усё, што ёсьць каштоўнага. Гэтыя людзі – марадзёры. Вось дзяўчына, якая толькі што заходзіла сюды – яна кажа: у яе завушніцы прапалі. У хлопца прапалі два напульсьнікі. (Сусед па палаце дадае: «... запальнічка, паўкалоды картаў і пачак цыгарэтаў»). У мяне былі пярсьцёнак і ланцужок, але іх, цьху-цьху, не зьнялі.

Кажуць, на канцэрце было шмат п'яных. Не, такіх, каб сабой не валодалі, я асабіста ня бачыў. А нападпітку, вельмі вясёлых – дык такімі былі амаль усе, за выняткам, можа, зусім дзяўчатак».

Маша, 16 гадоў:

«Так, сапраўды, быў дождж, але не з-за дажджу гэтая трагедыя пачалася. Усе нармальныя людзі. Цывілізавана спусьціліся б у мэтро і як спусьціліся, так бы прайшлі ды выйшлі. Але грамадзтва не бязь іншых людзей...

Першая частка натоўпу прайшла, я якраз была ўсярэдзіне. Першую лесьвіцу мы прайшлі, там такая пляцовачка; з другой лесьвіцы ўсё пачалося. Я згубіла шлёпанец, але шукаць яго ня стала, бо гэта было немагчыма. Натоўп звужаўся, дыхаць не было чым. Але было ня страшна, як у любым аўтобусе... Я азірнулася выпадкова назад (я б ня ведала, што адбылося), а там на лесьвіцы... Ня ведаю, як іх назваць: сатаністы ці як іх там? Прадстаўнікі адной зь нейкіх тусовак? Яны пачалі крычаць, што «Давай, талкай, даві, бей!» Мы спускаліся з прыступак – яны пачалі ўсіх штурхаць, пачалі ўсе падаць. Гэта было так! Ніхто, ніякі ня дождж!.. Алкаголікаў там хапала, дыхаць не было чым, смурод, перагар! Ня ведаю... Не «кефірная» доза была. Піва там прадавалі, але, ведаеце, можна й півам напіцца.

Ну, хто пра гэта скажа? Проста атрымалася так, што пачалі штурхаць, скакаць жартам наверх, на людзей. Гэта я бачыла на свае вочы. Я толькі пасьпела азірнуцца, як паляцела ўніз.

Колькі хвілін гэта працягвалася? Колькі ляжалі? Не, ня дзесяць, не пятнаццаць, не дваццаць, а трыццаць і болей. Я думаю, за дзесяць хвілінаў людзі б не папаміралі... Ляжыш, паніка напачатку, усе крычаць. Пад канец ужо не было чаго рабіць, крычаць ужо не было сілаў. Ляжыш і глядзіш, як паміраюць, як чыясьці рука там з-пад нізу вылезла...

Я ў бальніцу паступіла праз пару дзён, глядзела ўсе навіны. Усе. Ніводнай праўдападобнай вэрсіі не было. Дождж няма чаго вінаваціць. Людзі не настолькі дурныя... Я думаю, у мэтро беглі ня дзеля таго, каб схавацца (я чыста так думаю), а для таго, каб ісьці дадому, на прыпынкі. Бо натоўп ня стаў у мэтро, ён далей пайшоў. Але самае цікавае, што зачынілі мэтро. Першая частка натоўпу прыпынілася там, а зьверху ляцяць. Бачаць ці ня бачаць, што робіцца – ня ведаю, бо я ўжо ляжала. Людзі ляцелі на нас. Ногі спляліся, выцягнуць іх было немагчыма.

Мяне вынесьлі адну з самых апошніх. Вынесьлі, а ўсе людзі плачуць. Я разумею, што гэта жорстка, але яны ніколі не адчуюць таго, што мы там, лежучы. І стоячы адной нагой недзе там, а недзе тут... Мне пашанцавала, што я засталася жывою. Выпадак... Мы былі ўтрох з сяброўкамі. Адна загінула...

Другая сяброўка не пацярпела, але... Яна проста ўдала ўпала. Яна паднялася хуценька ды стала да сьцяны. Я ўжо не змагла падняцца, калі мяне цягнулі першы раз – не выцягнулі. Ці балюча было, калі цягнулі? (Сьмяецца з горыччу) Канечне, балюча, але там было – абы выцягнулі, разумееце? Мяне выцягнуў той хлопец, вялікі яму дзякуй. Я ня ведаю, як яго знайсьці. Запомніла, што ён быў сьветлы... Разумееце, там не было сьвятла, яно потым засьвяцілася. Спачатку нічога ўвогуле было не відаць. Глядзіш – на табе людзі, яны да столі дастаюць рукамі. Ня два пласты там былі, а чатыры, пяць, ня ведаю. Усярэдзіне.

Сустрэчнага патоку людзей ад царквы я ня бачыла. Ніводнага чалавека не сустрэла. Таму што яны, вядома, пабаяліся ісьці, калі ў мэтро ўваходзіў такі натоўп. Вельмі страшна было. ... Я калі павярнулася і ўбачыла гэтых «брытагаловых»... Іхныя галовы толькі бачныя былі, яны поўнасьцю п'яныя – я не пасьпела нават іх разгледзець. Але я зразумела, што нам – канец. Яны штурхаліся. А разумныя людзі, якім трэ было схавацца ад дажджу, станавіліся пад навесы крамаў, пад дрэвы. Я асабіста ішла, каб дадому даехаць. Мне трэ было перайсьці пераход.

Возьмем маю сяброўку. Добрая, нявінная. Ну вось за што было ёй гінуць? За нейкай сволачы, якая напілася? Незразумела гэта. Гэта трэ было адчуць...

Шчыра вам скажу, я раней ня ведала, дзе жыву. Што я магу пайсьці ў мэтро і мяне там могуць забіць, проста затаптаць. Пра такое я нават не здагадвалася. Цяпер я ня ведаю, як буду хадзіць мэтром. Ня ведаю, як буду спускацца ў пераходы. Думаеш: хоць бы мне з пад'езду выйсьці, ці мала дэбілаў. Але, калі зразумееш, што такое сьмерць, дык... ужо нібы ня так страшна... І ўсё роўна. Маглі, мне здаецца, на канцэрце задавіць фанаты, можна патрапіць пад аўтобус, пераходзячы дарогу. Гэта зразумела. Але ў пераходзе... Гэта дзіка!

Маю сяброўку даставілі ў 2-ю бальніцу жывую. Яе выкацілі бацькам з рэанімацыі і напісалі, што яна памерла ад удушша. Труп не павезьлі б у рэанімацыю. Ясна, яе спрабавалі ўратаваць. Але ад удушша – гэта калі задыхаесься на месцы, і ўжо труп. А яна ж была шчэ жывая... Калі мы там ляжалі, мёртвых людзей было можна адрозьніць. Спачатку многія крычалі, потым частка людзей ужо ляжала бяз крыкаў і стогнаў. Кажуць, сто зь лішкам у шпіталях, 52 загінулі. Кажуць, тысяча чалавек набілася ў той пераход, іншыя – што пяцьсот. Нехай пяцьсот. А дзе астатнія?

Разумееце, пасьля таго, што я бачыла, проста так устаць і сысьці адтуль... Гэта – дзесяць чалавек, хто ляжаў наверсе. І то расьцяжэньне нагі якой або рукі. Але ляжалі з хрыбтом паламаным, з рукамі-нагамі пераламанымі, з горлам, да крыві праткнутым абцасамі... Гэта немагчыма!...»

Шмат хто з пацярпелых на Нямізе кажа, што трупаў можа быць і больш, што ўлады кагосьці «пакрылі», што астатніх маглі недзе таемна пахаваць. Пакуль што такія зьвесткі ня маюць рэальнага пацьверджаньня.

Міліцыянты

Тых супрацоўнікаў міліцыі, якія апынуліся ў эпіцэнтры трагедыі, можна «вылічыць» у любым натоўпе.

Больш за тое, менавіта на шараговых людзей у міліцэйскай форме пасьля трагедыі і паў народны гнеў. Калі пахавалі іхных калегаў Генадзя Рабаконя і Ўладзімера Говена (абодва прыйшлі адпачываць!), лекара шпіталю МУС Алу Мельнікаву (разам з мужам і сябрамі яна прыйшла адзначыць гадавіну свайго вясельля!) – амонаўцы былі ў стане, ніколі мной дагэтуль ня бачаным. Пра нешта запытаўшы тых, хто стаяў у ачапленьні ля пераходу, я заўважыла, што людзі не разумеюць сэнсу словаў. Што яны недзе далёка-далёка. І каб схаваць гэты стан, прыкрыкнулі: «Адзін крок назад!» Ад бездапаможнасьці.

АМОН перад людзьмі станавіўся на калені й прасіў прабачэньня, што не ўбярог. Міліцыянты з мэтро казалі, што не маглі бачыць падзеяў наверсе, напачатку яны толькі выканалі загад зачыніць дзьверы з-за шматлікіх нецьвярозых людзей, што запоўнілі пляцформу. А потым было ўжо позна. Потым засталося толькі выцягваць людзей, рукі, ногі, целы якіх цесна пераплялі ся ў вузел.

Што кажуць у міліцэйскіх колах? Кажуць праўду.

У мэтро ў той вечар было сем міліцыянтаў. Амонаўцаў наверсе – не 195 і нават не 150, а толькі чалавек 25–30. Прычым частка амону пасьпела пад час сьвята прыкласьціся да бутэлек зусім не з кока-колаю. Камандзір амону, падпалкоўнік, імя якога не афішуюць, але якога многія й так добра ведаюць, быў проста п'яны.

Цяпер некаторых міліцыянтаў прымушаюць складаць і падпісваць сфабрыкаваныя паперы, у якіх сьцьвярджаецца, нібыта колькасьць міліцыі на канцэрце ды ў мэтро была нашмат (прыкладна ўдвая) большай. За адмову браць удзел у гэтах фабрыкацыях афіцэрам пагражаюць звальненьнем...

Пасьля размоваў зь міліцыяй у мяне склалася ўражаньне, што «вінаватых» у трагедыі, акрамя дажджу, улады могуць адшукаць сярод простых выканаўцаў загадаў. Хоць у той сытуацыі менавіта яны нічога не вырашалі, а ў нечым і не маглі вырашаць ні пры якім раскладзе.

«У аднаго Ярмошына загаварыла сумленьне, але ж пад час сьвята ён мала што мог зьмяніць, – лічаць міліцыянты. – «Аліварыя» – пад апекай Ціцянкова; забараніць самому Ціцянкову прадаваць і раздаваць піва мэр гораду ня мог». Дадам, што асаблівы клопат прэзыдэнцкай адміністрацыі датычыць і транснацыянальнай карпарацыі, якая заклікала нас «пачаць лета з «Магны». І радыё «Мір», ужо напэўна не забытае спадаром Пашкевічам. Лета не пачалося, і ніхто ня ведае, для колькіх людзей насамрэч.

СПАЧУВАНЬНЕ

Зь вялікім болем даведаліся ўсе мы аб няшчасьці на сьвяткаваньні ўгодкаў радыястанцыі «Мір» у Менску. Страта 52-х маладых жыцьцяў — гэта трагедыя для ўсяго нашага народу. Да таго ж яна поўнасьцю бессэнсоўная.

Ад імя сяброў Рады Беларускай Народнай Рэспублікі выказваю спачуваньні сем'ям і прыяцелям тых, хто загінуў. Хай Бог Вам памагае перажыць гэтае няшчасьце. Думкамі мы з Вамі.

Івонка Сурвіла

Старшыня Рады БНР.
1-га чэрвеня 1999 г.

КАТАСТРОФА ПАМЯЦІ

Павал СЕВЯРЫНЕЦ

Наплачацеся яшчэ з гэтай станцыяй мэтро.

Зянон Пазьняк, 1988 г.

... Ён топча чавільню віна лютасьці й гневу Бога Ўсеўладнага.

Апакаліпсыс XIX:15.

Упершыню мне стала страшна на станцыі мэтро Няміга, калі я ўбачыў гэты чорны карабель. Ён вісіць там, пад скляпеньнямі, як таран, як гіганцкая труна, на тарцы якой ледзь разьбярэш сьціснутыя радкі са «Слова пра паход Ігаравы». Ён змрочны, настолькі, што асьветленая сотнямі лямпаў станцыя здаецца цёмнаю, і інстынктыўнага мігу спадылба хапае, каб міжволі прыгнуць галаву: дамоклаў рок гатовы сарвацца й рухнуць між калёнаў, на пляцформу, запоўненую людзьмі.

І вось немая Няміга, толькі патрэскваюць сьвечкі, быццам шум лісьця, ледзь чутны чалавечы шэпт; надпісы на сьценах у падземным пераходзе памяці тых, хто загінуў 30 траўня: «Дашанька, мілая, мы ніколі цябе не забудзем!» У сьпісах няма ніякае Дашанькі. З замiраньнем сэрца прабіраючыся між званых на прыступках, тварамі ў калені, скронямі да плітаў, нерухомых, як трупы, сяброў, сябровак і сваякоў, між стоўпленых гледачоў і ціхіх чэкістаў, я занатоўваю з перапэцканых болем сьценаў імёны й прозьвішчы невядомых краіне ахвяраў, успамінаю такіх жа падлеткаў, якіх перабачыў у менскіх школах, згадваю Пазьняка ў Курапатах, які выкопвае чарапы, згадваю чорны карабель; пераступаю па люках — і раптам з глухім глыбінным водгукам уздрыгваю ад думкі: а можа мне дадзена ведаць больш, чым усім астатнім.

Мэтро Няміга

Катастрофа пачалася тады, калі разбуралі падземны горад.

Яшчэ Панамарэнка праз пасьляваенныя руіны выбухамі праклаў Праспэкт на Маскву, разьвярнуўшы ўсю сталіцу да ўсходу; потым, у 70-я, Паркавая магістраль, цяпер Машэрава, адгроханая да візыту прэзыдэнта Ніксана, адным махам перакрэсьліла забудову гістарычнага цэнтру й пласты старажытнага менскага Замчышча. Катакомбы мэтро правальным рэхам паўтарылі гэты аграмадны крыж, пратараніўшы падзем'і Верхняга гораду, і зьдзейсьнілі самае жахлівае, што толькі можна прыдумаць у Менску — пагружэньне ў Нямігу.

Рэчышча Нямігі, крывавыя берагі, было пахаванае яшчэ даўно ў велізарных бэтонных трубах — на ўзьбярэжжы Сьвіслачы з боку Траецкага й сёньня можна ўбачыць іх жэрлы. Расправа з замчышчам працягвалася, калі, пашыраючы воднае люстра Сьвіслачы, у раку абрынулі цэлую ўскраіну недасьледаванага дзядзінца. У 80-я забой мэтро прайшоў пад Катэдральным саборам; пад час будаўніцтва ў раскоп зь нейкае тайнае галерэі асыпаліся кнігі XVII ст. — іх разграбалі шуфлямі й выгружалі ў хлам. Вайна пад зямлёй разгортавалася; прарваўшыся з глыбіняў, грунтовыя воды падмывалі падваліны храмаў да страшных прасадак і расколінаў, разьядалі бэтон і ржавілі жалезаканструкцыі мэтрабуду; ішло няспыннае падтапленьне тунэляў, і абліцаваныя пад дрэва сьцены Нямігі скрозь пацямнелі, пайшлі ці то сьлёзамі, ці то крывавымі падцёкамі. У каменаломнях станцыі былі разгромленыя падмуркі кляштару баніфратаў, што стаяў на сярэднявечнай рынкавай плошчы, знакамітая Менская брама, ня раз штурмаваная ворагамі, рэшткі драўлянай царквы Ўсьпеньня. Шматвекавыя кладкі цэглы, падарваныя дынамітам, задубелае за паўтысячагодзьдзе бярвеньне й насычаныя чалавечымі касьцямі, золатам і ўнікальным археалягічным начыньнем пласты выграбаліся экскаватарнымі каўшамі з самага болю гораду, вывозіліся й звальваліся на ўскраінных сьметніках.

Гэта тады, пры канцы 80-х, у беларускіх інтэлігентаў, што пікетавалі мэтро, з крывёю рвалі з рук плякаты. Гэта тады ўскрытае замчышча было расьсечанае надвое: у палове корпаліся археолягі з пэндзлямі й скальпэлямі, як хірургі над градыёзным зьнявечаным целам, і баяліся не пасьпець, бо побач, са знадрыўным ровам, скрозь счарнелыя дзірваны й тоўшчы Сярэднявечча, скрозь косьці й тысячакроць наслоеныя сьляды пакаленьняў продкаў бульдозэры й экскаватары раскопвалі катлаван, брацкую магілу для сарака юных дзяўчатак, дванаццаці хлопцаў і двух міліцыянтаў.

Няміга, незьмігутная Няміга, найвышэйшыя беларускія храмы глядзяць не наглядзяцца ў тваю страшную яму. Сьвятадухаў Сабор, праваслаўны прастол краіны, зьвернуты да цябе фасадам, залатымі крыжамі, бляскам вокнаў, усёй сваёй веліччу й магутнасьцю; вежы каталіцкай Катэдры ўздымаюцца па-над Верхнім горадам, каб адтуль, са званіцаў, як на далоні, пільнаваць свой чорны правал; пазірае з-за моста Петрапаўлаўская царква, збудаваная ў 1612 годзе; тоне ў Сьвіслачы выспа сьлёзаў з афганскай капліцай, і пабліскваe ад гатэлю «Беларусь» былая лютэранская кірха, цяпер — царква Марыі Магдалены.

З набліжэньнем да мэтро ад Палацу спорту па хуткай хадзе раптам падае сэрца — у пераломе ходніка ўгадваецца даліна Нямігі, той самы жудасны схіл, зь якога натоўп разьбягаўся ад граду. Для мяне — адхон у падсьвядомасьць: на першым курсе, жывучы ў інтэрнаце-«чацьвёрцы» на Машэрава, я зьбягаў ім штораніцы на заняткі, штодзень падымаўся дамоў. У мяне й дацяпер у нагах на кожнае лесьвіцы спраўна спрацоўвае практыкаваньне, развучанае на тыя сорак прыступак: подбегам у падземны правал, па няцотных пляцоўках, праз раз, і на канцы гранёнай чачоткі ўпячатаць крок у шчыт люку, каб за сьпінай аддалася рэха, асабліва таемнае й глухое.

На канцэрт трыццатага таксама зьбіраліся выпускніцы ды першакурсьнікі. Яны зьяжджаліся з усяго гораду, каб людзей паглядзець, сябе паказаць і, канечне ж, прыняць удзел у кашмарнай ціскатні, у жахлівым і радасным масавым самазабойстве правалу Нямігі. Такія стракаценькія, зухаватыя ды казытлівыя, лепшыя тынэйджары гораду Менску, зь пякучым загарам па самыя станікі й пупкі, пена ўзьбітых вяршкоў на вуснах, яны тлумiліся ля піўных шапікаў ды абапал шоў-сцэнаў, перабіралі ў руках прызавыя кардонкі, падрываліся хорам на рогат, пістонілі матам; яны так хацелі паболей жыцьця; пачуцьця, паболей, да болю, уражаньня — і чакалі, усёй душою чакалі, чаму б, нарэшце, ня здарыцца хоць раз у сто гадоў раптоўнаму, зь верашчаньнем і посьвістам на ўвесь сьвет, разгуляю!..

Неўпрыкмет прапала сонца; дыхнуў халадком, нібы хтось незнаёмы ў патыліцу, вецер, і з глухімі грымотамі праваліліся дымам па-над галовамі нізкія й глыбокія хмары. Ну, усё, зараз пачнецца, казалі многія, азіраючы неба. Праз колькі хвілінаў ад Перамогі да Кальварыі ракатнула, пракацілася пагрознае прадвесьце; дробны дождж, прыстрэльваючыся, расьсеяўся скрозь натоўп. Зьверху было добра відаць, як устрывожаны велізарны мурашнік гульбішча пашыраецца й разбрыдаецца ўсім полем туды, да мэтро.

Навальніца імкліва набліжалася; нарэшце, выбухам грымнула, сьляпуча раскалола неба над залатымі крыжамі, і ў самую гушчу моладзі хваляй рушыла завеса буйнога дажджу. Вада з бляскам залівала прыступкі. У гэты момант хтосьці адкрыў люкі, каб Няміга дыхала й чула.

Прабраўшыся праз тусоўкі прамоклае моладзі ля турнікетаў, пад роў цягніка, што пад'яжджаў з Купалаўскай, два міліцыянты мэтро выйшлі насустрач. Яны не пасьпелі пачуць наапошак пяшчотнага гулкага прабачэньня: «Асьцярожна, дзьверы зачыняюцца». Непрабіўныя шкляныя дзьверы за імі проста захлопнулі й хутчэй зашчыкнулі на мэталёвыя засаўкі.

Правал

З ускраінаў можна было ўбачыць, як бліскавіцы білі ў зямлю, цэлілі ў вышынныя гмахі і, здавалася, паражалі горад у самае сэрца.

Ахоплены панікай, канцэртны народ даўся ў мэтро, і ў гэты момант зь неба па ўсёй плошчы шарахнуў град. Балючым шквалам скрозь лісьце выгнала тых, хто хаваўся пад дрэвамі, і рыкашэтам рассыпала чароды з-пад сьценаў. Людзкі натоўп вынесла на берагі Нямігі; раз за разам хвалі з соцень людзей, уздрыгваючы на грэбні адхону, рынулі ў падзямельную цемрадзь.

Па прыступках каскадам шумела вада; людзі табуніліся на лесьвіцы, пераступалі навобмацак, пасьпяваючы ўбачыць пад нагамі цьмяныя адлюстраваньні, пераламаныя й расплывістыя; скляпеньні запаланіў рокат народу, і на дне, за паднятымі шчытамі люкаў, дзе захлыналіся вадаспады, мільганула колькі спалоханых міліцыянтаў. Нечаканы збой кроку на апошніх прыступках, сьлізкія грані й шчытавое загараджэньне, імгненная п'яная бойка на самым падножжы перасмыкнулі першыя шэрагі адначасова, як падземны ўдар. Адныя ледзь устаялі на нагах, іншыя, дружна спатыкнуўшыся, хапіліся за блізкія локці ды плечы, і вось нехта праваліўся пад нястрымны тупат астатніх. Тыя, хто пасьпеў дабрацца да дзьвярэй мэтро, ламануліся ў шкляную сьцяну. З-за яе, як у акварыюм, на іх з захопленым жахам глядзелі нейкія дзеці.

Аглушальны раскат навальніцы і палаючая бліскавіца грымнулі над самым паўтаратысячным натоўпам, згруджаным ля мэтро; моладзь папрысядала са страху; як біч Божы, з разрадам, з іскрамі паў на зямлю электрычны дрот; у пераходзе пагасла сьвятло, і ва ўсім навакольлі заняло дух цяжкае водгульле званоў, скаланутых на храмах. Прабіў час Нямігі, і лавіна натоўпу з гарлавым ровам абвалілася ў пераход.

Страшэнная ціскаціна доўжылася ўсяго некалькі хвілінаў — тыя самыя некалькі залпаў піва, што спатрэбіліся маладзёну, які застаўся стаяць пад дажджом ля ўваходу з бляшанкай і глядзеў усё, як кіно; столькі, колькі хапіла мужчыну ў пераходзе, каб выпаліць цыгарэту, пакуль перад ім, рукой падаць, паміралі скалечаныя й прыдушаныя, у крыві, падletкі; роўна столькі, за колькі вы прачытаеце гэтыя радкі. Давайце ж усе сюды, усёй грамадой, усёй нацыяй, зазірнем у правал з галавою, давайце наперад, да парапэту, каб ад кадраў масавых сутаргаў стала дыханьне, каб пацямнела ўваччу, каб усім нам зблажэла.

Ура-а!! — ззаду з рогатам убіліся ў натоўп некалькі п'яных падletкаў; маладыя валіліся цэлымі шэрагамі на прыціснутыя ногі, сьпіны й галовы пярэдніх, немы роў, пераломваючы раўналеткам шыі, хрусталёвыя пальчыкі, плечыкі й ключыцы дзяўчатаў, скрозь зубы разьбіваючы нечыя твары і ўдарам калена расьсякаючы чарапы аб гранёную абліцоўку. Шум натоўпу, барабанны ляскат дажджу й граду патануў у агульным зьдзічэлым жаночым крыку, крыку нясьцерпнага болю, ад якога закладвала перапонкі, а груды целаў, павержаныя разгарачанаю армадай, усё напіралі; пёрлі ў пройму пераходу па скалечаных і трупах. Недапітыя бутэлькі лопаліся ў цемры, як асколкавыя снарады, разрываючы й разварочваючы ўсё жывое.

Людзі правальваліся ў стагодзьдзі Нямігі — у яму, вырытую бульдазэрыстамі разам з раскрышанымі касьцямі; глыбей, да ўдушша і пачарненьня, у таўхатню Ніжняга рынку, дзе буяняць зборышчы п'яні ў абдымку, а паводка віруе прорвамі нечыстотаў, яшчэ глыбей, пад нагрувашчаньнем целаў, у крывавы мясьніцкі рад, дзе на вачох натоўпу трушчаць канцавіны й з гартаннымі выкрыкамі чэлядзі, са спуджаным бабскім віскам перабіваюць хрыбты набрынялым тушам; і нарэшце, раздушаныя да вантробаў праз рот, пагружаліся ў грукат сякераў скрозь шаламы, шчыты й кальчугі палачанаў ды яраславічаў, у малатарню калёнай зброі, даверху накормленае чалавечынай, у чавільню віна лютасьці й гневу — раку Нямігу, якой няма.

Толькі тады, калі аграмадны калодзеж запоўніўся перадсьмяротным ровам даверху, калі зямля навакол загула ад стогну, натоўп здрыгануўся; у дзясяткі грудзей ужо скандавалі: «На-зад! На-зад!», і дужэйшыя хлопцы пачалі адчайна расьцягваць мешаніну скрываўленых целаў. Зь пекла выбіраліся тыя, хто цудам застаўся ў жывых — аглухлыя, ачмурэлыя, у крыві й без абутку, яны падалі на траву, хапіўшы паветра ў лёгкія. Кагосьці адкачвалі; на газоне раскладвалі страшныя счарнелыя трупы з выбітымі абцасамі вачыма, а зь пераходу ў вечаровае імжы дымілася цёплая чалавечая пара.

Лесьвіца ў неба

Назаўтра, апоўдні трыццаць першага, калі пасьля прэзыдэнта вымыты ад бруду й крыві пераход быў завалены ландышамі, калі там ужо паціху таўкліся ўчорашнія відавочцы, а шматлікія тэлекамэры й фатографы пільнавалі пранізьлівых кадраў (і было, было паскуднае жаданьне сунуцца ў аб'ектыў з трагічным тварам ці сьвечкай), я бачыў на верхніх прыступках сьветлавалосага хлопчыка-выпускніка гадоў шаснаццаці, у белай, празрыста-белай, што аж сьвяцілася, блузе і дымчатых сонечных акулярах. Хлопчык плакаў. За ягонай сьпінай было неба — верхавіны дрэваў, далёкія дахі й аграмадныя, азораныя сонцам нябёсы. Варта было зрабіць пару дзясяткаў крокаў, каб выбрацца зь пераходу, у ласкавы ветрык, шолах каштанаў, узьбярэжную сьвежасьць Сьвіслачы, і ўпэўніцца, што жыцьцё цудоўнае.

Паспрабуйце прайсьці прахон угару, праз натоўп, праз вал чалавечых целаў, надыханага піва й дурнога напору, пастарайцеся ўзьняцца, як бы вам ні было гэта цяжка, крычаць, хоць вас і ня чуюць, стрымліваць і выцягваць з правалу тых, хто падае, тых, хто зьбівае вас з ног — і на бліскучых верхніх прыступках, закіданых кветкамі, з сонечным асьляпленьнем уваччу вам стане ясна, што гэта такое, лесьвіца ў неба. Для Менску, для ўсяе Беларусі менавіта адсюль, з гістарычнага страшнага выгіну падымаецца шлях да Сабору, велізарных заляў у золаце ды вагнях, з усемагутным хорам; да Катэдры, дзе можна зайсьці, прысесьці на лавачку і ва ўрачыстае цішы разабрацца ў самім сабе; да Купалаўскай, да праспэкту Машэрава, дзе шчасьлівыя вулічныя эвангелісты, зазіраючы ў глыбіні душы, запросяць вас на сваё служэньне дахаты.

Тыя, хто прыяжджае сюды наведаць месца трагедыі, моўчкі топчуцца на чорных прыступках, і, на імгненьне адчуўшы, як заняло падуздых, спускаюцца назад, у падзем'е. Яны думаюць, тут усё скончылася. Бо не было масавага пахаваньня ўсім мірам, стотысячных мітынгаў жалобы, нацыянальнага перажываньня плошчамі, сем'ямі й школамі, не было таго, каб здрыгануліся разам, прачулі, што гэта мы расьпіхваем і падштурхоўваем, што гэта мы, Госпадзе, самі ломімся й прэмся ў прадоньне.

Няміга на вачох ператвараецца ў катастрофу памяці.

Таму зараз, калі неспасьціжную ціскатню ціхай сапай збываюць з парадку дня, калі ўлады заткнулі рот праўдзе й парасьпіхалі па ўручанскіх ды сухараўскіх дварох труны з разбродам зьнямелай радні, калі ў падземным пераходзе ўжо прынюхаўся пах таплёнага воску й зьвялых кветак, а на іншых станцыях ля эскалятараў і пры дзьвярох натоўпы перастаюць пасоўвацца гэтак няёмка, гэтак абачліва; калі ў горадзе абарочваюцца на цудоўных дзяўчатаў ужо бяз думкі, што там і такіх душылі, пераломвалі ножкі ў каленках і выбівалі зубы; ды галоўнае, калі ўжо блізка і ўзбуджаюць новыя хвалі пеннага піва й бурлівыя плошчы, поўныя публікі — правал памяці робіцца ўсё чарней, усё адчайней, і паражае страх за нашу краіну. Для тых з нас, хто, маючы вочы, чытае, хто ведае раны зямлі й дарогу да Госпада Бога, тых, хто бачыць страшныя сны пра свой родны горад і баіцца, што яны збудуцца — пароль «Няміга». Яшчэ раз: ня «Мір», ня «Магна» й ня «Манга-Манга» — НЯМІГА.

Бо, можа быць, нам ня так ужо шмат засталося. Можа быць, самы час: запракінуць твар у воблачныя вышыні, адчуўшы, як цісьне, як трушчыць натоўп, як ад удушша цямнее сьвет, як млее прытомнасьць, а пачварны распухлы язык вось-вось заваліцца ў горла й спыніць дыханьне, з апошніх высілкаў, з крывавага сэрца вырваць крык пакаяньня:

БОЖА! ДАРУЙ НАМ УСІМ!

І Ён дасьць сілаў узьняцца.

31 траўня — 9 чэрвеня 1999 г.

ТРАГЕДЫЯ КОСАВА Ў СЬВЯТЛЕ ГІСТОРЫІ

Віктар МУХІН

Кожны можа зычыць лепшага сэрбам, а не албанцам, толькі хай не паўтарае бессэнсоўныя фразы, быццам тыя другія – тэрарысты, гангстэры й фанатыкі. Сытуацыя ў Косаве вымагае ўзважанага падыходу.

Каму належыць Косава? Косава сэрбскае, – адкажа кожны сэрб, – дастаткова пазнаёміцца з нашай гісторыяй і літаратурай, з вуснымі паданьнямі ці папросту паехаць у тамтэйшыя мясьціны й наведаць найважнейшыя помнікі нашае культуры, пераважна сярэднявечныя цэрквы й манастыры. З гэтым не пагодзяцца албанцы: «Косава – албанская зямля, дастаткова паехаць туды й паслухаць, якою моваю гавораць месьцічы й вяскоўцы. Як маеце болей часу, дык варта пазнаёміцца з гісторыяй рэгіёну».

Сёньня ў выніку этнічных чыстак шторазу цяжэй пачуць у Косаве албанскую мову – гучыць яна пераважна ва ўцякацкіх лягерох. Але гэтым самым не разьвязваецца праблема. Каб зразумець сутнасьць сэрбска-албанскага антаганізму, трэба памятаць пра пэўны шэраг гістарычных ды культурных фактаў.

Сэрбы кажуць пра Косава гэтак:

– Гэта заўжды была наша зямля, вельмі істотная частка сэрбскага сярэднявечнага гаспадарства, што разьвівалася да прыходу туркаў на Балканы ў канцы 14 стагодзьдзя. На фрэсках у косаўскіх цэрквах можна ўбачыць, што сэрбы насілі прыгожыя строі ды елі з культурнага посуду ў часе, калі насельнікі шматлікіх тагачасных дзяржаваў сярэдняе й паўночнае Эўропы вялі вельмі прымітыўны лад жыцьця. Пад Прысьцінаю месьціцца Косава Поле, дзе нашыя войскі супрацьстаялі турэцкай навале ў 1389 годзе. Гэтая падзея апетая ў народных песьнях, што дайшлі да сёньня. Косава Поле – гэта сэрбская нацыянальная сьвятыня і ўвадначасьсе балючы сымбаль пачатку шматвяковага прыгону. Пасьля няўдалых антытурэцкіх паўстаньняў нашыя продкі мусілі ўцякаць з Косава; эміграцыйная хваля ўзмацнілася ад канца 17 ст. Калі туркі ўціскалі сэрбаў, на нашыя абшары пачалі прыходзіць албанцы: мусульмане, паплечнікі туркаў, якія ня толькі заставаліся на гэтай зямлі, але й перасьледавалі тых сэрбаў (праваслаўных хрысьціянаў), якія не далі сябе ў свой час скарыць. Албанцы ў сваёй сутнасьці здраднікі, і заўжды пільнавалі нагоды, каб далучыцца да нашых ворагаў. Калі ўжо не было туркаў, у часе другое сусьветнае вайны, яны супрацоўнічалі з італьянскімі акупантамі. Па вайне албанцы сядзелі ціха, але пасьля збунтаваліся. Мы далі ім аўтаномію, але ім таго не ставала, яны хацелі адлучыцца й прыяднацца да Албаніі. Іхныя бунты нарасталі, пагражаючы спакою ў дзяржаве. Мы, сэрбы, ніколі не аддамо Косава, як жыды ніколі добраахвотна не пакінуць Ерусаліму.

Косаўскія албанцы маюць сваю вэрсію падзеяў.

З Косавам яны злучаныя ад старажытнасьці, бо перад тым, як сюды ў 6 ст. прыйшлі славяне, гэтыя абшары насялялі ілірыйскія плямёны – іхныя продкі. Гэткім чынам, славяне, продкі цяперашніх сэрбаў, змусілі частку ілірыйцаў пайсьці ў горы, але рэшта гэтак і не пакінула сваіх спрадвечных земляў. Гэта праўда, што колькі стагодзьдзяў тут панавалі сэрбы, але пасьля прыйшлі туркі, якія паняволілі албанцаў, як і сэрбаў ды іншыя народы; таму касавары не вінаватыя, што ў часе турэцкага панаваньня адбываліся зьмяшэньні народаў. Сэрбы забываюцца на тое, што албанцы гэтаксама змагаліся з туркамі – і на Косавым Полі, разам з славянскім рыцарствам, і пазьней, у часе паўстаньняў ды бунтаў, асабліва на поўначы, у каталіцкай частцы Албаніі, да якой належыць і Косава. Гэта праўда, што шмат албанцаў навярнулася ў ислам, але перад тым яны процістаялі ісламізацыі; зрэшты, у Босьніі сэрбы таксама станавіліся мусульманамі. За турэцкаю няволяю было правіла «падзяляй і пануй», таму былі выпадкі, калі албанцы-мусульмане ўціскалі ў Косаве хрысьціянскі люд, але наагул ліній падзелу была вера, а не нацыянальнасьць, бо разам з сэрбамі цярпелі перасьлед і албанскія каталікі. А ўжо ж чым ислам горшы за хрысьціянства?

Заўжды ў Косаве албанцы пераважалі ў колькасьці, а край гэты мае натуральную лучнасьць з рэштаю албанскае тэрыторыі, і разам яны ўтваралі супольны гаспадарчы й культурны абшар. Менавіта ў косаўскіх местах паўсталі пры канцы 19 – на пачатку 20 ст. албанскія палітычныя ініцыятывы й чыннасьць, зьвязаная з нацыянальна-культурным адраджэньнем; тут выпрацоўвалася ідэя незалежнасьці Албаніі. Сэрбы ад пачатку мінулага стагодзьдзя спрабавалі палітычнымі й вайсковымі захадамі (не ўнікаючы ваеннага тэрору супраць албанскага цывільнага жыхарства) не дапусьціць да паўстаньня Албанскае дзяржавы, а калі тое не атрымалася, дамагліся ад «вялікіх» дзяржаваў прызнаньня ўваходжаньня Косава ў склад Сэрбіі. Для албанцаў гэта сталася шокам, бо народ апынуўся падзелены мяжою.

Па першай сусьветнай вайне албанцы змагаліся за вольнасьць Косава, аднак прайгралі. Сэрбы ж уціскалі албанцаў, таму албанцы з радасьцяй віталі ўзьяднаньне Косава з Албаніяй у часе італьянскай акупацыі, тым болей італьянцы забясьпечылі ім лепшыя ўмовы існаваньня (да прыкладу, было арганізаванае албанскае школьніцтва). Іншыя пайшлі да камуністычнае партызанкі Ціты. Але ніводзін з гэтых крокаў ня меў выніку па вайне.

На другой сусьветнай вайне ў дачыненьні да албанцаў былі ўжытыя палітычныя рэпрэсіі. У 1968 годзе косаўская моладзь, як і ўся эўрапейская, маніфэставала за пашырэньне сваіх грамадзянскіх і нацыянальных правоў. У 1974 годзе краю надалі шырокую аўтаномію, хоць сэрбы працягвалі ўважаць албанцаў за людзей другое катэгорыі. Усе надпісы рабіліся ў дзьвюх мовах, поруч з сэрбскаю працавала албанскамоўная тэлевізія й радыё, выдаваліся албанскія газэты й кніжкі, а дзеткі й моладзь маглі навучацца на ўсіх узроўнях у сваёй роднай мове. Ува Прысьцінскім універсытэце ладзіліся летнія моўныя школкі для іншаземцаў ды нашчадкаў раскіданых у сьвеце албанскіх эмігрантаў. У тым часе Албаніяю кіраваў рэжым Энвэра Ходжы, які шчыльна зачыніў свае межы, таму Прысьцінскі ўнівэрсытэт стаўся своеасабліваю Мэккаю для ўсіх аматараў албанскае мовы й культуры.

У 1981 годзе, па сьмерці Ціты, касавары выйшлі на вуліцы, дамагаючыся сваіх правоў у мірнай дэманстрацыі, што была вытлумачаная ўладамі як бандыцкая акцыя, у выніку чаго палеглі першыя ахвяры. Паступова сытуацыя пагаршалася.

Трагічны злом надышоў у 1989 годзе, калі Мілошавіч скасаваў краёвую аўтаномію. Улады пачалі зачыняць албанскія школкі ды іншыя інстытуцыі. Тысячы албанцаў страцілі працу, магчымасьць вучыцца на роднай мове, удзельнікі пратэстаў траплялі ў вязьніцы. У албанскіх асяродках панавала канцэпцыя мірнага супраціву: байкот сэрбскіх парлямэнцкіх выбараў, выбраньне ўласнага парлямэнту й выканаўчае ўлады (не прызнаных сэрбамі); арганізацыя «паралельнае дзяржавы» з усімі ейнымі інстытуцыямі: прыватныя кватэры спаўнялі функцыю ня толькі партыйных сядзібаў, але й школьных клясаў, універсытэцкіх лекторыяў, лекарскіх кабінэтаў а нават сядзібаў навуковых арганізацыяў. Гэтаму спрыяла салідарнасьць албанцаў ва ўсім сьвеце – гэтак яны бяз збройных сілаў, заклікаючы сьвет дапамагчы ім у абароне сваіх нацыянальных правоў, трывалі колькі гадоў. Ажно зьнянацку нецярплівыя сталі ствараць Вызвольнае войска Косава (УЧК).

У косаўскім канфлікце ахвяраю прапаганды сталіся пераважна албанцы. Шмат хто ўважае за добрую манэту сьцьвярджаньні, быццам традыцыя родавага (кланавага) грамадзкага ладу паўночнае Албаніі й Косава ператварылася ў гангстэрска-мафійныя структуры, албанцы ж сталіся фарпостам ісламскіх фундамэнталістаў ды падступнымі тэрарыстамі, ня маючы ніякіх дзяржаватворчых здольнасьцяў. Гэта вельмі падобна да сэрбскае прапаганды, узброенае «доказамі» лекараў, палітыкаў і навукоўцаў, быццам «албанцы прымітыўныя як пралюдзі зь перадгістарычных часоў, якія ад страху перад зьвярамі спалі на дрэвах» (даслоўная цытата з сэрбскае навуковае працы 1913 г.), быццам іхныя зубы падобныя да зьвярыных і г.д. Іншыя пісалі, што албанцаў нагэтулькі шмат у Косаве, бо большыня з іх – гэта албанізаваныя сэрбы; даходзіла да вар'яцтва, калі адмаўлялася існаваньне асобнае албанскае нацыі, якая ўважалася за прадукт антысэрбскае аўстрыйска-італьянскае змовы.

Змаганьне косаўскіх албанцаў за сваю незалежнасьць сэрбамі тлумачыцца як тэрарыстычная дзейнасьць, але хіба касавары падкладаюць бомбы на вуліцах Бялграду ці нават Прысьціны, як тое рабілі ірляндзкія ці баскія тэрарысты? Албанцаў вінавацяць у ісламскім рэлігійным фанатызме, аднак гэта пярэчыць праўдзе. У некаторых радзінах дагэтуль ад турэцкага часу перахавалася традыцыя выхаваньня сыноў магамэтанамі, а дачок каталічкамі. Рэч у тым, што вылучна мужчыны даўней сутыкаліся з турэцкімі ўладамі, яны ж плацілі падаткі (гэта было выгадней рабіць мусульманіну, як хрысьціяніну), таму з прагматычнага гледзішча прымалі ислам, але ў доме панавалі даўнія хрысьціянскія традыцыі.

Прыйдзе час, калі касавары вернуцца ў свае хаты й Косава адродзіцца да нармальнага жыцьця, аднак дзеля гэтага трэба, каб у Сэрбіі зьмянілася ўлада й зьявілася разуменьне права кожнага народу на самавызначэньне, незалежна ад таго, якое месца й ролю ён займаў у мінулым.

Інданэзія: цана свабоды

Сяргей БОГДАН

Калі не распад, дык глыбокія перамены пагражаюць чацьвертай па колькасьці насельніцтва дзяржаве сьвету – Інданэзіі. Такое разьвіцьцё падзеяў можна было прадбачыць даўно, бо цяжка ж утрымаць 210 мільёнаў чалавек, да таго ж расьселеных на моцна раскіданых шасьці тысячах выспаў, разам без супярэчнасьцяў (адлегласьць між скрайнімі выспамі – як ад Ірляндыі да Ўралу). Гэта край тысячаў выспаў і сотняў культур. І агульнага ў іх няшмат – хіба што 350-гадовы галяндзкі прыгнёт ды барацьба зь ім.

Вытокі інданэзійскай незалежнасьці – у японскай палітыцы часоў другой сусьветнай. Менавіта дзякуючы японцам і пачалося вызваленьне Азіі. Іхная азіяцкая палітыка рэзка адрозьнівалася ад эўрапейскае палітыкі Нямеччыны. Ішлося (прынамсі, ад пачатку 1943-га) пра «Азію для азіятаў» – утварэньне з «захопленых-вызваленых» краёў шэрагу незалежных дзяржаваў, якімі б апекавалася Японія. Пасьля паразы Японіі ў вайне калянізатары паспрабавалі вярнуць назад свае ўладаньні, але ўздужэлы «за японскім часам» нацыянальны рух перамог імпэрыялізм. Правадыр інданэзійскага нацыянальнага руху Сукарна быў прызнаны японцамі лідэрам нацыі яшчэ на пачатку 1945-га, і ў выніку ў тым жа 1945-м зьявілася Рэспубліка Інданэзія.

Утрыманьне адзінства краіны было заўсёднай праблемай для ўладаў. Вялікую ролю ў яе вырашэньні мела й мае войска. Ідэалягічны фундамэнт забясьпечвала нацыяналістычная дактрына, што сьцьвердзіла роўнасьць усіх народаў і рэлігіяў. Але, як той кажа, усе роўныя, але некаторыя раўнейшыя. Генэрал Сухарта, дыктатар, што правіў дзяржавай 32 гады, апраўдваў сваё доўгапраўленьне і тым, што йнакш у Інданэзіі ніколі не стварыць адзінай нацыі. Сухарта лічыўся сябрам «дэмакратычнага сьвету», але не дапускаў дэмакратызацыі сваёй краіны. Гэта яму нейкі час удавалася, але калі трохі наладзілася гаспадарка, людзі, а найперш студэнты, сталі патрабаваць свабоды. Ды кажуць, мільярдэр Сорас, стаміўшыся заклікаць дыктатара да спыненьня рэпрэсіяў і дэмакратызацыі, падарваў стабільнасьць інданэзійскай рупіі. За ёю ляснула і ўся «дзяржаўна-рынкавая» эканоміка. Людзі пад канец 90-х нават рысу ўдосталь ня елі (у Інданэзіі ядуць рыс, як прыкладам, мы чорны хлеб і бульбу – за кожнай ядой). А сям'я Сухарты шыкавала.

Усё пачалося ў траўні 98-га з расстрэлу мірнай студэнцкай дэманстрацыі. Неўзабаве дыктатара выкінулі з прэзыдэнцкага палацу, але апарат яго ўлады дзейнічаў і надалей.

Асновай інданэзійскага грамадзтва, як і, напрыклад, турэцкага, заўжды было войска, што ў некаторых раёнах замяняе сабой астатнія грамадзкія інстытуцыі. Афіцэры, як дзейныя, так і адстаўнікі, апанавалі ўсе больш-менш значныя цывільныя пасады – ад міністраў да настаўнікаў. Яны кіруюць многімі прыбытковымі прадпрыемствамі і маюць у руках вялікія грошы. Прычым наступнік Сухарты, прэзыдэнт Хабібі, працягвае выступаць за такое цывільна-ваеннае становішча арміі: «Інданэзійскія ўзброеныя сілы нарадзіліся ў рэвалюцыі. А іхная маці – цнатлівы народ. Таму армія мусіць абараняць і ахоўваць цнатлівую маці». Армія – гэта рухавік і тормаз Інданэзіі. Ясна, што войска адыгрывае моцную нацыятворчую ролю, але апошнім часам яно ўсё часьцей замінае дэмакратычнаму прагрэсу. Ці адыдзе яна ад палітыкі пасьля скарачэньня колькасьці дэпутатаў ад арміі (зараз будзе іх 38 з 500) у наступным парлямэнце? Усе цьвердзяць, што з арміяй паразумецца можа толькі Сухарта, бо гэта ён гэтак узвысіў вайскоўцаў. Сухарту між тым ужо 83 гады. Што ж будзе, калі ён памрэ, – пытаюцца людзі. Ці ня выйдзе войска цалкам з-пад кантролю?

Апазыцыя абвінавачвае армію (разам з кланам Сухарты), што яны наўмысна падбухторваюць беспарадкі, каб узьніклі зачэпкі для ўмяшаньня. Таму й правакуюць сутычкі й варажнечу між мусульманамі і хрысьціянамі, пагромы кітайскіх кварталаў, ня кажучы пра зьверствы пры задушэньні незалежніцкіх рухаў, напрыклад, на Тыморы. Хто стаяў за разбурэньнямі крамаў, банкаў, цэркваў, правакацыйнымі стрэламі ў дэманстрацыі ці сыстэматычнымі згвалтаваньнямі жанчын кітайскага паходжаньня? Падозраньні падаюць на армію, і ёсьць доказы. Але, мабыць, нічога ў іх ня выйшла – выбары адбыліся-такі, і перамагла партыя Мэгавата, што выступае за свабоду, цярпімасьць і абмежаваньне ваеншчыны. Быццам бы, каля 40% інданэзійцаў за іх прагаласавала, тады як за старарэжымнікаў – толькі 10%.

Апошнім часам надзвычайна абвастрылася варажнеча паміж. хрысьціянамі (10% насельніцтва) і мусульманамі (87%). Палаюць мячэты й цэрквы, у Джакарце радыкальныя студэнты-ісламісты патрабуюць «сьвятой вайны».

Найбольш жа моцна ўзварушвае інданэзійскае грамадзтва калатнеча паміж мясцовымі й новаперасяленцамі. Большая частка інданэзійцаў жыве на перанаселеных абшарах, і таму ўрад мусіў распачаць шырокую кампанію перасяленьня. Але не ўлічылі мноства аспэктаў гэтай справы. Балышыня прыбышоў вераць у Аллага, але хоць яны й бусурманы, а маюць больш разьвітую культуру, чым тамтэйшыя хрысьціяне, і валодаюць большым досьведам у гаспадарцы і справах. Дзякуючы гэтаму, яны лёгка адцясьняюць ад улады мясцовых, ды й Сухарта сам аддаў многія пасады на немусульманскіх астравах мусульманам. Шмат дзе хрысьціяне з-за перасяленьня і ўвогуле апынуліся ў меншасьці. Становішча яшчэ неяк трывала, пакуль пры ўладзе быў грозны Сухарта, але з прыходам больш лібэральнага Хабібі ўсё пачало трышчаць па швох. Толькі цяпер усе пабачылі, чаго вартая Сухартава палітыка. У рэгіёнах, куды нагналі асаднікаў, жах што робіцца: паўсюль цягаюцца банды ачмурэлых людзей з рыдлёўкамі, сякерамі й сярпамі, шукаючы новых ахвяраў. Вайскоўцы толькі бездапаможна пазіраюць на іх, бо сярод асаднікаў шмат адстаўнікоў. Рука руку мые. Ужо дайшло да таго, што адрэзаныя галовы насаджваюць на калкі паабапал дарог ды раскідваюць часткі цел...

Побач з гэтым узмацніўся вызвольны рух Усходняга Тымору, Заходняй Гвінэі, Сулавэсі... У Інданэзіі так і ня ўзьнікла трывалай эканамічнай базы для адзінства. Прыродныя багацьці краіны скупчаны менавіта на ўскраінах, але тыя анічога ня маюць з гэтага, бо ўсе грошы захапалі яванскія капіталісты.

Найбольш вядомыя незалежніцкія рухі – за ўзьяднаньне папуасаў у Новай Гвінэі ды за вызваленьне Ўсходняга Тымору. Духоўны лідэр апошняга – ляўрэат Нобэлеўскай прэміі міру біскуп Карлас Бэла. Вайна супраць акупантаў трывае тут ад 1975 г. Пасьля выводу партугальскіх войскаў Усходні Тымор быў абвешчаны незалежным, але праіснаваў лічаныя тыдні, бо пачалося інданэзійскае ўварваньне. Ядром змаганьня была й ёсьць левая арганізацыя FRETILIN (на сёньня блізу 600 байцоў), што зь цягам часу ператварылася ў партызанку, якая моцна шкодзіць акупантам. ААН не прызнала анэксіі Ўсходняга Тымору. Нядаўна была ўрэшце дасягнута дамоўленасьць, што ў ліпені правядуць пад кантролем ААН рэфэрэндум па незалежнасьці. Эўрапейцы паведамляюць з востраву, што ўзброеныя да зубоў праінданэзійскія асаднікі штодня ладзяць крывавыя правакацыі. Падтрымкі сярод тутэйшых яны ня маюць. Калі дойдзе да сапраўднага рэфэрэндуму, дык, як кажуць назіральнікі, 99% насельніцтва будзе за незалежнасьць. Таму й імкнуцца «інтэгратары» выклікаць беспарадкі, каб адцягнуць рэфэрэндум і сказаць сьвету – зірнеце, што будзе на Тыморы, калі інданэзійскія войскі пойдуць.

Інданэзійскія ўлады колькі разоў аб'яўлялі пра прымірэньне, але гэта ўсё на словах, дэклярацыі. Людзей жа мясцовых працягваюць забіваць – за 23 гады акупацыі замардавалі каля 200 тыс. чалавек (гэта на 700 тысяч народу).

Ад 1965 г. змагаюцца й папуасы Заходняй Гвінэі за ўзьяднаньне з Папуа-Новай Гвінэяй. Пасьля дэкалянізацыі ААН аддала іх край Інданэзіі. Немагчыма казаць пра нейкую слушнасьць гэтага рашэньня – нават антрапалягічна папуасы й малайцы-інданэзійцы зусім розныя. Каб сьцьвердзіць свае правы, інданэзійцы сфальшавалі рэфэрэндум. Узброеную барацьбу за незалежнасьць вядзе «Арганізацыя вызваленьня Папуа» (ОРМ), якую неафіцыйна падтрымліваюць з Папуа-Новай Гвінэі. І змаганьне ейнае ня менш геройскае, чым, скажам, баскаў – за свабоду заплацілі яны ўжо ня менш за 100 тысяч жыцьцяў. Дарагая цана свабоды.

Маладэчна

Вязень Ляшук зь вёскі Паніквы

Працяг са старонкі 1

Гэта былі дзьве частушкі.

Сябра адазваў мяне за разьбіты камуністамі касьцёл ды кажа таямніча:

«Дай я табе пачытаю!» Тады я ўзяў сам тыя аркушы ды чытаю:

Эх, колхоз, колхоз, колхоз,
Ты – наше страданіе!
Ты довёл людей до слёз
І до голоданія.
За окном сірень цветёт,
На ней ліства зелена.
Сталін всех нас в гроб сведёт
По заветам Леніна.

Гэтыя радкі мяне тады проста акрылілі! Я зразумеў, што не адзін такі на сьвеце. Неўзабаве й сам пачаў выказваць свае пачуцьці вершамі.

У той час камуністы распаўсюджвалі па ўсім сьвеце, што яны змагаюцца за мір. На самай справе яны распальвалі войны. У любой краіне, дзе толькі маглі, сутыкалі адны плямёны з другімі, каб гэткім чынам потым прыбраць усё да сваіх рук. І я паўстаў супраць гэтага. У 9-й клясе я не захацеў падпісацца пад Стакгольмскім вазваньнем за мір.

Тады ўсе павінны былі пад гэтым «вазваньнем» подпісы ставіць. А я тлумачыў людзям: ставячы подпіс пад гэтым дакумэнтам, яны фактычна падпісваюцца за вайну. А калі даць камуністам волю прыкрывацца ілжывай шырмаю, што яны нібыта хочуць міру – што будзе далей?!

Я ледзь перайшоў у 10-ю клясу. Мяне тады хацелі выключыць са школы. Мучыўся цэлае лета. Жаў жыта, а сам думаў: што рабіць, як жыць далей? За тое лета мой зрок, і дагэтуль слабы, яшчэ больш упаў. Школу скончыць мне далі, неўзабаве стала ясна, што далей вучыцца не пашчасьціць. Паступаў у пэдагагічны інстытут двойчы – у Берасьце, потым у Горадню, але вочы ўжо не вытрымлівалі нагрузкі.

Улетку 1953 году да мяне прыйшлі абшукваць. Знайшлі вершы – скокнулі ад радасьці: во, маўляў, ёсьць зачэпка! А я пісаў тады лісты аднаму чалавеку, які таксама траціў зрок. Я добра разумеў ягоны стан, таму пісаў яму: ты трымайся, змагайся, стой моцна. І ў яго дома таксама абшуквалі, ня памятаю, у сувязі з чым. Я ня ведаю, што гэты чалавек рабіў, але, як мне сказалі потым, нешта «палітычнае».

І вось, калі знайшлі мой ліст да яго, сьледзтва палічыла, што я яго на нешта падбухторваю. Супраць савецкае ўлады. А на самой справе – я яго падтрымліваў маральна...

Знайшлі ў мяне, шукаючы, антысавецкія вершы, а ўжо пасьля арышту ў Берасьці я вырашыў сам пачытаць вершы свае. Зразумеў: усё роўна мяне пасадзяць, дык хоць пачытаю гэтым катам.

...Ноч. Дзьве гадзіны ночы. Падымаюць мяне ў маёй адзіночнай камэры. Вядуць... Рукі назад, сьпераду і ззаду – кагэбісты. Шэраг дзьвярэй камэраў паабапал... Зьлева стаяць ланцугом чалавек шэсьць-восем, такіх адкормленых, і анэкдоты распавядаюць. Рагочуць... Гэта – тыя людзі, якіх выклікаюць, калі трэба катаваць зьняволенага.

Уваходжу ў кабінэт – там сядзіць капітан Філіпаў, быў такі абласны сьледчы. Ну, і падпалкоўнік Зінчанка ў форме (Філіпаў – у цывільным). Стол прывінчаны да падлогі. Табурэтка прывінчана. Пісталеты ляжаць у іх побач. А за вокнамі аўчаркі бегаюць, выюць. А я чытаю сьледчым такі вось верш:

Кто, словно вампір,
пьёт народную кровь,
Кто честных людей не шчадіт,
В чьём сердце уже охладела
любовь,
Кто правду в неволе томіт,
Кто грозным тіранам – товарішч
і брат,
Кто совесть навек потерял –
Тот будет советской страны
депутат.
Так Сталін велікій сказал!

Я напісаў «Сталін каварны», але зьмяніў на «вялікі». Бо за «каварнага», бачу, могуць мяне ўдарыць пісталетам па вачах. А я іх бярог. Таму прачытаў верш і дадаю: «Сталін «вялікі» – у двукосьсі»...

2.

Івана Ляшука асудзілі адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу БССР: 72-а (антысавецкая агітацыя) і 76-б (стварэньне антысавецкай групоўкі). У агульнасавецкім кодэксе гэтым абвінавачаньням адпавядалі артыкулы 58.10 ды 58.11. Яны «пацягнулі» на дзесяць гадоў лягераў, перад адпраўкай у які здарылася цікавая сустрэча. Памяць аб ёй спадар Іван пранёс праз усё жыцьцё. Як і пра сустрэчу другую, ужо ў Комі АССР...

– Калі нас рыхтавалі на этап, мяне на адны суткі пасадзілі зь немцамі. Загадалі, каб я зь імі не размаўляў. Яны думалі, што я нічога не разумею па-нямецку!.. Гэтыя двое немцаў распавялі мне: у гэтай самай турме сядзяць яшчэ 60 чалавек па справе паўстаньня ў Нямеччыне 17 чэрвеня 1953 году. Адзін з арыштаваных нямецкіх паўстанцаў, 36-гадовы Ганс Танэнбэрг, выходзіў на сувязь праз азбуку Морзэ, выстукваючы па ацяпляльнай сыстэме. Аднойчы Танэнбэрг паведаміў, што нас павязуць заўтра з берасьцейскае турмы на ўсход. Мяне потым аддзялілі ад немцаў у вагоне-«сталыпіне» – высадзілі ў Воршы на перасылку. А іх павезьлі на Маскву. А на пачатку таго шляху Ганс Танэнбэрг распавядаў, як камуністы білі па іх з кулямётаў. Людзі ў Бэрліне ды па ўсёй Нямеччыне выйшлі на вуліцы, спачатку меліся выказаць адно эканамічныя патрабаваньні. Потым ужо пайшлі палітычныя... Танэнбэргу далі 25 гадоў. Больш мы ня бачыліся. Я пісаў колькі гадоў таму на «Нямецкую хвалю» ў Кёльн... Мне паведамілі, што мой ліст перасланы ў Чырвоны Крыж і трапіў у Гамбург.

Танэнбэрг жывы... Можа, мне кепска пераклалі адказ, але выходзіла так: што ён не пажадаў, каб я меў ягоны дакладны адрас... Памятаю, калі мы былі ў зьняволеньні разам, ён і ягоныя паплечнікі абяцалі: «Калі камуністаў ня будзе, калі ім прыйдзе канец, дык мы прыедзем да цябе, вылечым табе вочы». Я тады яшчэ трохі бачыў. А цяпер вось я напісаў быў, што зусім сьляпы, маю трох сыноў...

Мне ня трэба матэрыяльнае, а трэба духоўная падтрымка. У 53-м годзе мне йшоў 22-гі, я быў адзіночкам, вакол быў рэжым страшны. За любое слова саджалі... Знаёмства з немцамі сталася для мяне вялікай падтрымкаю! Танэнбэрг быў для мяне сымбалем, натхняў у барацьбе супраць камуністаў. Я быў уражаны подзьвігам нямецкіх паўстанцаў. Цяпер жа выйшла расчараваньне... Добра, што ўжо ў старасьці.

Хутка я ўжо быў у Комі АССР, трапіў ва Ўсьцінлаг. З Усьцінлагам межаваў Пячорлаг. Я добра памятаю некаторых людзей таксама і з Пячорлагу. Асабліва аднаго, украінца. Яго звалі Раман Місюра. Ён мне не казаў дакладна, за што сядзеў, але я зразумеў, што гэта – нацыяналіст.

Ён быў родам са Станіслава (цяпер Івана-Франкіўск). Яму тады было 57 гадоў. Місюра адбываў у Пячорлагу 10 гадоў. Мы з ім сябравалі, нягледзячы на розьніцу ва ўросьце. Калі я пісаў на расейскай мове дадому лісты, спадар Раман мне казаў: «Чым па-расейску, ты лепш пішы па-ўкраінску. Бо месца, дзе ты нарадзіўся – гэта Підляшша, ля Берасьця». Ён казаў, што гэта ўкраінская мясьціна. Ну, на ўкраінскай дык на ўкраінскай! Усё роўна Місюра сам стаў пісаць мае лісты. Я тады ўжо настолькі страціў зрок, што ня мог ні пісаць, ні чытаць.

Памятаю, ён мне распавядаў, як катавалі яго, дабіваючыся паказаньняў. Ён быў настолькі стойкі, моцны, што не адказваў. Вось тры расказаныя ім выпадкі.

Вядуць яго па цёмным калідоры. Ноч, холадам дыхае ўсё бліжэй і бліжэй. Холад, вільгаць... І раптам – дарога абрываецца. Чалавек ляціць уніз. А там вада. Халодная вада. Вада падымаецца ўсё вышэй. Вось яна ўжо ля самага роту. Каты чакаюць: ці будзе ахвяра крычаць, ці скажа ім «усю праўду»?

Потым – адмысловая такая скрынка, дзе разводзяць клапы. Засаджваюць Місюру ў гэтую скрынку, дзе не павернесься – ні рукамі, ні нагамі, ні галавой. І ўсе галодныя клапы абрынаюцца на яго. І лезуць яму ў вочы, у нос, у вушы, і кусаюць... Гэтае катаваньне доўжыцца доўга, чалавек выходзіць скрываўлены.

Трэці выпадак. Спадара Рамана вядуць у падвал, і ён бачыць пацукоў ды парэшткі чалавечага цела. Ставяць яго тварам да сьцяны і прыводзяць жанчыну й мужчыну. Мужа ды жонку. Не старыя, не маладыя, сярэдніх гадоў – так яны запомніліся Раману. Ім загадваюць распрануцца і без усялякіх цырымоніяў расстрэльваюць. А Місюру папярэджваюць: «Бачыў гэта? Тое будзе і з табою. Гавары!». Маўчыць. Стрэл адзін вышэй галавы, другі... Нічога не сказаў! Тады яго выводзяць адтуль і даюць 10 гадоў...

3.

– Спадар Іван, якіх яшчэ людзей вы сустракалі ў зьняволеньні? Ці трымалі нейкую сувязь зь землякамі-беларусамі?

– Я ведаў аднаго беларуса па прозьвішчы Саласай. Гэта быў, як казалі, «андэрсавец». Тут, у нас, на поўдні Беларусі, былі «бульбашы», але «бульбашоў» я не сустракаў у лягерах. Ведаю, што былі на поўдзень ад маіх родных мясьцін і бандэраўцы – магчыма, мой сябра Місюра быў якраз зь іх... З Саласаем я сустрэўся на перасылцы ў Воршы. Ён адразу мяне «вызначыў», хоць было сорак зь лішкам чалавек у камэры. Саласай распавядаў, што шмат пастраляў гэтых чэкістаў (ён, як і Місюра, быў таксама ўжо немалады). Ён рабіў гэта таму, што чэкісты ягоную сям'ю забралі і жонку ў лесе на ягоных вачах згвалтавалі. Саласай, як я зразумеў, паляк па нацыянальнасьці. Выступаў супраць бальшавікоў, але баяўся пра ўсё распавядаць, бо меў яшчэ дзьвюх дачок, якія ад камуністаў хаваліся.

Ведаў я таксама зь Беларусі дзвюх сясьцёр – Моніку і Фяліцу. Яны раней жылі недзе паміж Навагрудкам і Маладзечнам. Адна з сясьцёр была з 29-га году, другая з 33-га. У іх была яшчэ маці і брат. Усю сям'ю разабралі па лягерах за тое, што яны накармілі вось такіх партызанаў, як Саласай. Фяліца казала: «Зь лесу прыходзяць да нас, а як жа просты чалавек ня дасьць паесьці, калі да яго са стрэльбай прыйшлі з лесу?» Далі па 25 гадоў. Сапсавалі дзяўчатам маладосьць. Ці вярнуліся гэтыя людзі дамоў, я ня ведаю. Я вяртаўся, а яны засталіся. У санітарным лягеры N1 каля невялікай станцыі Вясьляны, празь якую йдзе



чыгунка на Варкуту...

Сустракаў я й некалькіх паліцаяў. Але яны распавядалі, што іх сілай прымусілі. Быў зямляк зь вёскі Выганашч, ад Пінску тут недалёка...

Мне запомнілася таксама мэдсястра-латышка, якая правяла ў лягерох дзесяць гадоў. Яе асудзілі ў 19-гадовым узросьце, а за што, яна мне не казала. Мы часта слухалі разам вершы латыскіх паэтаў, якія перадавалі там, у санітарным лягеры. Яна вызвалілася раней за мяне. Былі там эстонцы... Увогуле, з прадстаўнікамі ўсіх гэтых нацыяў, паняволеных імпэрыяй, мы мелі някепскія дачыненьні. Яны сябравалі са мной, беларусам, яны ўсе хацелі самастойнасьці. Усе! Са мною азэрбайджанцы былі вельмі добрыя. Азэрбайджанцы таксама марылі пра самастойнасьць свайго народу. Мой таварыш Джэмшун Сулейман Оглы запрашаў у госьці пасьля вызваленьня.

4.

Адносіны паміж так званымі «ворамі», лягернымі крымінальнікамі, ды палітычнымі вязьнямі – асобная старонка. Хоць сам спадар Іван кажа, што, па сутнасьці, «адносінаў не было ніякіх».

– Лягер падзяляўся на гэткія «выспачкі» – лягерныя пункты. Яны мелі свае падкамандзіровачныя пункты. Памятаю, толькі ў 1954 годзе «вораў» вырашылі зьбіраць у асобных лягерах. А да таго часу яны зьядалі ўсю ежу, якая выдавалася для «палітычных» і для «простых рабацяг». Пад пагрозай сьмерці самае лепшае крымінальнікі прымушалі аддаваць ім.

Памятаю, як нашу 5-ю падкамандзіроўку пагрузілі на 7-м лагпункце, каб везьці на працы ў тайгу... І яны, гэтыя «воры», крычаць на чырвоных катаў, якія стаяць побач у доўгіх шынэлях: «Вось Трумэн глядзіць на вас, ён прыйдзе на вас хутка!...» Крымінальнікам нічога за гэта не далі – усьміхаюцца, і ўсё. А калі б сказаў гэта які палітычны, яго б, вядома, тут жа ў карцэр пасадзілі б!

Пад канец майго тэрміну «вораў» сталі разводзіць у розныя камеры й казаць: «Будзеш лепш працаваць – будзеш лепш есьці». А перад гэтым наглядчыкі карысталіся «ворамі», каб лепш ціснуць на палітычных. Крымінальнікі мелі поўнае права зьдзекавацца над палітычнымі. А палітычныя ня мелі права прасіць абароны. Я памятаю выпадак... У Каняч-пагосьце быў бунт: супраць «вораў» паўсталі палітвязьні. Яны настолькі надакучылі палітычным, што тыя пабралі калкі і разбурылі барак, у якім «воры» заселі. Загінула тады больш за шэсьцьдзесят чалавек. Але пасьля гэтага «вораў» адтуль прыбралі.

І ў нас, на станцыі Вясьляны, быў падобны выпадак. Нас, палітычных, прывезьлі на адзін лягерны пункт больш за трыццаць чалавек, а плюс да нас яшчэ дваццаць зь лішком кантрабандыстаў. Мясцовыя «воры» вырашылі над намі ўсталяваць уладу. Мы цярпелі ад іх адну ноч, цярпелі другую – нічога добрага з таго не атрымліваецца. «Воры» ужо печ разабралі. Скобы мэталічныя ў пячах былі – іх разагнулі, каб, у выпадку чаго, пакалоць нас. Вось тады мы й паўсталі. На трэцюю ноч згрудзіліся ў некалькі шэрагаў ды ад нараў шчыльнаю сьцяной пачалі ісьці... «Воры» ўбачылі гэта ды спужаліся. Іх было ня так ужо і шмат. Яны пазапаўзалі пад нары, а мы пачалі іх выцягваць адтуль. Выцягалі, білі іх кулакамі, яны прасілі літасьці, плакалі...

Галоўным сярод нас быў тады адзін зьняволены – старшы лейтэнант. Калі прыбеглі наглядчыкі, дык яго тут жа забралі. Але мы запатрабавалі й дамагліся, каб яго вярнулі зноў да нас. І прыбралі «вораў» з гэтае перасылкі.

Гэта было ўжо недзе на пачатку 54-га... Каб такое сталася за Сталіна, альбо за Берыі – натуральна, нас бы вельмі строга пакаралі за гэты бунт.

5.

Іван Ляшук прабыў у лягеры з 17 чэрвеня 53-га да 1 кастрычніка 54-га. Яго справу пераглядзелі, і маладога вязьня вызвалілі па стане здароўя – з-за сьлепаты. Па вызваленьні Ляшука папярэдзілі: калі будзе ачарняць савецкую рэчаіснасьць, на ягоную інваліднасьць больш ніхто зважаць ня будзе! Гэтая пагроза вісела над ягонай галавой да скону савецкай імпэрыі.

– Спадар Іван, як і калі вы прыйшлі да Бога?

– Гэта пачыналася яшчэ ў школе. Потым, у пяцьдзесят трэцім, калі ўжо арыштавалі, потым везьлі ў Комі АССР, я вельмі шмат думаў. І вырашыў: шлях да Бога – гэта адзіна правільны шлях. Пісаць тады яшчэ сяк-так мог, а вось чытаць ужо ня вельмі... Я ведаў, што ў будучыні, магчыма, мне будзе вельмі кепска. Але недзе побач, у той жа камуністычнай рэчаіснасьці, існавалі іншыя людзі.

Аднойчы адзін веруючы чалавек мне прасьпяваў песьню: «Вот ворота пред тобой – за німі два пуці...» А раз, пралежаўшы ў шпіталі ад зімы да чэрвеня-месяца, я йшоў дадому ў зімовай вопратцы і разважаў... У той час я хацеў злучыць у нейкую сыстэму і свае палітычныя погляды, і рэлігійныя пошукі, і ідэалы маладосьці, каб гэтыя тры «тэмы» не супярэчылі адна адной. І на дарозе са шпіталю нечакана для сябе падышоў да крыжа. Пастаяў перад ім... І раптам тут, каля гэтага крыжа, мяне затрымліваюць: забыўся, што там – памежная паласа, мяжа з Польшчай. Я мала памятаю, як адказваў на пытаньні кшталту: «Хто такі?» ды «Адкуль?». Тады ў мяне раптам зьявілася іншае, нязвыклае, сымбалічнае бачаньне таго памежжа. Нарадзілася думка: я павінен у імя Хрыста змагацца супраць усіх перашкодаў, спакусаў – усіх сілаў, што перашкаджаюць на шляху да вечнага ідэалу.

– Вернікаў жа моцна перасьледавалі за савецкім часам...

– Так! Калі я паступіў на працу ў Таварыства сьляпых (працаваў там з 59-га па 97-мы год і быў звольнены супраць маёй волі; маю 16-гадовага сына, мушу яшчэ працаваць, хоць мне ўжо 67 гадоў), дык увесь час тут вёў барацьбу сапраць атэізму. Гэтую барацьбу я пачаў у лягеры. Я змагаўся супраць камуністычных поглядаў людзей, за што меў нямала ворагаў сярод зьняволеных. Усялякія былі й вязьні! Некаторыя думалі, што вось так пабудзем, а потым партыя нам «прабачыць». Як Яўгенія Гінзбург: яе камуністы мучылі-катавалі, а яна ўсё роўна камуністкай заставалася...

На прадпрыемстве барацьба з атэізмам цягнулася трыццаць з лішкам гадоў. Я адмыслова імкнуўся сустрэцца з атэістамі-лектарамі, якіх так шмат было, каб задаваць ім пытаньні. Рабіў гэта, каб прапаведаваць праўду Божую. Яны ня ўмелі адказваць на асноўныя пытаньні хрысьціянства, тады я адказваў сам, і некаторыя мне пагражалі. «Сядзеў адзін раз – яшчэ пасядзіш! Каб цябе не было на нашых лекцыях! А то будзем скардзіцца ў гаркам». А шмат хто з рабочых былі духоўнымі рабамі ў камуністаў. Цягнуліся за імі, гналі мяне. Я, дзе мог, прапаведваў хрысьціянства. Чытаў свае пабожныя вершы. Мяне спрабавалі яшчэ раз арыштаваць за гэта. Прыходзіў сьледчы ў наш цэх, зьбіраў супраць мяне зьвесткі. А якія зьвесткі, што было ў маіх словах крымінальнага? Я выступаў супраць крадзяжоў, а начальства ды ягоныя падручныя кралі, як толькі маглі. Выступаў супраць п'янства, а п'янства было амаль павальнае навокал! Я змагаўся так, як мог і на што меў сілы. Мне ня трэ было асабістай карысьці. Мне трэ было толькі прапаведваць каштоўнасьці, пра якія гаворыць Хрыстос.

Я вельмі рады, што вы, маладыя, маеце прагу да волі. Каб я меў гэткіх аднадумцаў тады, у свае 20 гадоў, гэта б стала для мяне крыніцаю натхненьня. І на волі, і ў адзіночцы ў Берасьці. Мне вельмі прыемна чуць, калі маладыя людзі гавораць па-беларуску. Гэтая мова мяне ўваскрашае. У мяне адна маці – тая, што мяне нарадзіла; у беларуса адна родная мова – беларуская.

Тацяна Сьнітко

Матэрыял падрыхтаваны ў рамках праекту Архіву Найноўшай Гісторыі

Працяг са старонкі 1

Даруй нам, Гісторыя

Тры пытаньні і тры адказы

Гісторык, аўтар кніжак пра беларускую мінуўшчыну для дзяцей і дарослых
Генадзь Сагановіч:

Э.Андрыёлі. Хрост літвінаў

Гэтым падступныя каталікі-палякі нібыта імкнуліся падкупіць літоўскіх паганцаў. Як бы там ні было, а велічныя сцэны гістарычнага хрышчэньня сталі падставовымі ў нацыянальнай сьведамасьці і расейцаў і літоўцаў. Беларусы ў гэтай справе прыпазьніліся. Дакладней, не прыпазьніліся, а не прыдумалі свайго хрышчэньня як галоўнага факту нацыянальнае мінуўшчыны. Урэшце, масавыя гісторычныя веды — гэта і ёсьць пэўныя знакавыя формулы на падставе дакумэнтальных зьвестак. А такіх зьвестак ніколі не бракавала і не бракуе.

Калі я параўноўваў беларускі і літоўскі школьныя падручнікі, у мяне былі два адчуваньні: першае — што яны бессаромна хлусяць, зрабіўшы з гісторыі трэнажор нацыянальнага ўзгадаваньня, другое — што мы ўвесь час сарамліва азіраемся па баках, баючыся каго-небудзь пакрыўдзіць, а ў выніку пагразаем у хітраспляценьнях аб'ектывізму. Для літоўцаў у гісторыі не існуе нас. Для нас адваёўваньне ў сваёй гісторыі іх стала сапраўдным падзьвіжніцтвам яшчэ з часоў савецкай цэнзуры.

Але зьвярнуся да фактаў. Усяго адзін эпізод. Сын Міндаўга Яўнут, — кажа беларускі падручнік, — заступіў на вялікакняскі пасад пасьля бацькі, і сядзеў, пакуль ня быў скінуты братамі, уцёк у Масковію, прыняў праваслаўе і быў названы Іванам, вярнуўся дадому і атрымаў ва ўладаньне Заслаўе. Паводле літоўскага падручніка, Яўнуціс уцёк у Польшчу, а па вяртаньні атрымаў Трокі.

Літоўцы палічылі выгадным для сябе выкрэсьліць беларусаў з уласнай гісторыі і зрабілі гэта. Вы скажаце, а як жа старабеларуская мова, якая ў Вялікім Княстве Літоўскім была афіцыйнай? Яны адкажуць, што афіцыйнай была не беларуская, а канцылярская мова. Гэта значыць, мова, у якой не было жывога носьбіта. А калі б і быў, дык называўся б мусіць народам канцыляраў ці канцылярцаў. Яшчэ адно наша гістарычнае імя...

Хто мог бы сёньня ў Беларусі праводзіць нацыянальную гістарычную ідэалёгію ў школе і для публікі. Энтузіязм колішніх талакоўцаў згас разам з абвешчаньнем сувэрэнітэту краіны, што большасьць з іх успрыняла як зьдзяйсьненьне ідэалаў маладосьці. Наступнае ў сярэдзіне 90-х заявіла пра сябе пакаленьне студэнтаў-гуманітарыяў, сярод якіх найбольш яркіх асобаў вылучылася на гістарычным факультэце ВДУ. Колькі здаровага аптымізму было ў іх. Гэта яны прыходзілі ў нацыянальныя арганізацыі і прэсу — беларускамоўныя і адукаваныя, гатовыя да адраджэнскае працы. А колькі гаварылася пра першыя рэпрэсіі супраць іх, пра зьмену кіраўніцтва факультэту. І вось усё скончылася.

Пасьля разбурэньня гэтага атраду адраджэнцаў ніякага поступу ў нацыянальнай гістарычнай адукацыі не прадбачыцца. Хутчэй наадварот. Дырэктывы Замяталіна адну за адной рэжуць школьныя кніжкі з патрабаваньнем «единого взгляда на историю страны в соответствии с требованием президента РБ». Ніякай творчай свабоды. Перагляд беларускай гісторыі на манер Лукашэнкі і Замяталіна адбываецца строга ў адпаведнасьці з палітыкай, добра вядомай з сярэдзіны мінулага

Пра хрышчэньне Беларусі

Ніякіх сьведчаньняў пра хрост на землях Беларусі, такі як у Кіеве ці Ноўгарадзе, у нас проста няма. У падручніках, у папулярнай літаратуры гаворыцца, што адразу пасьля Кіева хрысьціянства было ўведзена і ў старажытнабеларускіх княствах. Але гэта нічым не пацьвярджаецца.

На хрысьціянізацыю Полацкай зямлі паўплывала яе адасобленасьць, барацьба за самастойнасьць. Як вядома, мясцовыя князі працівіліся ўвядзеньню новай, унівэрсальнай рэлігіі, што мацавала цэнтральную ўладу імпэрыі. Айчынны гісторык Георгі Філіст ужо даказваў, што хрысьціянства ў Полацку не было ні пры Ізяславе, ні пры Брачыславе. Сапраўды, Ізяслаў на момант кіеўскага хросту ўжо сядзеў у Полацку ды так і не прыняў хрышчэньня. Няхрышчаным заставаўся і тураўскі князь Сьвятаполк. Брачыслаў Ізяславіч сцьвердзіў незалежнасьць Полацка, распачаў барацьбу з Кіевам, узяў Ноўгарад! А праціўленьне палітыцы Кіева азначала і непрыняцьце ягонай веры.

Сытуацыя стала мяняцца толькі пры Ўсяславе, які ў 1062-1066 г. будуе полацкую Сафію – фактычна адзіны ў нас мураваны храм да канца XI ст. Падобна, толькі пасьля вяртаньня Ўсяслававых сыноў з бізантыйскае высылкі хрысьціянства тут стала распаўсюджвацца шырэй. Тады ў Полацкай зямлі вырас дзясятак мураваных храмаў. Пад 1105 летапісцы згадваюць ужо і рэальнага япіскапа Полацкай япархіі. Так што ў Беларусь, прынамсі Паўночную і Цэнтральную, Хрыстовая вера прыпазьнілася прыкладна на стагодзьдзе.

Пра Яўнута, сына Міндаўга

Яўнут быў зьвергнуты Кейстутам зімою 1344/45 г. Пасьля гэтага ён колькі месяцаў прасядзеў у палоне, а тады ўцёк на Русь. Спачатку затрымаўся ў Смаленску, але там не знайшоў належнай падтрымкі і падаўся ў Маскву. У Маскве Яўнут прыняў праваслаўны хрост. У 1347 г. ён ужо вярнуўся ў айчыну, памірыўся з братамі і атрымаў у валоданьне Заслаўе. Замірэньню і спакою пэўна паспрыяла тое, што вярнуўся ён праваслаўным і цяпер наўрад ці мог прэтэндаваць на вялікакняскі пасад.

Вось вэрсія, якая паўстае з аналізу небагатых зьвестак летапісаў і хронік. Яна даўно прынятая і гісторыкамі, такімі аўтарытэтамі, як Стадніцкі, Любаўскі, Пашкевіч. Нават Віснэр, вялікі летувафіл, піша, што Яўнут шукаў дапамогі ў Маскве. Не разумею, чаму і на якой падставе літоўцы пішуць іншае. У Польшчу Яўнут не ўцякаў бы, бо Кейстут і Альгерд, рыхтуючы пераварот, дачыняліся акурат з Польшчаю, схіляючы яе да антыордэнскага саюзу. І Трокі ён атрымаць ня мог, бо гэта была сталіца ўладаньняў Кейстута.

Пра школьную гістарычную адукацыю

У савецкія часы гісторыі Беларусі як асобнага прадмету ў школах проста не існавала. Яна была неабавязковым дадаткам да галоўнага курсу — гісторыі СССР (фактычна Расеі). Пасьля развалу Саюзу становішча стала хутка мяняцца.

Ужо ў 91-м была апублікаваная новая канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў Беларусі, якая ўпершыню скасавала гісторыю СССР, а гісторыі Беларусі надала статус асобнай дысцыпліны. Канцэпцыя арыентавала выкладаньне гісторыі на адраджэньне гістарычнай памяці і нацыянальнай сьвядомасьці, на выхаваньне патрыётаў Беларусі незалежна ад нацыянальнасьці. Так што прынцыпы пасьпелі закласьці нармальныя. На іх распрацаваная Праграма па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ, якая выйшла ў 95-м і пакуль не адменена. Да праграмы дастасаваныя новыя падручнікі, па якіх таксама яшчэ вучацца. Праўда, ужо некалькі гадоў іх фільтруе ад «крамолы» спэцыяльная ўрадавая камісія, а вэтэраны і камуністы пішуць свае, альтэрнатыўныя падручнікі.

На курс гісторыі Беларусі ў нас адводзіцца 152 гадзіны, а на сусьветную гісторыю – 300. Ці нармальная гэта прапорцыя? Наўрад ці. Ва Ўкраіне, напрыклад, 225 гадзін – на ўкраінскую гісторыю, і 272 – на сусьветную. На жаль, пакуль пануе цяперашні рэжым, сытуацыя з нашай гісторыяй будзе пагаршацца. Прагназуецца, што ў бліжэйшым часе ў сувязі з пераходам на 12-годку будзе скарочана колькасць гадзінаў на гісторыю наагул, і зробяць гэта найперш за кошт гісторыі Беларусі.

Напрадвесьні хросту

Сяргей ХАРЭЎСКІ

У Полацку, там, дзе на высокай гары па-над ракою стаіць сёньня Курган Славы, адзін са шматлікіх савецкіх мэмарыялаў, была некалі сьвятая магіла. Памяць пра яе сьцерлася ня толькі ў людзкой сьведамасьці, але й са старонак нашых старадаўніх кніг. Гэта магіла славутага скандынаўскага місіянэра пачатку X ст. сьвятога Торвальда Вандроўніка, высілкамі якога да веры Хрыстовае была спрычыненая Ісляндыя. Напрыканцы сваіх працаў эвангелічных сьвятар зьдзейсьніў падарожжа ў Сьвятую Зямлю, у Ерусалім. Па вяртаньні адтуль ён гасьцяваў у канстантынопальскага патрыярха й быў у вялікай пашане ў бізантыйскага імпэратара. Затым сьвяты Торвальд адважыўся на падарожжа ў тады дзікі й малавядомы сьвет — у нетры ўсходняй славяншчыны. Ягоны сьветлы шлях скончыўся ў Полацку, дзе ён заснаваў манастыр Яна Хрысьціцеля. Нястомны прапаведнік Торвальд пасьля сьмерці быў пахаваны на гары, над якой засьвяціўся крыж. Апошнія згадкі пра манастыр сустракаюцца ў летапісах XIV ст. і зьнікаюць назаўжды...

Аднак нават сьвяты Торвальд, які хрысьціў нашых продкаў раней за хрост у Кіеве, ня быў першы. Адзін з летапісаў 834 году распавядае пра Ансгарыя, папскага легата ў паўночных народаў, які дабраўся да крывіцкіх земляў і колькі часу вандраваў там. Каталіцкая традыцыя ўказвае таксама на нейкага мансіньёра Бэрнарда, нібыта ірляндзкага манаха, які ў IX ст. прапаведаваў у ваколіцах Навагарадка і ўсталяваў там першы крыж...

Ёсьць і яшчэ, праўда, ускосныя падставы сьцьвярджаць, што і да 988 году ў Беларусі былі хрысьціянскія бажніцы. У нямецкіх калёніях у Полацку і Віцебску. Нямецкая царква дакладна йснавала напрыканцы X ст. ў Смаленску. Але наколькі плённымі былі высілкі місіянэраў, наколькі яны здолелі ахапіць увесь край, — невядома.

У артыкуле «Аб беларусах лаціньніках» Янка Станкевіч у 1922 годзе наводзіць на адну нібы нечаканую думку: «Трэба думаць, што дзякуючы арабскаму культурнаму ўплыву, некаторыя Беларусы прыймалі і іслам». Насамрэч, гандлёвыя кантакты Беларусі з Арабскім Халіфатам, Булгарыяй ды Хазарыяй былі вельмі шчыльнымі напрадвесьні хрысьціянізацыі. Пра што сьведчыць вялікая колькасьць у нашай зямлі скарбаў, манэтаў ды рэчаў з мусульманскага Ўсходу. Пра Сьвятога Торвальда нам нядаўна стала вядома са старажытнае скандынаўскае «Сагі пра хрышчэньне» скальда Бранда. Хто ведае, мо ў якой з арабскіх бібліятэк хто-небудзь знойдзе чароўны аповед і пра духоўны подзьвіг якога мусульманіна, што навярнуў на сваю веру дрыгавічоў або ліцьвінаў?...

Вострая Брама RADIO FREE EUROPE RADIO LIBERTY

беларускі культурны кантэкст XX стагодзьдзя

Супольны праект "Нашай Нівы" і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

Заставайцеся са Свабодай!

УВАСКРАШЭНЬНЕ ВЕШАЛЬНІКА

Уладзімер АРЛОЎ

Гадоў пяць таму ў менскую школу, дзе вучылася мая пляменьніца, зачасьцілі місіянэры з аднаго тутэйшага праваслаўнага брацтва. На сустрэчах з вучнямі адбывалася раздача кніжак пад немудрагелістымі назвамі «Спасение России» або «Молитвы за Россию». Сярод прадукцыі такога кшталту дзеці — напэўна для сямейнага чытаньня — атрымлівалі і нумары «Веснiка Беларускага экзархата».

Адзін з нумароў гэтага даволі прэзэнтабэльнага выданьня пляменьніца прынесла мне. «Дзядзя Ўладзя, а вось тут пішуць няпраўду». Усьлед за пальчыкам дзяўчынкі я пачаў чытаць пра «незабвенного деятеля Белорусского края, графа Михаила Николаевича Муравьева, неутомимого радетеля об укреплении в белорусском народе христианских добродетелей, строителя в белорусских городах и весях православных храмов, ходатая о переносе мощей белорусских святых» і прочая і прочая.

Мне заставалася ўдакладніць, чаму канкрэтна дзяўчынка лічыць, што дарослыя дзядзькі з «Весніка» хлусяць. І тады з вуснаў пяцiклясьніцы, якая яшчэ не праходзіла тэму нацыянальна-вызвольнае барацьбы на ўроках, я пачуў, што насамрэч гэты Мураўёў забараняў беларускую мову, душыў паўстаньне Каліноўскага, аддаваў загады вешаць і расстрэльваць паўстанцаў, за што і атрымаў мянушку вешальнік. Ці трэба казаць, што я застаўся цалкам задаволены і настаўнікамі маёй пляменьніцы, і наогул курсам, узятым беларускай сыстэмай адукацыі.

Пагладзіўшы разумную дзяўчынку па галоўцы, я ўзгадаў французскага гісторыка Жуля Мішле, які назваў сваю навуку ўваскрашэньнем. Я падумаў, што гэтае мэтафарычнае азначэньне, магчыма, як ніякае іншае, сугучнае беларускаму нацыянальнаму кантэксту, і сеў пісаць водгук на публікацыю «Весніка».

Мне здавалася, што я яшчэ пасыпею растлумачыць пляменьніцы і тое, што «Веснік Беларускага экзархата» — гэта часопіс мясцовага аддзяленьня Расейскай праваслаўнай царквы, і тое, каму служыла і служыць гэтая царква разам з аддзяленьнямі. Я толькі зьвярнуў увагу дзяўчынкі на тое, што артыкул у «Весніку» непадпісаны, а значыць, дарослы дзядзька аўтар ведаў, што хлусіць.

Прамінуў год ці два. Краіна атрымала прэзыдэнта і новы ўрад, а Міністэрства адукацыі — новага міністра. У адзін цудоўны дзень я разгарнуў сьвежы нумар не, ня «Весніка Беларускага экзархата», а «Настаўніцкай газеты». Менавіта там, у органе Міністэрства адукацыі краіны, мяне чакаў працяг сюжэту, зьвязанага зь «незабвенным графом».

Пад рубрыкай «У дапамогу настаўніку» газэта пісала пра таго самага начальніка «Северо-Западного края, яго сіяцельства Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва». Настаўнікам і іхным вучням належала ведаць, што «гэта быў энэргічны дзяржаўны дзяяч, які зь веданьнем справы рабіў тое, да чаго быў закліканы. У Вільню ён прыехаў з плянамі дзеяньняў і неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Ён быў першым зь дзяржаўных дзеячоў Расеі, што ўзьняў пытаньне аб пастаноўцы шырокай народнай адукацыі ў краі, прычым на «местном наречии», пад якім ён, безумоўна, разумеў беларускую мову. Я чытаў далей і прыкідваў, дзе будзе абранае месца пад помнік гэтаму выбітнаму чалавеку нашага краю, які любіў, між іншага, паўтараць, што ён ня з тых Мураўёвых, якіх вешаюць, а з тых, якія вешаюць.

Мне захацелася прапанаваць аўтару публікацыі ў «Настаўніцкай газеце» шэраг пытаньняў, самым мяккім зь якіх, напэўна, было б пытаньне пра тое, чаму ж яго сіяцельства Мураўёў так і не адчыніў У Беларусі ніводнай школкі на «местном наречии»?

Але артыкул у «Настаўніцкай газэце», як некалі і ў «Весніку Беларускага экзархата» быў непадпісаны. Праўда, у гэтай ананімнасьці было адно істотнае адрозьненьне: у першым выпадку аўтар апалёгіі ката Беларусі *ўжо* баяўся. У другім, у «Настаўніцкай газеце» — *яшчэ* баяўся.

Сумны БэНэФіс

Зьміцер БАРТОСІК

«Эх, паслаў жа Бог суседа, — наракаў сябра, дзелячыся са мною патаемным. — Ды калі б ня тая Расея, гэта ж якая тут краіна магла б быць. Эўрапейская, адным словам». Я не пагадзіўся. Калі б з Усходу Беларусь межавала не з Расеяй, а, напрыклад, зь якой Лімоніяй, дык беларусы зараз ахвотна размаўлялі б палімонску. Таму што за гонар азвацца беларусам заўжды трэба плаціць. І не заўсёды непаразуменьнем у чарзе па каву. Зрэшты, ня мы першыя пра гэта думаем...

Размова адбывалася на турбазе пад Мілавідамі, месцам самай драматычнай бітвы паўстаньня 1863-га году. Нацыяналісты першага прызыву — колішнія майстроўцы, талакоўцы ды тутэйшаўцы — прыбылі на дзесяцігадовы юбілей Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак. Сабралася больш за сотню чалавек, што прыехалі з розных куткоў краіны хто на чым пасьпеў. Хто на аўтобусе, хто на дабітым опэлі, хто на лімузыне. Цырымонныя абдымкі, прыўкрасны сум у вачах, абавязковыя ў такіх выпадках «а памятаеш?» — усё адпавядала сходцы ветэранаў. Толькі, што не генэралаў, і не пераможцаў.

... Мяне ў тыя далёкія часіны тут не было. Тым цікавей разглядаць фотаздымкі дзесяцігадовай даўніны. Колькі аптымізму і ўпэўненасьці ў тых вачах. З такімі тварамі можна ісьці на любую вайну. Перамога нікуды не падзенецца. Зрэшты, людзі на здымках не сумняваліся ў ёй. Хтосьці бачыў сябе ва ўладных габінэтах, хтосьці — варацілам нацыянальнага шоў-бізнэсу, кагосьці вабіла доля талеравага мільянэра. Але ніхто зь іх ня мог тады прагназаваць дзень сёньняшні. У якім галоўныя ролі дасталіся іншым акторам. І можна наракаць хоць на бяздарнага рэжысэра, хоць на няўдзячную, пасыўную публіку, што не прасякнулася глыбінёю прапанаванай драмы, хоць на ўвішных гастралёраў з суседняга балагану. Цікавейшым бэнэфіс ужо ня будзе.

Замест настальгічных успамінаў пад гарэлку, прысутныя, як у часы палкага юнацтва, памаліўшыся па грэка-каталіцку, заварылі дыскусію наконт далейшай барацьбы. Ды сьмелыя прамовы ня здолелі схаваць пануючай разгубленасьці перад падступным часам. Нехта невясёла пажартаваў: «Лукашэнка, пэўна, у пятлю палез, прачуўшы, што мы зноў разам».

Я зрабіў намаганьне ўявіць наступныя дзесяць гадоў па самым невясёлым сцэнары. Дзявяты год новага тысячагодзьдзя. Лукашэнку пяцьдзясят пяць. Ён па ранейшаму пры ўладзе й кожнаю вясной традыцыйна лётае ў Маскву па інтэграцыю, а апазыцыя прызначае й праводзіць чарговыя выбары. Рэйтынг ППРБ упаў ажно да 36 працэнтаў. Што ўжо мала цікава нават тым, хто зьехаў.

Эканоміка, як заўжды, на мяжы калапсу. Мінімальны заробак, уліччаючы сёньняшнія тэмпы інфляцыі, раўняецца аднаму мільярду зайцоў. Але жыць можна...

Хацеў засмуціць сябе сумнай будучыняй, але не атрымалася. Нават той факт, што мне празь дзесяць гадоў будзе ажно сорак, ня выклікаў канвульсіяў. Лета ж пачалося! Самае сапраўднае, зь небам, сонцам і травою. Карцела боўтнуцца ў ваду й абапіцца лідзкім півам. Што й было зроблена. Загадваць на тэму будучыні зусім расхацелася. Тым больш, адно ў ёй застанецца пэўным — піва будзе па кішэні ўсім, беларускія кабеты па ранейшаму будуць самымі прыгожымі ў сьвеце і нішто, як і сёньня, ня зможа замінаць самавыяўляцца ў слове. Акрамя, вядома, сьмерці. Можа, сапраўды, слова — адзінае, дзеля чаго тут варта жыць? А за што ж яшчэ ішоў няроўны бой пад вёскай Мілавіды 136 гадоў таму?

Дакладная запіска

У архіве рэдакцыі «НН» знайшлася копія дакладной запіскі на навучальны дапаможнік «Гісторыя Беларусі» Н.Шаровай ад 27 студзеня 1999 г. Аўтар запіскі нехта В.Баранаў. Рэзалюцыя У.Замяталіна паказвае на ідэалягічныя прыярытэты Лукашэнкавага рэжыму, якія ня маюць нічога агульнага з нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі і ставяць на мэце ўсебаковую русіфікацыю школьнай навукі. Вось некалькі фрагмэнтаў на мове арыгіналу. Мы падаем іх дзеля таго, каб чытач непасрэдна пазнаёміўся з «працэсамі ў галовах» сёньняшніх кіраўнікоў беларускай навукі. Баранаў піша:

«Над автором довлеет стремление белорусизировать (!) события, явления и факты, подать их вне связи с объективнымі (чытай: у расейскай інтэрпрэтацыі, бо гісторыі «нічыёй» не бывае. — Рэд.) процессами, самодовлеющими (тое самае. — Рэд.) факторами, оказавшими влияние на исторические особенности белорусского этноса и белорусской государственности.

Не обходя стороной упоминание о действительном экономическом и социальном прогрессе в годы советской власти, автор одновременно нейтрализует их историческую значимость идеологическими оценками (мабыць, піша пра мільёны рэпрэсаваных. — Рэд.), близкими к сформированным национал-патриотами взглядом (так у арыгінале. — Рэд.) на историю Беларуси в последнем десятилетии».

Што канкрэтна прыцягнула ўвагу аўтара дакладной запіскі ў навучальным дапаможніку?

«... Общепризнанные термин и понятие «Октябрьская революция» нигде не упоминается, заменена термином «Кастрычніцкія падзеі на Беларусі».

... Формирование БНР сопровождено словами «Росла надежда на помощь Германии в строительстве государственности Беларуси». Это перекликается (?) с надеждами коллаборационистов в годы Великой Отечественной войны.

... Крайне примитивно объяснение всей сложности исторической ситуации в ходе созания БССР сопровождаемое выводом: «Таким образом суверенитет БССР приносился большевиками в жертву идее всемирной революции».

... Создается противоречивое восприятие истории Беларуси в 20-е-30-е годы. Попытка показа реального повышения культурного, образовательного уровня масс, нейтрализуется акцентированием внимания учащихся, на том что «в эти годы утвердился тоталитарный политический ружим. Все успехи обернулись для белорусов ограничениями в развитии национальной культуры и насаждении марксистской идеологии».

Десятки театров, тысячи школ, полная ликвидация безграмотности, явились как бы сами собой.

Послевоенное восстановление Беларуси в короткие сроки, создание индустриальной по сути республики, ни одним штрихом не показывает участие в этой гигантской работе народов всей страны, і, прежде всего, русского».

Цікава ўявіць, што было б, калі б спадары Баранаў і Замяталін былі, да прыкладу, украінцамі. Цалкам верагодна, што мы на кожным кроку дзякавалі б «прежде всего» ўкраінскаму народу. А калі б — палякамі? Тады — «прежде всего» — польскаму...

«... Штриховой показ огромных усилий всей страны в создании промышленного и научного потенциала Беларуси, затушевывается постоянным политизированным выводом о жизни в условиях «сталинской тоталитарной системы».

... В показе современного развития культуры республики основные ссылки сделаны на издания «Спадчына», «Беларускі гістарычны часопіс», «Беларуская мінуўшчына» и другие подобные им издания и авторов сориентированных на национально-ограниченный показ и толкование истории Беларуси»

... Калі б яны былі палякамі або літоўцамі, дык «национально-ограниченный» паказ успрымаўся як патрабаваньне падладзіць гісторыю Беларусі пад схемы польскай або літоўскай гісторыі. У нашым жа выпадку патрабуюць падладзіцца пад схемы гісторыі расейскай.

Як бачым, адзінае, што ня выклікала б пярэчаньняў у Баранава — гэта апалягетыка Расеі і русіфікатарскай палітыкі, Сталіна і часоў ягонага кіраваньня, а таксама КПСС. Зь іншага боку, пра беларусаў нялішне было б нагадаць, што гэта адсталы народ з каўтуном і ў лапцях, бязграматны і бедны, які толькі ў 1917 годзе і толькі дзякуючы Расеі, Сталіну і КПСС... і гэтак далей. Трэба думаць, што менавіта такія падручнікі неўзабаве зьявяцца ў нашых школах. Што і пацьвярджаецца рэзалюцыяй У.Замяталіна (на мове арыгіналу):

«Войтовичу, Стражеву, Подгайному, Козулину

Фальсификация как тенденция прежде всего в истории, все еще навязывается і существует в науке и образовании. Причины вероятно в следующем:

1. Беспринципность (хроническая) ответственных должностных лиц.

2. Саглашательский подход к содержанию и принципам толкования и преподавания истории.

3. Отсутствие единого государственного взгляда на историю страны в соответствии с требованием Президента РБ и осуществляемой государственной политики.

4. Неразборчивость в кадровых назначениях.

5. Не решен вопрос по лицензированию издания учебников и учебных пособий».

Да гэтага можна дадаць і яшчэ адну, не «национально-ограниченную» прычыну. Гэта бязграматнасьць «гісторыкаў» Баранава і Замяталіна, якія, пастаўленыя кіраваць навукай і беручыся праводзіць татальную русіфікацыю, так і не навучыліся пісаць па-расейску без памылак.

С.П.

РАНАК, АДЗІН НА ЎСІХ

Севярын КВЯТКОЎСКІ

Ранкам 31 траўня ў цэнтры сталіцы я пачуў фразу з гутаркі двух юнакоў: «Такое магло здарыцца толькі ў Менску». Пра сябе дадаў — і толькі цяпер...

У натоўпе, што напярэдадні мкнуў ад маланак да станцыі мэтро «Няміга», не было маіх аднакурсьнікаў, тых, хто паступіў на гістарычны факультэт БДУ ў 1991 годзе. Можа таму, што яны лічаць сябе засталымі, каб наведваць «падлеткавыя» імпрэзы. А можа, гэта тое адчуваньне «элітнасьці», што панавала над намі зь першых дзён навучаньня, не дазваляе браць удзел у сёньняшніх масавых забавах, падагнаных пад бэпээсэмаўскія ўзоры...

Тады, у 91-м мы сапраўды адчулі сябе элітай. Ці не палова аднакурсьнікаў гаварылі міжсобку па-беларуску. А пазьней менавіта з ініцыятывы студэнтаў-гісторыкаў пачаўся адлік менскага вулічнага супраціву. 24 траўня 1995 году трыццаць-сорак юнакоў абышлі з закінутымі за галаву рукамі рэзыдэнцыю Лукашэнкі — былое ЦК, а затым спалілі каля грамадзкай прыбіральні сьцяг БССР. І гэта была падзея на фоне павольнага, але няўмольнага спаўзаньня да расейскае мовы ў прыватных дачыненьнях.

Сьпіс няспраўджаных праектаў можна працягваць доўга... Зрэшты, я рэдка бачуся з былымі аднакурсьнікамі. Хіба пару разоў сустрэў іх на мітынгах. Праўда, ня тых, з кім дзяліў ідэалы юнацтва, а тых, што пайшлі вучыцца ў КГБ.

Мне зараз цяжка прыгадаць якую-кольвек звышідэю, якая б панавала сярод студэнтаў-гісторыкаў на пачатку 90-х. Было абсалютна ясна, што створыцца паўнавартасная беларуская дзяржава, і што «эліта» зойме ў ёй адпаведнае месца, якое гарантаванае валоданьнем мовай і веданьнем акалічнасьцяў паўставаньня Вялікага Княства Літоўскага, недасяжных для большасьці суграмадзянаў. Гэтага адчуваньня я не знаходжу і ў сёньняшніх падлеткаўюнакоў. Тых, што душылі адзін аднаго ў пераходзе на «Нямізе».

Я паспрабаваў уявіць, што здарылася б, калі б падобнага кшталту «сьвята» ў тых жа маштабах расьцягнулі ў часе па прыкладзе славутага бразыльскага карнавалу. І зараз адчуў, што наш прэзыдэнцкі карнавал, які колькі гадоў таму падкупіў сваёй прастатой і дасягальнасьцю і сьвядомых, і несьвядомых, не перапыняўся ні на дзень. Мае «элітныя» аднакурсьнікі-гісторыкі распусьціліся ў гэтым «сьвяце жыцьця», так і не дачакаўшыся прыходу незалежнай «сьветлай будучыні».

Ранак 31 траўня быў падобны да раптоўнага працьверазеньня ня толькі ва ўскосным, але і ў непасрэдным сэнсе. Мяркую, ня толькі я, акрамя жаху й шоку, паспытаў пачуцьцё сораму. Гэта была квінтэсэнцыя сораму, які набрыньваў апошнія пяць гадоў.

«Такое магло здарыцца толькі ў Менску, і толькі цяпер». Такое здараецца кожны дзень і кожную сэкунду па ўсёй Беларусі. Ёсьць процьма беларусаў, якіх ужо растапталі, альбо топчуць зараз. Ёсьць беларусы, якія спрабуюць выратавацца. Яшчэ меншая колькасьць беларусаў спрабуе выратаваць іншых, але большасьць з рогатам нясецца пад зямлю, штурхаючы адзін аднаго.

Кожны выбірае свой шлях, але ранак будзе агульны для ўсіх.

Арцём Арашонак

ПЕСЬНЯ МЕСЯЦА

Ты мой сябра, месяц ясны,
верна сьвеціш уначы.
У акенцы госьцік часты,
братка зорак залаты.

Падмігнеш нясьмела хмарай,
глянеш весела ў ваду,
разьдзяліўшы са мной мары,
твар схаваеш за вярбу.

Мікола Адам

***

Шэры дзень займаецца над горадам.
Напрасткі ідзеш, ня бачыш лужынаў,
Адзінота цябе робіць мужнаю.
Кроплі скуру апякаюць холадам.
Выраз твару робіш абыякавым
І спрабуеш падавацца вольнаю,
Бестурботнаю, вясёлаю, свавольнаю.
Што з таго, што ты учора плакала?
Сум навокал кружыць, завіхаецца,
Ахінае плечы белым вэлюмам...
І адно твая самаўпэўненасьць –
Тое, што ніколі не губляецца.

Андрэй Аляксандраў

МОЙ НОВЫ СУСЬВЕТ

мой новы сусьвет
я прыдумаў яго сам
ён вісіць
люстраною кропляй
над пашчай нябыту
гатовы кожнае ймгненьне
сарвацца ўніз
і зьнікнуць назаўсёды
як і ўсе ягоныя папярэднікі
яшчэ адна часьцінка мяне
памрэ
сыдзе незваротна
але я
ня буду плакаць
і ламаць рукі ад болю
й крыўды
я моўчкі зьдзьмухну пыл
з новага аркуша паперы
й разаб'ю аб яго
сябе
каб стварыць
мой новы сусьвет

Ярына Берасьцейская

ПАКІНУЛА МАЦІ...

Вочы якія хаваюць надзею,
Вочы якім не хапае цяпла.
Сумна за вокнамі стогне завея,
Лезе на крыжык ваконны сьвятла.

«Там у лясочку, за шэрай гарою
У травах духмяных згубіўся ручай.
Гэта яго шапаценьне лясное,
Сьпі-засынай.

Гэта пакорліва ў сьпевах дзівосных
Птушкі сьціхаюць, ды стомлены гай,
Белыя зімы, блакітныя вёсны,
Сьпі-засынай.

Зь белага кветню пашыю кашулю,
Ціша палёў і рамонкі ўскрай.
Хочаш, я буду тваёю матуляй?
Сьпі-засынай».

Употай люляла сухую галінку,
Прыцемак згас у маленькіх руках...
Недзе ў куточку сьпявае дзяўчынка,
Стужка расплецена ў валасах.

Мара Вусьцішная

ВЯДЗЬМАРКА

Я зьяўлюся перад табою
аднойчы.
Ад тугі нечаканай, ад жаху
заплюшчыш ты вочы,
Замармычаш ціхенька пад нос:
«Не хачу! Не хачу!»
Ды ня зможаш стрымацца, пагледзіш:
Я крочу ў ноч.
Я – вядзьмарка, ты ведаў? Ты ведаеш,
усе мы такія!
І да возграў хлапечых, да енкаў
сьляпыя й глухія.
А ў кватэрах бэтонных хаваем мы
зёлкі сухія,
Каб аднойчы сустрэцца, спыніць,
загадаць:
«Стой на месцы! Ня кроч!»

Абамлееш ты, быццам бы
лотава жонка,
І захочаш ў каханьне звалiцца,
як конь у палонку,
Ды ўжо позна! Ужо перагарнулі
старонку,
Дзе сама напісала: «Каханы!»
... Я крочу ў ноч...

Канстанты Ільдэфонс Галчынскі

«КРОНІКА АЛЬШТЫНСКАЯ»

І вечнае лета ў маім каралеўстве сьвеціць!

У. Шэксьпір.

14.

Калі сонца праходзіць заходнюю браму
Сваім шляхам бясконцым,
Праз ваду бачу цела тваё – залатую
скульптуру.
Як дзяўчына Гамэра, прыгожая ты
хараством
Незямным, несьмяротным.

Крок, лягчэй за зьмярканьне,
Калі к берагу йдзеш, дрыжучы, як
струна-чараціна.
Месяц помніць: была там такая
дзяўчына.
Сярод статуй у Гданьскім фантане
Нэптуна!

15.

Сабакі над возерам брэшуць,
Можа быць, выдру зловяць.
Вершы пішу на пяску,
Пяро макаючы ў месяц.

16.

Разгаласіўся дождж.
Траўка дожджыку рада.

Шчасьлівы, шчасьлівы дождж!
Можа падаць і падаць!

Яблыкі, як немаўляты,
Дзівяцца дожджыка цуду.
Кнігу мне дай, калі ласка!
А смольну лучыну – каміну.

17.

Гром дзесь далёка грукнуў
З боку таго, ад Карвіцы.
Дождж, як жаўнераў крокі,
Што йдуць па зялёнай вуліцы.
Маўчыць, не шапоча лісьце.
Не чутна птушыных сьпеваў.
З дубоў жалуды ўжо зьбіты
Вясёлым цэпам залевы.

18.

Кроплі сплываюць з вульляў,
З яблынь вада сьцякае.
Гэй! Дождж па палёх гуляе!
Гойсае, смутку ня знае!

Блізка пярун ударыў
Вымаклі лесу бароды.
Не журыся, прыяцель!
Заўтра будзе пагодна!

19.

Паплывем мы заўтра далёка.
Яшчэ далей, чым тыя аблокі.
Берагам паклонімся. Новым,
Новым дрэвам над новай затокай.

Рыбу новую знойдзем ў азёрах.
Зоры новыя ў небе спаймаем.
Будзем плысьці далёка, далёка!
Як найдалей за небакраем.

Імя новае бору наклікаем
Новых птушак знойдзем і воды.
І пачуем, як б'ецца вялікае
Зялёнае сэрца прыроды!

20.

Быў бы я ткачом, на імяніны
Выткаў бы табе тады тканіну.
Пасярод бы возера ляжала
Безьліч мудрых зорак над вадою,
Ля вады – паніклая альшына.

На альшыне той каб спалі птушкі,
Шчупакі зубастыя ў затоцы,
Месяц, ноч. Шумлівыя чароты.

21.

Сонца над возерам нізка.
Вечар сьвяжэе раньні.
Распалім вясёлы агніска,
Вясёлыя песьні зайграем.

Полымя наша ня згасьне.
Шлях да зор адшукае
І над зорамі ўспыхне.

Першая песьня – сяброўства.
Пра абавязак – другая.
Трэцяя – аб Айчыне.

Лесьнічоўка Пранэ, 1950 г.

Пераклаў з польскай В. Болбас.

1992 – 11.02.1999 г.

Ян Данута

***

дзесьці ў вёсачцы
квітнеюць знаёмыя ліпы
гудзяць пчолы
толькі тут у горадзе чую
званок нечаканы ў дзьверы

Дзед Карней

ПАД С.АДАМОВІЧА

Сярод ночы, бяздомны сабака,
Я натужна выцягваю шыю.
Узьняўшы морду між сьмецьцевых бакаў
Я на поўню самотна выю.

Хай жывеш ты далёка-далёка,
Я завыю з напругай такой,
Што мой кліч паляціць на аблоках
І ўварвецца ў твой ціхі пакой.

А пачуўшы яго сярод ночы,
Ты, каханая, мусіш прачнуцца,
І зялёныя, любыя вочы
Ні на міг да раньня не самкнуцца.

Што, каханая, пазнала голас?!
Што, уціскаесься са страху ў ложак?!
Хай жа дыба стане кожны волас,
Хай на сэрцы зашкрабуцца коткі!

Стась Карпаў

ЗАЎЖДЫ

Як заўжды, надыходзіць лета.
Як заўжды, вясна памірае.
Адыходзячы, плача сьвет мой,
Адыходзячы, забівае.

Я ня слухаю гэтых словаў,
Прыйдзе час, і я выйду ў восень.
Ім на выгляд ужо нармалёва,
А ў душы ўсё чамусьці восем.

Я ня буду глядзець на лісьце –
Яго зелень яшчэ не кранулі...
Хоць бы хто мне душу пачысьціў,
Дык анучаю пыл змахнулі...

Абвастрылася алергія
На сьпеў птушак і зьзяньне сонца.
Рэжуць слых мне сьпевы сухія
І вільготныя надта бясконца.

Новы колер зьмяшае вецер
Са старым і накрые неба.
Калі ёсьць штось адметнае ў леце –
Гэта права на прагу сьнега.

Марыля Лагодзіч

***

Мой горад з маленькіх домікаў,
з разьюшанаю лістотаю,
прымае мяне розную:
з табою і з адзінотаю.

Мой горад а шостай раніцы
мяне сустракае поўняю,
і ліхтарамі на сьцежках,
і бяссоннымі вокнамі.

Мой горад з разьбітымі марамі
мяне суцяшае думкаю,
што шчасьце – рэч авангардная,
з пачуцьцямі вельмі спрэчнымі.

Мой горад дажджом закрэсьлівае
тваё паліто доўгае.
Мой горад – папера зь вершамі
безназоўнымі.

Янка Лайкоў

ПАЧАТАК

Калі ўсё ў небыцьцё сышло,
Засталіся яны толькі ўдвух:
Той, хто меў ля сябе сьвятло
І Яго несьмяротны Дух.

Той, хто меў ля сябе сьвятло,
Ведаў тое, што Дух адзін
Мае ўладу спакон над тлом,
А пасьля нарадзіўся Сын.

Вера Ліпская

СЭРЦА МАРЫЛІ

(каханай Адама Міцкевіча)

Люляла ў пяшчотных далонях каханьне,
Бы човен, вазёрная хваля.
Была Сьвіцязянкай з старога паданьня,
А сэрца сьпявала, сьпявала...

Гаркоту расстаньня піла на сьвітанку,
І сьведкаў таму было мала:
Шэсьць ліп векавых ды старая альтанка.
А сэрца палала, палала...

Згубіла нядоля пяшчотную кветку,
Зь нялюбым чужынцам зьвянчала,
Бо беднае надта каханьне паэта.
А сэрца крычала, крычала...

Зламанае крыльле лістоў недасланых
У полымі лёсу згарэла –
Ахвяра за ўсіх незабытых каханых...
А сэрца балела, балела...

Нязбытных надзеяў ды страчаных мараў
Дадолу лісьцё аблятала...
Плыў стогн жураўліны над шэрым абшарам,
А сэрца кахала, кахала...

Алег Нікулін

ГАМЛЕТ У БЕЛАРУСІ

Герой Шэксьпіра трапіў у краіну,
Якой раней ня ведаў, бо шукаў
Сваю сярэднявечную айчыну...
– Ты – Данія? – зьявіўшыся, спытаў.
Але краіна моўчкі адказала,
Што з прынцамі ня можа гаварыць,
Маўляў, таму, што зноў чужою стала.
І ён падумаў: «Быць ёй ці ня быць?»

Гуры Новы

МАЛЕНЬКІМ

Каб я быў моцны,
Як Тытанік,
Кавадлам кулака
Сталёвым
Крышыў бы сьцены
На шляху,

Але малое цела
Мусіць
Напружваць сховішча
Інстынктаў,
Ды разваг,
Каб здолець сьцены
Адмыкаць,
Каб ты
Ня бачыла,
Як я баюся.

Ірына Поўх

***

Дождж
таропка друкуе
чарговы
свой верш
пра каханьне
і палюе на словы
ўсю ноч.
Як быццам
баіцца,
што некуды зьнікнуць,
зрабіўшыся кроплямі,
літары, сказы.
Імгненна. Адразу.

Сьвятлана Пчолкіна

***

Пагавары са мною трошкі
І распытай, як я жыву.
Я да цябе, каханы, любы,
І ўдзень, і ўночы прыбягу.

Як знойдзеш вольную часінку,
То зазірні ў мой райскі сад.
Табе я яблык падарую,
Яго ты паспрабуй на смак.

Хай вусны слодыч напаўняе,
Каханьня зьведай церпкі пах,
Сагрэты ён маёй пяшчотай,
Не адмаўляйся ж, мілы птах!

Браніслаў Пяткевіч

АПЫТАНЬНЕ

Запыталі ў слупа,
А ці ведае, хто ён?
«Ахрысьцілі без папа,
Бацька з маткай зьбеглі вон».
А сустрэчны злы бычок
Без палітыкі жыве.
«Мне прыемны мой маўчок,
Ён дае расьці траве».
Певень выдаў голас свой,
Сам сабе ўпёк дакор:
«Непрыемнасьць галаве –
Ногі вырасьлі бяз шпор».
А пацешны зубаскал,
Што сьпяшаўся ў нікуды:
«Я ўключаю той канал,
Дзе няма нуды-бяды».
Не чапалі мы асла,
У яго татальны лад,
Морда брудам зарасла,
І, як клін, схуднелы зад.
Мімаходам нейкі псых
Усур'ёз, а можа, не:
«Голад скосіць нас усіх,
А багатых не кране».

Ш.Урузманава

***

Пажаўцелыя старонкі
юнацкіх вершаў
пахнуць валяр'янкай.

***

Усё сталася так далёка,
калі пачаўся дождж.

***

Зробіцца ўсё дакладным,
Рухі завіснуць паволі,
Згубяць абрысы рэчы,
Кветкі зломяць галовы.

Маё табою зьдзіўленьне
і ціхае ўратаваньне
У мокрым цяжкім паветры
На пятым паверсе акацый.

***

Нашыя вуліцы недзе далей сустракаюцца,
Там, дзе сьвятло, і ніколі ня будзе нас.

Аліса Чаротка

ЗАЦІХАЮЦЬ ПЕСЬНІ МАЕ

Заціхаюць песьні мае... На вяршыню
Выйшла я пакланіцца вясьне,
Аднак у цёмных лясістых далінах
Заціхаюць песьні мае...

Заціхаюць песьні мае... Праз граніты
Голас мой да Цябе не памкне,
І ў сырых і панурых нізінах
Заціхаюць песьні мае...

Заціхаюць песьні мае...Усё чакаю
На Цябе ў той халоднай імгле,
А ў павевах квяцістага маю
Заціхаюць песьні мае...

Заціхаюць песьні мае... Глыбаў цьвёрдых
Кліч збалелай душы не кране,
Ад таго ў туманох маркотных
Заціхаюць песьні мае.

Літаратурны сэмінар «Варштаты»

Л.Лосіку. Мы выконваем Вашую просьбу і тэксту «Крумкачы» не друкуем зусім.

А.Нікуліну. Па-першае, ёсьць словы, зь якімі трэба абыходзіцца вельмі асьцярожна, як з радзімкамі на целе. Па-другое, істотна тое, **што** пра Беларусь думаем і пішам мы, беларусы. Па-трэцяе, у Вас ёсьць добрыя, **надзейныя** радкі. Пішыце.

Лене па шчасьці. Лена, звычайна паэты сур'ёзна ставяцца да выбару псэўданіму. Напрыклад, злучаюць імя бабулі зь дзявочым прозьвішчам мамы. Па-беларуску кажуць: з павагаю да вас, складаю (выказваю) падзяку вам, дзякуй вам. Паспрабуйце выказаць вершам тое, чым Вы жывяцё сёньня. Посьпехаў!

Галіне Казак зь в. Булынкі Менскай вобл. Вельмі чакаем абяцаных вершаў.

Знаходка

Днямі мой знаёмы знайшоў незапоўненае пэнсійнае пасьведчаньне супрацоўніка КГБ СССР з гербам «Пагоня» на вокладцы, запоўніў, і цяпер у яго няма праблемаў з грамадзкім транспартам. Праўда, здараецца, што ў мэтро спыняць іншы раз ды спытаюць, чаму без фатаграфіі дакумэнт.

— Нельга, рэжым сакрэтнасьці, — адкажа былы дырэктар сельскай школы-дзевяцігодкі, якая сёлета зрабіла свой апошні выпуск.

Самотны голас эміграцыі

«Вось і прайшла ўжо мая першая, але, відаць, не апошняя, на вялікі жаль, амэрыканская вясна, — піша зь НьюЁрку беларускі чалавек. — За дзевяць месяцаў работы здолеў адкласьці толькі 1500 даляраў. На гэтыя грошы кватэры ў Менску ня купіш, так што сядзець мне тут яшчэ гады два-тры. Магчыма, удасца атрымаць палітпрытулак ці грын-карту. Віза мая ўжо два месяцы, як скончылася. Фактычна я знаходжуся тут нелегальна, таму мне ў хуткім часе альбо слуханьне справы прызначаць, альбо дэпартуюць.

У суботу, калі ў мяне выхадны, ежджу цягніком у царкву Кірылы Тураўскага, дзе жывуць пяцёра нашых хлапцоў. Гэтыя стараюцца вучыцца і працаваць, а іншыя, што па Бруклінскіх прытонах шыюцца, зарабляюць даляры і прапіваюць. Нахрэна было тады перціся ў Амэрыку?

Мы так спадзяваліся на выбары! Але ў нас усё праз сраку робіцца. І Зянон той боўтаецца, як... А нават прайграючы, трэба заставацца мужыком. Шкада і яго, і ўсіх, і сябе, нарэшце.

Дзе гэта набрацца сіл мне? Начамі па пяць-сем разоў прачынаюся, з болем у сэрцы: «Дадому! Дадому!» Як вытрымаць гэтыя гады? А «Новую зямлю» Якуба Коласа як хочацца прачытаць, ды няма пад рукамі...»

Што рабіць пасьля 20-га ліпеня?

Такое пытаньне задаюць сабе людзі ў Менску і на правінцыі. Магчыма, гэтага дня і наступных за ім падзеяў яны чакаюць ня менш, чым прыходу трэцяга тысячагодзьдзя. Адзін знаёмы мастак зьбіраецца прыехаць у Менск, каб арганізаваць у сталіцы сваю ўласную пратэставую акцыю, якая інфармавала б менчукоў пра тое, што час ППРБ скончыўся. Былы ўдзельнік ваеннай кампаніі ў Афганістане разважае ў маштабах менскіх плошчаў і праспэктаў, акцэнтуючы ўвагу грамадзкасьці на жыцьцёва важных камунальных і рэжымных аб'ектах сталіцы. «Нашы палітычныя партыі і незалежныя прафсаюзы, — піша наш аўтар, — павінны накіраваць стыхійныя выступленьні ў цывілізаванае рэчышча, але ня проста на вуліцу, а да будынка ўраду, напрыклад. Рэжыму неабходна будзе высунуць ультыматум з патрабаваньнем адстаўкі прэзыдэнта і ўраду, з наступным аб'яўленьнем свабодных выбараў. У выніку адмовы — аб'яўленьне бестэрміновай забастоўкі, спыненьне буйных прадпрыемстваў у сталіцы і абласных гарадах. Асаблівая ўвага — на выхад у эфір на каналах радыё і тэлебачаньня са зваротам да беларускай арміі, спэцпадразьдзяленьняў міліцыі і дзяржбясьпекі. Але ці змогуць нашыя рабочыя ды іхныя прафсаюзы, партыі і грамадзкія рухі аб'яднацца ў адзіны фронт супраціўленьня? Усё залежыць ад усіх нас».

Праз 20 гадоў

29 траўня ў Будслаўскай сярэдняй школе Мядзельскага раёну адбылася юбілейная сустрэча выпускнікоў 1979 году. Нас, колішніх «акаў» і «бэкаў», набіралася з двух класаў, калі не памыляюся, чалавек з шэсьцьдзесят. На сустрэчу зьявілася, бадай, палавіна. Некаторыя ўжо ніколі ня змогуць прыехаць — зямля ім пухам. Некаторыя з залатымі зубкамі, некаторыя без зубоў, але зь пяцьцю дзеткамі на руках, як мая рыжанькая аднагодка, якая працуе ці то ў Ілаўскім доме інвалідаў, ці то на аднайменным вінзаводзе. Чэсь Ляшковіч і Пеця Хацяновіч даюць сабе рады на месцы, у Будславе. Мажны-мажны Лявон Грубовіч працуе дырэктарам дзевяцігодкі на Пастаўшчыне, гадуе чатырох дзетак. Раскошная Ліля Палачанская прыехала з Масквы, але за сталом так міла гаварыла па-беларуску, што я лішні раз пераканаўся ў нязводнасьці нашага беларускага духу. Міша Палько, некалі завадатар і бітунскі, а цяпер рэспэктабэльны прадпрымальнік, прыехаў на белым аўто з Мядзеля. Прыляцелі на сустрэчу дзьве Ірыны-выдатніцы: Сабачэўская з Віцебску і Апанасэвіч з Менску. Некалі кучаравага Фрэда хацелася пасьля трэцяй расцалаваць у лысіну, з сумным Малафеевым добра пагаварылі...

Вечарам 29-га ў Будслаўскім касьцёле бэрнардынаў ксёндз адслужыў імшу за нашае, трыццацісямігадовых, здароўе. Разьвітваючыся, мы паабяцалі сабе празь пяць гадоў быць ізноў разам.

Да трагедыі ў Менску заставалася некалькі гадзін.

Адплата

У выніку катастрофы на Нямізе людзі заяўляюць рахункі Богу і д'яблу, надвор'ю і недарэчнаму зьбегу абставінаў, алкаголю і юначаму эгаізму, гарадзкім уладам, прэзыдэнту, міліцыі, кіруючаму рэжыму. Знаёмыя загінулых, родныя, проста цікаўныя прыходзяць сёньня на месца трагедыі, клеяць на сьцены пераходу бяздарныя расейскамоўныя вершыкі, пішуць клятвы тыпу «мы всегда с тобой», румзаюць хто больш, хто менш і... ня робяць для сябе ніякіх высноваў. Больш таго, я думаю, многія грамадзяне шчыра ўдзячныя рэжыму за бясплатныя труны і хаўтуры. А за тое, што прэзыдэнт публічна запэўніў, быццам усе загінулыя былі цьвярозымі, родныя ахвяраў выберуць нашага генія цынізму ня толькі на другі, але і на дзясяты прэзыдэнцкі тэрмін. Лёгіка дэградуючага соцыюму пераплятаецца ня праўдай, а маною. Маною настолькі відавочнай і дзікай у сваёй беспардоннасьці, што нават шэф менскай міліцыі Тарлецкі ня мог яе паўтарыць усьлед за ППРБ і мусіў сказаць праўду: ахвяры трагедыі былі ўзбуджаныя ня толькі інстынктам натоўпу, але і алкаголем, якім іх шчыра частавалі на так званым сьвяце піва.

Такім чынам, катастрофа на Нямізе — гэта адплата за татальную прэзыдэнцкуюману, за зьдзекі над маладымі беларускімі патрыётамі, за 0% беларускіх школ у беларускай сталіцы, за вайну з нацыянальнымі сымбалямі, за адкрытую падтрымку ідэяў расейскага шавінізму й фашызму, якія распаўсюджваюцца ў Беларусі. Дарэчы, катастрофа на Нямізе адбылася вечарам 30-га траўня, а 27-га рэдактарам беларускіх СМІ быў разасланы «Адкрыты ліст», у якім менская група расейскіх фашыстаў выказала прэтэнзіі да асобных публікацыяў беларускіх журналістаў і паабяцала падаць у суд (!) «исковое заявление о защите чести и достоинства». Канцэнтрацыя ў адным месцы такой колькасьці маральнага і фізычнага зла ў адпаведнасьці з законам раўнавагі выбухнула іншым злом — адплатным. Эфірныя сілы помсты дазволілі палітычнаму рэжыму ПРРБ прайсьці тэст на ачышчэньне горам, але ўлада ня вытрымала духоўнага выпрабаваньня. Ужо 9 чэрвеня Лукашэнка падпісаў распараджэньне пра падрыхтоўку да фэстывалю-кірмашу «Шклоўскія дажынкі». Якраз пасьля саракавін і разгуляюцца.

Славамір Адамовіч

БЫТАВУХА

Падручнікі посьпеху і Народная воля

Сяргей ШЫДЛОЎСКІ

Кніжная шафа замяняе мне дзёньнік (гэтую мэтоду я падгледзеў у старажытных). Кнігі на ейных паліцах стаяць у тым жа парадку, у якім яны набываліся. Гэтая пасьлядоўнасьць дапамагае аднаўляць у памяці ланцужок ілюзіяў ды бзікаў, што спадарожнічалі кожнай пакупцы. Але часам у мяне ўзьнікае сумнеў – наколькі я быў самастойным у сваім выбары, калі фармаваў уласную бібліятэку. Наколькі яна характарызуе менавіта мяне, а не «калектыўнае падсьвядомае», да прыкладу, аматараў цёмнага піва.

Вось сярэдзіна 90-х. На маёй паліцы яе пазначаюць «падручнікі посьпеху» – даведнікі па разнастайных рэклямных ды маркетынгавых тэхналёгіях. Іншыя выданьні проста губляюцца побач зь іхнымі зыркімі вокладкамі: блякла-сталёвы Стэндаль ды балотны Флябэр выглядаюць беднымі крэўнікамі. Назвы раманаў гэтых знаных французаў гучаць як папярэджаньне аб марнасьці амбіцыяў. Але ў канкурэнцыі з кідкімі слёганамі сучасных выданьняў іх не чуваць. Вось і мае сябры гэтае папярэджаньне зазвычай ігнаруюць, зачараваныя зыркімі вокладкамі на маіх паліцах.

Праўда, за апошнія пяць гадоў характар іхнай увагі эвалюцыянаваў ад эўфарычнага энтузіязму да іранічнай цікавасьці. «Падручнікі посьпеху» ўяўляюць цяпер толькі археалягічны інтарэс – як артэфакт магічнай сьвядомасьці беларускай лібэральнай інтэлігенцыі сярэдзіны 90-х. Апошняя спалучала ў сабе нованабытую веру ў цудатворнасьць заходніх сацыяльных тэхналёгіяў зь непазбытым савецкім сантымэнтам да ўлады, у дачыненьні да якой беларускі лібэрал пачувае сябе гэткім лекарам Айбалітам – мудрым і добрым. І заўжды зьдзіўляецца, калі за свае шляхотныя намеры дастае ад улады па руках. Нават гэткіх спэцыялістаў, «дзелацеляў прэзыдэнтаў», як Ганчар і Фядута, улада ад сябе турнула. А што ў тым, калі разабрацца, дзіўнага? Грубая сіла ды поўны папулізм – вось сапраўдная формула посьпеху. І сучасная беларуская ўлада ёю валодае. Іншыя «ноў-хаў» ёй не патрабуюцца. «Тэхналягічныя» ж мэтады палітычнай барацьбы, вычытаныя лібэральнай апазыцыяй з заходніх кніжак, выявілі сваю цалкавітую нястаннасьць падчас травеньскіх прэзыдэнцкіх выбараў. Лібэральны інструмэнтар не заменіць палітычнай волі. І таго, што будзе 21 ліпеня а першай гадзіне «пасьля Лукашэнкі», ды як легалізоўваць паўнамоцтвы падпольна абранага прэзыдэнта, – у заходніх лібэральных брашурах ня вычытаеш.

Усе гэтыя падручнікі, якія былі беларускімі бэстсэлерамі сярэдзіны 90-х, чакае лёс «рэчаў веку». То бок пустышак, што характарызуюць масавае ачмурэньне нейкай эпохі і якім ня лёсіць перасягнуць мяжу стагодзьдзяў. Калі яны і патрапяць у наступнае тысячагодзьдзе, дык толькі ў выглядзе неліквіднага накладу «самавучыцеляў» кшталту «Як стаць прэзыдэнтам», «Як выйсьці замуж» або «Як стаць геніяльным». Зрэшты, нават самыя благія дапаможнікі з гэтай сэрыі здатныя прадэманстраваць свайму ўладальніку выдатны маркетынгавы ўрок – і нават двойчы. Першым разам – калі вы выдаткоўваеце на гэтую кніжку ўсю сваю стыпэндыю, а ў другі – калі безвынікова спрабуеце запраторыць яе за палову кошту ў якую-кольвечы букіністычную кнігарню. Пасьпяховымі вашыя студыі можна будзе ўважаць толькі тады, калі вы самастойна напішаце ўласны варыянт дапаможніка, каб хоць неяк скампэнсаваць выдаткі за гэную «навуку». Зрэшты, сустракаюцца і прыемныя выняткі. Да прыкладу, некалі я набыў брашурку з назовам «Як стаць шчасьлівым» – і цяпер не шкадую.

Кожны мае ўласную мэтоду дасягненьня посьпеху. Адныя дзеля гэтага чытаюць нечыя інструкцыі. Іншыя ж – самі іх пішуць. Вельмі ўсьцешна, што сярод беларусаў апошніх становіцца ўсё больш. Папраўдзе, з нацыі паэтаў беларусы ператвараюцца ў нацыю экспэртаў. Як вядома, ладная частка расейскамоўных бэстсэлераў робіцца менавіта ў Беларусі. Бэстсэлермэйкерства ператварылася ў самую тэхналягічную галіну айчыннай лесаперапрацоўчай прамысловасьці. Дадамо таксама – і ў самую канкурэнтаздольную. Экспансія ейнай прадукцыі на ўсход саступае ў імпэце хіба толькі збытагрэсіўнаму маркетынгу кітайскага шырспажыву. Але ж у адрозьненьні ад кітайцаў, беларусы гандлююць эксклюзывам.

Толькі вось не зашкодзіла б пісаць на мясцовых «падручніках посьпеху» папярэджаньне, як робяць гэта ангельцы на пэўных леках, – «для выкарыстаньня толькі за межамі Беларусі». Каб далей ад ліха. Бо дужа ўжо вялікі поцяг маюць беларускія лібэралы да квазінавуковасьці. Покуль гэты попыт з посьпехам задавальняюць палітолягі з тоўстых аналітычных пэрыёдыкаў. У іх спрытна атрымоўваецца прадстаўляць палітычных пэрсанажаў сучаснай Беларусі, нібы ў батлейцы, у вобразах гераічнага архетыпу – размаітых Тэрмінатараў, Волатаў ды іншых Пакаці-Гарошкаў. А калі дадаць сюды яшчэ і рэкамэндацыі з іміджавых брашурак «Як стаць прэзыдэнтам», дык атрымаецца поўнае фэнтэзі.

Рыхтых, як было гэта ў сярэдзіне 90-х. Справай стварэньня новага рэспэктабэльнага вобразу былі забаўленыя тады ня толькі асобныя палітыкі, але й цэлыя ідэалёгіі. Ад сацыял-дэмакратаў і да панкаў – усе раптам апаразіліся прыдбаньнем лібэральнага іміджу. Слова «адэкватнасьць» ужывалася ў тагачаснай прэсе гэтак жа часта, як і імя Лукашэнкі. Дзеля гэнай адэкватнасьці часткі незалежных беларускамоўных выданьняў перайшла нават на «дзьвюхмоўе». На якія толькі ахвяры, маўляў, ня пойдзеш дзеля «паблік рылэйшнз». Апошняя сталася для грамадзкіх дзеячоў сярэдзіны 90-х тым жа, чым астралёгія – для былых выкладчыкаў навуковага камунізму.

Трансфармацыі, якія праводзіліся па мэтодах «PR», пры ўсёй сваёй пазытывісцкай рыторыцы былі конча ірацыянальнымі. Бо беларускі выборца досыць уцямна даў зразумець, што на бліжэйшыя пяць гадоў ён хоча бачыць сваім лідэрам не якогась эўрапеізаванага лібэрала, а дэмагога-папуліста.

Хто, як ня клясыкі-адраджэнцы, пачынаючы з Багушэвіча, апэлявалі да народных крыўдаў ды боляў? Вось урэшце народ і азваўся, прыйшоў да выбарчых скрыняў – менавіта такі, якім яго і ўяўлялі клясыкі. Конча скрыўджаны ды з каўтуном у валасах. Што ж інтэлігенцыя? У яе было два варыянты рэагаваньня – або прызнаць сябе целам ад цела народнага, як зрабіў Лукашэнка, як зрабіў бы Багушэвіч. Або кінуць праз плячо – «народ памёр», ды распачаць актыўна «адстройвацца», як кажуць рэклямнікі. То бок, насунуць свае чорныя брылі а la рэтра з ваенторгу ды пакруціцца ў Брусэль касіць пад агентаў супраціву. Апошнім афіцыйная апазыцыя актыўна і занялася.

Посьпех Лукашэнкі тлумачыўся імі ледзь не пабочным прадуктам непаразуменьня. Маўляў, вырвалася ў дырэктара саўгаса ў хвіліну слабасьці нечакана-праўдзівае пра запушчэньне заводаў, а яго не зразумелі ды выбралі ў прэзыдэнты. Самі ж яны зрабілі стаўку на «правільнасьць» – на цалкавітае датрыманьне «тэхналёгіі» палітычнай барацьбы, як трактуюць яе апазыцыйныя экспэрты, што начыталіся заходніх брашурак.

Травеньскія прэзыдэнцкія выбары падвялі пад гэтымі пяцігадовымі экспэрымэнтамі апазыцыі крэс. Лібэральны інструмэнтар цалкам вычарпаў увесь патэнцыял сваёй эфэктыўнасьці. Ніхто з традыцыйнай апазыцыі ня можа ўцямна растлумачыць – што ж будзе ў Беларусі «па Лукашэнку».

А што ж будзе? Адказу ня знойдзеш у падручніках, яго не навучаюць на сэмінарах і трэнінгах.

Недзе ў 1996 годзе Сяргей Паўлоўскі зацеміў, што ў Беларусі няма ані ўласнай палітыкі, ані нацыянальных палітыкаў. Тое ж можна паўтарыць і сёньня. Зьмяніліся хіба толькі «ірацыянальныя чаканьні», як любяць па-навуковаму выслаўляцца «экспэрты апазыцыі». У 1996-м «дэмакратычная грамадзкасьць» трызьніла вулічнай рэвалюцыяй, у 1999-м жа – путчам. Толькі вось ані першаму, ані другому лібэральныя «падручнікі посьпеху» ня вучаць.

ЗЬЯЎЛЕНЬНЕ ГЕРОЯ №3

ARCHE #1(2)-1999, Менск

Нумар часопіса прысьвечаны постмадэрнізму. Бадай, у адрозьненьне ад дэбютнага, які выйшаў летась, і меў за тэму «парнаграфію», гэты атрымаўся канцэптуальна цэласны, «закруглены». Магчыма таму, што панятак постмадэрну можна інтэрпрэтаваць шырока... А магчыма таму, што культурная сытуацыя Беларусі, як і сытуацыя краіны ўвогуле, за апошні час зрабілася больш выразнай.

Як і папярэдні, гэты нумар поўніцца добрымі перакладамі, але, натуральна, найбольш цікавыя ўласна беларускія тэксты. Для спробы вызначыць пэўныя рысы абноўленай Культурнай Сытуацыі зьвернемся да трох (з паловай) тэкстаў сьвежага ARCHE.

На камені ў начной пушчы недалёка дзяржаўнай мяжы сядзіць разгублены чалавек. Юнак – не юнак, мужчына – не мужчына... спадар. Спадар Х, чыя тонкая душэўная арганізацыя курчыцца-мэнчыцца ад прыкрасьці й гідлівасьці. Колькі хвілінаў таму Х канчаткова пераканаўся, што ўсе кабеты, дакладней, «бабы» – «блядзі». Вось такою можа быць адна з расшыфровак канцоўкі аднаго з твораў, які ягоны аўтар Андрэй Дынько назваў «Аповед N3».

Дзеяньне адбываецца ў наш час у невялікай вёсцы, якая разьмясьцілася ў куце паміж украінскай і польскай мяжой. Герой апавяданьня закахаўся ў маладзенькую госьцю з Румыніі і прывёў яе ў памежныя мясьціны, дзе мінулі самыя жарсныя падзеі з жыцьця вёскі за апошняе стагодзьдзе. Расповед героя аб гэтых падзеях, поўных «лёду і полымя», займае ці не галоўную частку тэксту. Сюжэтная лінія выкананая па ўсіх пост-мадэрнісцка-дэтэктыўна-...х правілах. У апісаньні падзеяў – найперш, аб каханьні і здрадзе ў адной палявшуцкай сям'і, – выкарыстоўваюцца выдатна стылізаваныя сучасныя стэрэатыпы аб «польскім часе» і вайне. Зрэшты, сюжэтная лінія магла б быць якой заўгодна (для постмадэрністаў гэта не прынцыповая рэч), але нязьменным засталося б толькі адно. Усе кабеты сям'і з палявшуцкага «міні-Маконда» здраджвалі сваім мужам, а мужчыны аказваліся, так бы мовіць, «нягеглымі», у сэнсе, ня здатнымі (а можа «вышэйшымі»?) на адэкватныя меры. Адзінага пэрсанажа, якога можна назваць «мужыком», аўтар надзяліў такімі нязручнымі для беларускага жыцьця ў 30-х – 40-х гадох азначэньнямі, як жыд-выхрастак і чырвоны партызан. Астатнія мужчыны, якія фігуруюць у тэксьце, гэта, пераважна, жаўнеры ўсіх войскаў, якія ў нашым стагодзьдзі зьяўляліся на Палесьсі, і якія са смакам прамаўляюць словы «блядзь», «kurwa» і «schweine»... (Сам жа аўтар упадабаў слова «баба» і ўжывае так часта, што яно патрапіла ажно на іншую старонку часопіса, туды, дзе часопіс рэпрэзэнтуе ўкраінку Саламію Паўлычко).

Апавяданьне заканчваецца тым, што маладая румынка Лілея ня дорыць спадару свайго «каханьня назаўжды», а прыводзіць замест сябе маці, таксама Лілею. Дзяўчына просіць, каб Х правёў маці, як перад тым яе саму, маршрутам жарсных падзеяў паўвекавое даўніны. Х рушыць у бок беларускапольскай мяжы разам з маці-Лілеяй, што «для жанчыны, якая жыла за Чаўшэскам, някепска захавалася». На нэўтральнай паласе «яна дэманстравала гатоўнасьць на ўсё, на любыя прыхамаці, калі яны раптам выявяцца». А што зрабіў Х? Пакрыўдзіўся, што пасьля раптоўнага выбуху пранікнёнага каханьня малая Лілея (наўмысна, ці не?) падсунула яму сваю паўзьвялую маці. Пакрыўдзіўся, і «падставіў» Лілеюмаці памежнікам. Тады сеў на каменьчык, і пачаў перажываць, што ня меў каля сябе гашышу, каб падсунуць кабеце ў кішэню, каб яна не абышлася адным штрафам...

Герой апавяданьня Дынька – поўная супрацьлегласьць герою аповесьці Ўладзімера Сакалова «Заўсёды сьветла каля турэмных муроў». Гэты твор, напісаны ў 1990-91 гадох, выкананы ў «дэтэктыўна-графічна-філязафічным» жанры, твор па-беларуску друкуецца ўпершыню. Але чытаецца як «сьвяжак»: паводле сюжэту і, так бы мовіць, дыскурсу. Галоўны герой Баляслаў Катавіцкі – гэта і ёсьць той самы «Сьмерць-Мужчына», чый вобраз скрозь ідзе праз творчасьць Глёбуса. Мужчына – істота, якая заваёўвае, якая ня просіць, а БЯРЭ. У той час як жанчына не заваёўвае, а аддаецца – АДОРВАЕ.

Чаму Спадар Х пакрыўдзіўся на жанчын? Таму што ня здольны ўзяць?.. Спадар Х ня можа прымірыцца з тым, што ён ня можа аддацца жанчыне (па вызначэньні фэномэну жанчыны). Ён ня хоча браць, бо бярэ – бяднейшы, адорвае – багацейшы. Але ён ня можа нічога даць жанчынам. Жанчынам не патрэбныя тонкія перажываньні і канструкцыі паэтычнай натуры Спадара Х – гэта раз. Бо жанчыны нясуць у сабе сто разоў больш эмацыйны ірацыянальны сусьвет – два. Але, у той жа час, Спадар Х вышэйшы за мужыкоў-заваёўнікаў, якія «вы зьвяры, панове!» – тры. Хіба не дастаткова, каб пакрыўдзіцца? На «забойцаў», але, найперш – на «баб»...

Мне падаецца, што «Аповед N3» ёсьць найбольш выразным тэкстам, што да праблемы «крыўды і праўды» ў найноўшай беларускай літаратуры (і беларускай сытуацыі ўвогуле?). Я мяркую, што назву «Аповед N4» мог бы мець тэкст Прафэсара Каркарана «Кіно і немцы»:

«... Дастаткова пачуць – жанчына і глыбіня, каб адчуць у гэтым цьмяную недарэчнасьць», «Дзяўчаты прыцягвалі Хацяновіча... як жыцьцёвая недарэчнасьць», «Яму падабалася калекцыянаваць іхныя позіркі... – дурніцы, яны ж ня ведалі, што ён шукае сябе». А наступнымі радкамі з «Кіна і немцаў» можна было б завершыць аповед пра спадара, які пакрыўдзіўся на жанчыну і адпомсьціў ёй за гэта:

«Алесь Хацяновіч нарадзіўся
еў піў сцаў сраў спаў
так і памёр незразумелым»

А магчыма, з хоку атрымаўся б эпіграф да тэксту Вінцэся Ліпскага «Ўэлкам ту зэ брэйв н'ю ўорлд!»... Вінцэсь Ліпскі піша пра «беларускамоўных касмапалітаў», пра «паўпадпольных беларусаў», пра «ды-джэяў адраджэньня», пра людзей з псыхалёгіяй «грантасоса»... Увогуле, пра руціну, у якую некаторыя «адраджэнцы» здолелі ператварыць сваю дзейнасьць дзеля нацыянальнае ідэі. Адныя зь іх «упалі ў маразм», а другія, нібы той Салжаніцын з нататак Глёбуса, чакаюць пакуль «абустроіцца» Бацькаўшчына. Бо ж вакол збольшага быдла – няма з кім працаваць, дзеля каго ахвяраваць. Гэта цэлая плойма «лібэралаў», «сац- і не сац- дэмакратаў», «цэнтрыстых» і ня вельмі, а таксама «непафарбаваных» падшыванцаў...

Я зусім нядаўна, едучы на «Чарнобыльскі Шлях», зразумеў, чаму мітынгі і шэсьці апазыцыі часам пачынаюцца значна пазьней за плянаванае. На праспэкце я ўлез у перапоўненую «двойку», натоўп ззаду падпіхнуў, і калі я ачуняў, дык адчуў, што ўпёрся ў грудзіну аднаму з самых галоўных апазыцыйных лідэраў. Той вісеў на адной руцэ, падпёрты з усіх бакоў «электаратам». То бок, калі б тралейбус трапіў у затор, мітынг пачаўся б са спазьненьнем. Менавіта ад гэтага спадара я нядаўна пачуў, што «беларускі народ не дарос да сваёй інтэлігенцыі, якая нічым ня горшая за эўрапейскую».

Чаму ён мяркуе, што беларускі народ (як і любы іншы народ) ня хоча яму-палітыку «аддацца»? Можа, справа ў тым, што праз сваю «тонкую душэўную арганізацыю» лідэр ня можа/хоча народ «узяць»? Менавіта ў гэтым супрацьпастаўленьні, у гэтай крыўдзе, якая ўласьцівая галоўным сёньняшнім «адраджэнцам», заключаецца праўда найноўшай беларускай адраджэнскай сытуацыі.

Ні даць, ні ўзяць.

«Заўсёды сьветла...» – адкрывае #1(2) ARCHE, «Ўэлком...» – закрывае. Паміж імі купа старонак зь цікавай літаратурай. На адной з старонак, амаль пасяродку, сядзіць Х, і нудзіцца. Я ня думаю, што ён пакутуе праз сваю «недасканаласьць» ці «непадобнасьць» да іншых, і пагатоў – праз «няздатнасьць». Наадварот, хутчэй за ўсё, гэтыя эпітэты мусяць быць скіраваныя да навакольля. Асяродку, які «недасьпеў», які толькі ў гушчарах пушчы дазваляе герою адчуць сябе ўтульна... «Аповед N3» напісаны класнай мовай, у ім, як і належыць постмадэрнісцкаму твору, можна заўважыць уплывы творчасьці іншых пісьменьнікаў... Пасвойму, «Аповед N3» – рэвалюцыйны твор. Упершыню на высокім мастацкім узроўні быў раскрыты адзін з новых – вызначальных? – тыпаў сучаснага беларуса.

А ў астатнім, як кажа мая знаёмая радыёжурналістка – галоўнае, каб слухачам было цікава.

Іван Дапупа

ДАЛЁКА ІСЬЦІ

ARCHE #1(2)-1999, Менск

Каб унікнуць інтэлектуальнае астэніі, чытаньне ARCHE, 1-1999 варта распачаць са «Слоўніка паняцьцяў». Гэта ня кпіны зь нечае некампэтэнтнасьці, хутчэй прапанова спрычыніцца да канстантаў постмадэрнізму, якому прысьвечаны гэты нумар. Удала падабраных урыўкаў з Умбэрта Эка, Саламіі Паўлычко ды Ж.-Ф.Ліётара дастаткова для «інтэрпрэтацыі і выкананьня» постмадэрнова-га твору на ўзроўні недылетанта. А каб назаўжды не застацца ў тэарэтычных post-глыбінях, сумесна з В.Булгакавым можна парэфлексаваць над паняцьцямі іншага кшталту «nihil novi», «кароль кароў», «гнідагадоўля», а можна, настроіўшыся на «ton bolesny» Чэслава Сэнюха, папоўніць свае энцыкляпэдычныя веды яшчэ адным, ня менш важным, дадаткам-разьдзелам да «Новай зямлі» Якуба Коласа. Сапраўдны шэдэўр беларускай літаратуры — надрукаваны ўпершыню па-беларуску раман «Заўсёды сьветла каля турэмных муроў» Ул.-Сакалова. Твор шматплянавы, выразны. Шкада, што сп. Сыс у сваім артыкуле ліміtавала раман пачаткам 90-х зь яго ідэальнай Беларусяй — the imperfect is our paradise.

Такім, якім і мае быць, — вандроўніцтвам па прагале між годам нараджэньня і годам сьмерці, інвэнтарызацыяй vanitas — паўстае постмадэрн у апавяданьнях Чарльза Букоўскага, Данілы Кіша, Х.Л.Борхеса. Трэба заўважыць, што наш нічым ня горшы. Прыемна ўражвае сваім Хацяновічам аматар Вітгенштайна Прафэсар Каркаран, Jan Kakupala — далікатным, але настойлівым этнацэнтрызмам. Ёсьць творы менш удалыя, прыстасаваныя да постмадэрну — расфарбаваныя, зь недагледжаным лінейным кантэкстам.

Андрэй Мельнікаў дэманструе стойкі імунітэт супраць пошласьці ў кроніцы «Выжывае падлейшы», сама назва якой падштурхоўвае да шквалу аргатызмаў і брутальнага натуралізму.

Падаецца сымбалічнай назва рубрыкі «Прабел». З.Піскуру відавочна бракуе тэарэтычных ведаў па мовазнаўстве. Неабдуманае выкарыстаньне тэрмінаў прывяло да радыкальнага скажэньня сэнсу артыкула. У прыватнасьці, няблага было б ведаць, што слэнг і арго — розныя рэчы і што слэнг ніяк ня «здольны адыгрываць ролю шыфраванай, таемнай мовы», таму што выкарыстоўваецца ў адкрытых сацыяльных групах. Пра адзін з самых загадкавых твораў К.Крапівы артыкул С.Петрыкевіча. Чытаеш яго — бы акунаесься ў састарэлы падручнік-крытыку па бел. літ.: тыя самыя стыль, мэтады, мова. Тая самая кампаратывісцкая абмежаванасьць (традыцыйна за прэцэдэнт з расейскай літаратуры справа ня рушыць) — словам, настальгія. Крыху агрэсіўна гучыць «Уэлкам ту зэ брэйв нью ўорлд!» Вінцэся Ліпскага; артыкул — клясычны прыклад, як можна зачапіцца за пары фрустрацыі, у чарговы раз пераблытаўшы «рыбны дзень» з «poisson d'avril». І ўсё ж дэвіз нумару — спакойны інтэлектуалізм. Нават пытаньні палітыкі ня згаджаныя мітынговым імпэратывам («Бездомная нация из европейского дома» Андрэя Екадумава; «После современности» І.І.Антановіча як совеасаблівы працяг «Цивилизации и культуры...», толькі па-за ідэалягічнай барацьбой). А паліглосія хутчэй надае ARCHE чароўную непаўторнасьць і арыгінальнасьць, чымся псуе яго і падштурхоўвае да здрадніцкіх думак. Адно, што за прыстунасьцю мяккіх знакаў не відаць тае тарашкевіцы, сытуацыя якраз пад зьдзіўленьне М.Булгакава: «На які чорт табе патрэбны гальштук, калі на табе няма штаноў?»

Не абышлося бяз жэсту высокай танальнасьці, лірыкі. На гэты раз — вершы Андрэя Хадановіча і Багуміла Грабала, якім папярэднічае «аскомісты» пункцір А.Разанава. Выдалены з «Рэчаіснасьці», у кантэксьце ARCHE ён успрымаецца зусім паіншаму. І таму ня варта пэдантычна падлічваць за выданьнем нейкія агрэхі — яшчэ «далёка ісьці».

Ліда Куратава

Кожнаму сваё імя



Шур В. Беларускія ўласныя імёны: Бел. антрапаніміка і тапаніміка: Дапам. для настаўнікаў. – Менск: Мастацкая літаратура, 1998. – 239 с. ISBN 985-02-0164-9

Гэта ня першая кніга пра беларускія імёны людзей і мясьцін і, вядома, не апошняя. Новая кніга з ліку папулярных – пра асьветніцкі характар гаворыць мэта, пастаўленая аўтарам: «Праз беларускія ўласныя імёны, прозьвішчы, тапанімічныя назвы можна па-свойму арыгінальна расказаць, што беларусы як самастойная нацыя ўнесьлі дастойны ўклад у навуку, літаратуру, мастацтва ня толькі свайго, а й суседніх зь Беларусьсю народаў». Мэта сапраўды арыгінальная, бо раней такія задачы вырашаліся праз вывучэньне іншага матэрыялу. Але і аўтару ўдалося шмат.

Чытаючы кнігу, можна падзівіцца яшчэ раз, які багаты моўны матэрыял назапасілі лінгвісты, географы і гісторыкі. Аўтар карыстаецца ім сьмела і ўмела. Часам цытаты з іншых прац ідуць па некалькі абзацаў запар. Галоўнае ў гэтай справе – даваць спасылкі на іншых аўтараў, і дзякуючы наяўнасьці спасылак, кніга моцна выйграе ў параўнаньні з іншымі. Чым яна да іх падобная – адсутнасьцю паказальнікаў. Але гэта даўняя і, пэўна, невыкараняльная хіба беларускага кнігадруку.

Структура працы досыць традыцыйная. Ахарактарызаваныя асабовыя імёны, імёны па бацьку, мянушкі, прозьвішчы. Бадай, упершыню на старонках беларускай кнігі даецца тлумачэньне, што такое «прыдомак» – дадатковае прозьвішча ў шляхты, частка падвойнага. Тлумачэньне ў кнізе некалькі спрэчнае, бо спрошчанае. Шляхоў зьяўленьня прыдомкаў было шмат, часам вельмі адметных. Усім вядомы пісьменьнік і гісторык Юльян Урсын-Нямцэвіч. У беларускім друку ён лічыўся проста Нямцэвічам, які меў два імя: Юльян і Ўрсын. Папраўдзе, Урсын – гэта прыдомак. Род Нямцэвічаў карыстаўся гербам Равіч, што меў выяву паненкі вярхом на мядзьведзі. «Мядзьведзь» на лаціне ursus, «мядзьведжы» – ursinus. Так недзе ў XVIII ст. Нямцэвічы для большага сабе гонару сталі звацца і Ўрсынамі. Яшчэ больш яскравы прыклад шляхецкага славалюбства даюць падвойныя прозьвішчы, дзе прыдомак паўтарае корань асноўнага прозьвішча. Так любіла называць сябе драбнаватая шляхта, набіраючы гонару: Брэшка-Брашкоўскі, Май-Маеўскі, Рыжы-Рыскі. Сьпіс можна доўжыць і доўжыць. Самы знакамітыя такі прыклад даў адзін вядомы беларускі дзяяч, які ўжо ў сталым веку прыдбаў сабе прыдомак, і з проста Булаховіча (ад нараджэньня) стаў Булак-Булаховічам. Пасьля падалося, што гэтага мала, узьнік Бей-Булак-Булаховіч. Здаецца, гэта быў рэкорд такога роду прыдомкаў, але тут патрэбныя дадатковыя штудыі.

Яшчэ адна адзнака вялікага шляхецтва – валоданьне двума і больш імёнамі. «Многія беларусы каталіцкага веравызнаньня ўвесь час мелі і маюць два імені». Гэтую тэзу можна разьвіць: мелі й больш імёнаў. У Касьцюшкі іх было тры: Андрэй Тадзвуш Банавэнтура (хоць у будзённым жыцьці ён ужываў толькі адно), а некаторыя Радзівілы ў XVIII ст. пачалі валодаць чатырма: Фрыдрых Вільгельм Людвік Багуслаў і г.д. Калі размова зайшла пра Радзівілаў, трэба зазначыць, што яны самі ніколі не карысталіся сваімі знакамітымі мянушкамі (Сіротка, Пане Каханку, Рыбанька). Так іх называлі лісьлівыя або зайздросныя гісторыкі і пісьменьнікі. Што яны самі прыдумалі (хаця гэта няпэўна) – дык гэта моду на падвойныя літары ў прозьвішчы. Калі «Радзівіл» стаў «Радзівіллам», шляхта прыняла гэта як узор. Да таго ж узьнікла імкненьне да дзіўнага канчатку «-о». Зьявіліся «Горватт», «Забелло», і хто пазнае ў прозьвішчы «Лаппо» (так зваліся і вядомыя гісторыкі) старажытную беларускую «Лапу»?

Каштоўная рыса кнігі ў тым, што не абмінутыя прозьвішчы беларускіх жыдоў, і паспаліты чытач ці не ўпершыню зможа пазнаёміцца з гэтай старонкай беларуска-ідыш сувязяў. Так, былі у Беларусі раней і ёсьць цяпер у сьвеце такія прозьвішчы, што ўтвораныя ад назваў нашых мястэчак і гарадоў, ці то славянскім шляхам (Слуцкі, Хомскі, Глускі), ці сродкамі мовы ідыш: Слуцкер, Глускер, Шкловер і г.д.

Пра назвы мясцовасьцяў Беларусі напісана шмат, так што гэтыя радзьдзелы ў кнізе насычаныя цікавым матэрыялам. Заўважым, што напісаньне «Брэст» (пад узьдзеяньнем польскай мовы) паходзіць, пэўна ж, не ад французскага Брэсту. Ды й слова «хутар» вырасла не з «кута», тут этымалёгія больш складаная. Каб праілюстраваць беларуска-сібірскія тапанімічныя сувязі, чамусьці не выкарыстоўваецца адзін з ярчэйшых прыкладаў. Нейкі Альфонс Козел-Паклеўскі (род валодаў маёнткам Паклева на Ашмяншчыне) у сярэдзіне XIX ст. як вялікі прадпрымальнік вызначыўся на абашарах Заходняй Сібіры, і ў ягоны гонар зьявілася чыгуначная станцыя Паклеўская – цэнтар яго гандлёва-прамысловай імпэрыі.

Па прачытаньні кнігі зьяўляецца пытаньне: а чаму асьветленыя толькі асабовыя і геаграфічныя назвы? Уласныя імёны – зьява вельмі шырокая. Ці не актуальныя праблемы зааніміі – назваў жывёл? Здаецца, ужо ўсе маюць калі не сабаку ці ката, дык папугая. Нешта не трапляліся на вочы рэкамэндацыйныя сьпісы мянушак для жывёл. Кажуць, што хатніх жывёл нельга клікаць «царскімі» імёнамі. Заонімы вывучаюцца на Захадзе, плённа – у Польшчы, трохі – у Расеі (тут пашанцавала мянушцы Палкан, бо мае міталягічныя карані), а ў Беларусі – зусім мала. У той жа Польшчы модна вывучаць назвы новастворaных фірмаў і кампаніяў – каштоўны матэрыял для дасьледаваньня сучасных працэсаў у мове і сацыяльнай псыхалёгіі. З апошніх сфэраў анамастыкі набыла актуальнасьць «кампутарная». У ролі дасьледнікаў выступаюць гакеры, якія з дапамогай, у тым ліку, лінгвістычнага і псыхалінгвістычнага аналізу вывучаюць кампутарныя псэўданімы, імёны прадпрыемстваў, запісаў у Інтэрнэце і г.д. Поле дзейнасьці для анамастыкі вялізнае.

Валеры Пазьнякоў

ДЫСКАГРАФІЯ

«PRAVINCYJA». Віктар Шалкевіч. (р) БМА group, 1999.

Ну, канечне! Дастаткова праставіць недзе на вокладкі значок ©, і можна сьмела ганарыцца тым, што ты вытыркнуўся на цывілізаваны выдавецкі рынак у галіне музычнага шоўбізнэсу. Аднак... Ад талчка да рынку – ісьці а ісьці! Гэта не Шалкевіча ўласна я маю на ўвазе, дай Бог яму здароўя ды грошай, а вось гэтую касэту з вокладкай, на якой ня веру амаль ніводнаму надрукаванаму слову.

Найперш ня веру названым імёнам музыкантаў. Калі зьмест гэтай кампіляцыі складаецца напалову з песень, што былі выдадзеныя ў 1996 годзе на альбоме «Смутны беларускі блюз», а напалову – з песень альбому «Баляды і рамансы» (1998 год), дык у запісе першага альбому такія музыканты дакладна ня ўдзельнічалі! Па-другое, ня веру ў такі надпіс: «© Я. Зелянкевіч». Бо не разумею яго. Што, нейкі сп. Зелянкевіч выкупіў аўтарскія правы на частку песень Шалкевіча? І нават добра за тое заплаціў? Чаму тады Шалкевіч такі худы ходзіць па Горадні? Ня веру нават у тое, што сам Шалкевіч ведае пра выданьне свайго трэцяга – так атрымліваецца – альбому.

Ну, ня веру – і ўсё!

Песьні на касэце – скрозь знаёмыя, адно што парадак іх у параўнаньні з тым, як яны красаваліся на ўжо згаданых альбомах, цалкам іншы. Зноў жа, ня ведаю, хто быў драматургам. Можа, той самы сп. Я. Зелянкевіч з высока ўзьнятым уласным калірайтам? Затое я ўпэўнены, што такі парадак Шалкевічу яўна не спадабаецца. Бо ён – актор тэатральны, і ведае, што такое зачын, разьвіцьцё, кульмінацыя ды канец. Вось чаму і кажу: гэта – канец усяму!

Цікава, песьня «Жлобская нацыя» – гэта пра каго?

Але ж Шалкевіч славутасьцю зрабіўся! Амаль як Ліка Ялінская! Ягоную творчасьць тыражуюць з зайздросным пірацкім імпэтам, касэты прадаюць і выручаныя грошы на справы разьвіцьця Адраджэньня, трэба думаць, вагонамі адпраўляюць. А сам Шалкевіч, пэўне ж, радасны, сьпявае сабе ды сьпявае: «Дзякуй, вялікае дзякуй!»

Не, выжыве нашая Бацькаўшчына, калі ў яе музычным шоў-бізнэсе працуюць такія крыштальна бескарысьлівыя творцы. Выжыве, расквітнее, а тут і мы – самы час, з уласным значкам ©. Плясьнем і скажам: а мы, маўляў, да гэтага таксама руку прыклалі. Во!

Слухач



«STOTIS». Гурт Žygimont VAZA. (р) 1993 SMAGA Studio.

«PREZYDENT COLLECTION. LIVE SHOW». Гурт Žygimont VAZA. (р) 1995 SMAGA Studio.

«DER DRITTE KRIEG». Гурт Žygimont VAZA. (р) 1996 SMAGA Studio.

Хлопцы, хавайся! А Іван – наагул Go Home! Тут вам не Іванкі-дурненькія, а музыка сур'ёзная, высокадухоўная ды выкшталцоная. Узор, адным словам, для перайманьня ўсімі тымі інтэлігенцікамі з гітарамі ды сухотнымі постацямі. Прадумана ўсё – ад назвы (уяўляеце якую ізраільскую трэшавую каманду, якая сьпявае на іўрыце і завецца кшталту «Golda MEIR»?) да афармленьня ўкладак у касеты, якія паслухаць ды напісаць потым колькі словаў далі мне чамусьці праз гадоў восемдзесят па іх выданьні. Не зьбянтэжыла. І не такое чуў. Вось і паслухаў. Жывы застаўся – і дзякуй Госпаду. Бо слых зьбярог – дзякуй, што не кампактны дыск, а толькі кароткая касэтка. А што піўны ларок потым не ўзарваў – thanks, SMAGA Studio!

Адным словам, тры альбомы. Не, гэтыя музыканты, беларусы Skrypa MX, Gilep ды нейкі Cypruk Notowich – у сваім родзе, канечне, віртуозы! Гэта каб на працягу аднаго боку касэты, а ў суме -- шасьці бакоў трох касэтаў бамбіць адно й тое ж і ані разу ня зьбіцца... Трэба ўмець! Праўда, на апошнім альбоме, хіба ад роспачы ды болю за Радзіму словаў ім не хапіла. Паўсталі проста інструмэнтальныя кампазыцыі, так сказаць. Трэш-барока, саната для сэкс-вібратара ды струнных у трох частках.

Частка першая: «Вакзал». Па-ангельску (у ашмянскім вымаўленьні) -- «Зэ стоцыс». Афармленьне – супэр! Зьмест... М-да. Не, вядома, я ціха радуюся, што беларусы і ў гэтай галіне не засталіся ўбаку ад сусьветнага прагрэсу і на роднай мове выконваюць такія супэрактуальныя музычныя стылі, як гэты вось... як яго... ну, самі ж ведаеце... Ну, канечне! Як гэты.

Частка другая: «Канцэрт у рэйхстагу» са здымкам Мірона над сталіцай скоранай БНФам Нямеччыны. Поўны капут! Лірыка ў росквіце. Цікавая знаходка гукарэжысэраў: чым горшая якасьць запісу, тым болей краіна атрымлівае трэшу ці нечага такога ж арыгінальнага ды жыцьцесьцьвярджальнага. Нам песьня жыць ды любіць памагае. Двойчы альбом асіліў. Точна – памагае. Ад коркаў у вушах памагае.

Частка трэцяя: «Der dritte Krieg». І зноў – дызайн! Супэр! Хлопцы-жыгімонты, можа, у 1993 годзе варта было б адразу дызайнам заняцца, а на гітары ды «Смага студыя» ня траціцца? А то сапраўды: «Нарабілі змагароў, абціраем з твару кроў. Набліжаецца туман, вычвараецца блазан».

Пушкін, ах, Пушкін.

У музычную тканіну трэцяй часткі арганічна і тонка ўплецена нітка «Nowe sytuacje», узятая з часоў нялёгкай мінуўшчыны польскага рок-ынд-рола. Тонкая работа! Галоўнае – зь неахопным слоўным запасам.

Пушкін – Go Home!

Трэба мець сапраўды гераічны характар, каб на працягу столькіх гадоў іграць адну й тую ж музыку. Заўважце, шаноўныя судзьдзі: я не напісаў «іграць адно й тое ж», а напісаў «іграць адну й тую ж музыку». Таму што Žygimont VAZA адно й тое ж не іграе: назвы ў песень розныя. Значыць, песьні – таксама.

Слухач

«БЕЛАРУСКІЯ МАРШЫ І ПЕСЬНІ. ЛІРЫКА ЗМАГАНЬНЯ». Мужчынскі хор «Унія». (р) UNIJA 1998.

Вось вам яскравы ўзор таго, як з песьняй і, зразумела, з маршам крочыць па жыцьці. Мужчынскі хор «Унія» -- сіла! Хлопцы з Žygimont VAZA таксама мужчынскімі галасамі сьпяваюць, ды, на жаль, ня хорам. Вось і ня здольныя праняць душу змагара за лепшае Айчыны. А тут -- столькі мужчын! Столькі мужчын... Прыгожых. Я пра галасы. Прычым тая «Унія» сьпяваць здольная практычна любую музыку. Чуў неяк, як яны па сьвінгу давалі -- клас! Чуў нават, як яны «Зэ Беатлес» выконвалі. Таму ўпэўнены, што і па трэшы, дэсы ці блэку здольныя прайсьціся далікатна ды вытанчана. І зробяць тое так, што вакалісты з ВАЗы пазарываюць у зямлю свае гітары глыбока-глыбока.

А вабшчэ касэтка яшчэ тая... Гэта ж трэба – у адным месцы сабраць столькі песень скрозь аўтарства розных эмігрантаў – канфэдэратаў там безыменных, Шчаглова-Куліковіча, Равенскага (ты ж панімаеш?), Рагоўскага, Тэраўскага. Ну, апошні яшчэ нічога, амаль наш. А паэты, на чые вершы тыя кампазытары пісалі? Скрозь зьбеглыя ад званьняў народнага песьняра ды заслужанага работніка культуры: Дубоўка там, Багдановіч, Арсеньнева, Купала, Панізьнік Сяргей Сьцяпанавіч. Апошні, праўда, тут яшчэ, але таксама падазроны. Так сказаць, замечаны ў сьвязях з нацыянальнай культурай.

Не, я не разумею таго Кірылу Насаева, мастацкага кіраўніка ды дырыжора! Гэта каб столькі часу ды таленту аддаць на рэпэтыцыі, запіс песьняў ды маршаў, якія, да ўсяго іншага, безумоўна знойдуць водгук у сэрцах слухачоў?! Навошта! Спявалі б сабе «Стаптаў Ясь канюшыну, а калгас спаліў бэнзіну» – на Дажынкі б запрасілі выступіць. А Дажынкі – гэта гонар і слава, лепшае з беларускага мастацтва. А тут – бач ты, пагражаюць: «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Гэта што, гімн амону? Дый падзагаловак праграмы сумніцельны. Лірыка змаганьня... Каго з кім? Амону зь немцамі? Вось бы і сьпявалі тады: «Гарыць, гарыць, мая Лагойшчына!» Аўтары – людзі праверaныя. Гэтых якраз дагналі і адзначылі званьнямі.

А тут – чаго толькі няма! І пра Касьцюшку табе, нацыянальнага героя краіны-удзельніцы НАТА, і пра паўстанцаў, і пра абаронцаў Случчыны. І гэта ў той час, як мы абараняем Мілошавіча ды Хусэйна! Ну, даражэнькія мае!.. Расьперазаліся аж да таго, што ў дзьвюх песьнях замест аднаго баяну два запісалі! А яшчэ прыцягнулі дзеля дасягненьня высокага мастацкага эфэкту і духавы ансамбаль, і нат цэлы аркестар! Панятна, што грошы на гэта знайшлі не ў Замяталіна Уладзіміра Пятровіча, які шчыра хварэе ад усяго беларускага, а за мяжою, у той самай НАЦЕ, якая подла хаваецца пад лячынкай «Беларускі інстытут навукі і мастацтва». А каб дурныя слухачы, у якіх гэтая касэта павінна быць у плэеры літаральна ў кожнага, не здагадаліся, пад чыю музыку яны скачуць на чарговы рэфэрэндум, адрас таго інстытуту схавалі пад няправільным надпісам Нью-Ёрк.

Во, аказваецца, дзе трэба шукаць крыніцу беларускага мастацтва!

Нездарма ж бацькі яшчэ ў далёкім дзяцінстве неаднойчы паўтаралі мне: лепшае шукай у Амэрыцы. Толькі нашто мне тая Амэрыка, калі «Унія» – тут, пад бокам? Пайду, бадай, яшчэ пару касэтаў набуду. А то, адчуваю, хутка за адну такую тры залатыя кампакты Саладухі выменяць змагу...

Слухач

АДЗІН ВЕРШ ПРА МЕНСК

Фотавыстава-пэрфоманс «Менск — горад з Тварам», аўтар канцэпцыі Вольга Сьмірнова, 27 траўня 1999, Менскі Плянэтары.

Выстава-інсталяцыя зробленая ў форме велізарнай клеткі, на якой зьмешчаныя фотакарціны Міхала Баразны, Дзьмітра Строцава, Сяргея Піліповіча, Андрэя Жука, Вольгі Сьмірновай, Дзяніса Раманоўскага, Андрэя Савіча, Канстанціна Дробава і Алены Мулюкінай. Пасярод клеткі ляжыць паўбомж-паўпаэт (Зьміцер Вішнёў) — «урбаністычны тыпаж». Дзея пачынаецца ў фае менскага Плянэтарыя, а сканаецца пэрфомансам пад бутафорскім небасхілам пад акампанэмэнт сьпевакоў, паэтаў (Сяргей Пукст, Сяргей Карчыцкі, Дзьмітры Строцаў, Аляксандар Лісіцын і інш.) і лекцыі пра зоркі, сярод якіх ёсьць плянэта, якая нарадзіла Менск, і чорныя дзіры, у якія Менск шторaз мае шанец патрапіць...



Можна правесьці шмат паралеляў, назьбіраць безьліч алегорыяў на прадмет дачыненьняў менчукоў з космасам. Але, аддаючы даніну «прыколу» арганізатараў, можна ўявіць сабе гэтую выставу на станцыі мэтро, альбо на мэталічным сьметніку ў Гатаве ці на чыгуначным адхоне. Праз гэта ня зьменіцца асноўная мэта: давесьці, што Менск — напраўду горад з тварам.

Наўрад ці сама тэза можа выклікаць пярэчаньне. Вазьміце любую купюру беларускіх рублёў, і вы ўбачыце, што Менск сапраўды існуе. Існуе як... Часам сталіцу Беларусі называюць горадам-фантомам, не прыстасаваным для чалавечага жыцьця. Маецца на ўвазе сталінскі ампір як пародыя на фараонаўскую манумэнтальнасьць, якая месцамі аздобленая рэшткамі «жывой» архітэктуры, што шмат гадоў таму стваралася не для вайсковых парадаў, а для канкрэтных патрэбаў людзей.

Той, стары Менск ствараўся людзьмі, якія верылі, што вечнае жыцьцё магчымае толькі на небе. «Новы» Менск будавалі людзі, якія спадзяваліся «ўжо ў наступнай пяцігодцы» наблізіцца да неўміручасьці на зямлі. З падобнымі людзьмі сутыкнуўся геро йапавяданьня Х.Л.Борхеса «Несьмяротны», які дасягнуў гораду, збудаванага «вечнажывымі» людзьмі. Герой блукаў калідорамі й галерэямі, пабудаванымі ва ўсіх магчымых стылях, і раптам зразумеў, наколькі горад быў непрыстасаваны да чалавечага жыцьця. З часам «вечныя людзі» пакінулі свой горад, бо для жыцьця ў вечнасьці ім непатрэбныя якія-кольвек прыстасаваньні, дастаткова папросту ляжаць на зямлі і глядзець у неба...

Менчукам пэрспэктыва «вечных людзей» не пагражае. Магчыма, з гэтай акалічнасьці ўзялі натхненьне стваральнікі акцыі «Менск — горад з тварам». Можна дадаць — з жывым тварам. Яны раскрылі Менск, да якога слова «вечны» падыходзіць толькі з пункту гледжаньня максымальнага тэрміну існаваньня нэгатыву на фотастужцы.

«Жывы Менск» існуе не ў паралельных прасторы й часе, але ў міжчасьсі і міжпрастор'і («фараонаўскай», старасьвецкай ці якой іншай). Гэта вобразы, паўсталыя дзякуючы першаму сьнегу, адной кроплі дажджу, гульні фарбаў, ценяў, літараў і позіркаў... якія прымусілі «скамянеласьці» рухацца. Гэта горад-імпрэсія. Гэта места, якое немагчыма ахапіць адным вокам — Менск па-над Менскам.

«Менск — горад з тварам» — гэта хоку, у якое ператварылася бясконцая гісторыя зьнікненьня і паўставаньня Менску. Гэта акцыя, якая мысьліцца як нізка падобных «хоку», зь якіх мусіць паўстаць зборнік — кніга для жывых людзей.

Квят.

Здымкі В.Сьмірновай і С.Піліповіча



Працяг са старонкі 1.

ХУТАРАНЦЫ

Яны ўсе неўпрыкмет узіраліся пад ягоную апратку — ці ня высунецца дзе хвосьцік. Але не, нічога нідзе ня высунулася. Недзе блізка ля поўначы ледзьве выбавіліся ад яго, і маці заплакала — зноў яна бачыла хвосьцік. Мужчыны ня ведалі, што і думаць.

Дачакаўшыся ранку, гаспадар узяў у сьвіране чорнае хвабры і на ўсіх дзьвярох намаляваў невялікія крыжыкі. Маці супакоілася: калі то д'ябал, дык пад крыжыкі ён ня ўвойдзе. Са страхам і надзеяй пачалі чакаць наступнай начы.

Вечар мінуў спакойна, ніхто ня стукаў. Трохі яшчэ счакаўшы, сямейка паклалася спаць. Ды яшчэ ня ўсе заснулі, як у падваконьні штось грукнула. Бацька зьлез з палацяў, засьвяціў лямпу. На покуце ўжо сядзеў усё той жа чалавек.

Вакно за ім было выстаўлена знадворку, і ў хату дзьмуў вецер.

— Я наконт інтэграцыі, — спакойна пачаў знаёмую песьню захожы.

— Прэч! — крыкнуў бацька.

Тут ускочылі сыны, сталі Рэшту тае начы сямейка ня клалася спаць, чакала. І ня ведала, што рабіць. Было зразумела, што хрысьціянскі крыжык на дзьвярох іх не ўратуе.

Ажно на золку старэйшы з сыноў Янка сказаў, што ён ведае антыд'ябальскі сродак. Надзеў шапку і пайшоў у горад.

У паўдзён ён вярнуўся з аршынам каляровае матэрыі. На дрывотні змайстраваў спрытную дзяржаўку. Атрымаўся прыгожы сьцяг, які тры мужчыны прыбілі да вугла. Вецер адразу падхапіў яго і разгарнуў ва ўсю даўжыню — сьцяг узрадавана затрапятаўся.

— Цяпер хай прыйдзе! — сказаў Янка.

І праўда, з таго часу прывязьлівы незнаёмец ні разу не завітаў на хутар, аздоблены бел-чырвона-белым сьцягам.

7 студзеня 1999 г.

Народжаны для Жыцьця

Ірына ШАБЛОЎСКАЯ

Ён вымушаны быў яго абараняць на фронце... Змагацца і пасьля вайны за Праўду мастацкага аповеду пра вайну. За Незалежнасьць сваёй Бацькаўшчыны, за годнае існаваньне асобы, абараняць яе ад розных формаў таталітарнага ўціску.

Ёсьць заканамернасьць у тым, што беларуская зямля запатрабавала талент ваеннага пісьменьніка. Што ім стаў Васіль Быкаў. Ня трэба доўга тлумачыць: зямля, якая спазнала войны на працягу большай часткі свайго гістарычнага часу. Спазнала страх, генэтычна адбіты на лудзкіх душах. Зямля пасярэдзіне Эўропы, населеная мірным народам, які сам не распачынаў боек, не рабіў набегаў на сваіх суседзяў... Абараняўся. Цярпеў, шмат цярпеў ад пакут. Зьбіты з свайго нацыянальнага дыскурсу, адлучаны ад сваёй слаўнай гісторыі, вялікай культуры і традыцыяў, ён губляе апошняе — родную мову. Унікальны нацыянальны досьвед выжываньня гэтага Народа, слыннага сваёй даверлівасьцю і шчырасьцю, складваўся на вайне, у супрацьстаяньні ворагам: яўнаму і схаванаму, чужынцам і «сваім».

Народ нясе ў сабе Праўду, усю Праўду, якую толькі ён, Народ, па словах Быкава, і ведае. У тым ліку — Праўду пра Вайну. А пісьменьнік можа наблізіцца да Ўсёй Праўды, але для гэтага патрабуюцца вялікія Цярпеньне, Мужнасьць, Сумленьне. Дастаткова прачытаць біяграфію Васіля Быкава, каб адчуць яго Неабходную Суаднесенасьць са сваёй нацыянальнай гісторыяй і культурай. Пакуты яго зямлі — у яго ваенным лёсе (паступіў вучыцца ў мастацкую вучэльню, але вайна распарадзілася па-свойму: скончыў вучэльню — вайсковую — у сорак трэцім, маладзенькім лейтэнантам прайшоў праз Румынію, Вугоршчыну да Аўстрыі). Ён усё ж такі стаў мастаком, Мастаком Слова, рэалізаваў у мастацкай літаратуры Апостальскія функцыі Абаронцы Праўды, Асобы. Яго творчасьць упісаная ў кантэкст сусьветнай літаратуры XX ст. менавіта на каардынатах асэнсаваньня сучаснага Быцьця Чалавецтва, якое выпрабоўваецца тэхнакратычнай цывілізацыяй на здольнасьць перамагчы прадказаны канец сьвету, не дапусьціўшы новай сусьветнай вайны, пра якую, як пра магчыма апошнюю, так часта нагадваў Алесь Адамовіч.

Вайна — рок і лёс Васіля Быкава, як, дарэчы, не аднаго пакаленьня беларусаў. Ёсьць свая заканамернасьць у адданасьці пісьменьніка праблематыцы вайны, якая робіць яго творчасьць выключнай. Яна амаль ня мае аналягаў у сусьветнай літаратуры. Я не гавару пра дакумэнталістыку. У мастацкай прозе XX ст. Быкаў адметны як творца жанравай мадыфікацыі аповесьці, якую можна лічыць эталённай ваеннай аповесьцю, альбо раманам, альбо мікрараманам. У цэнтры яе ваенны хранатоп (час і прастора), спалучэньне структураў сацыяльна-філязофскага рамана на ваенную тэму і экзыстэнцыйнага, пабудаванага вакол сюжэтнай сытуацыі выпрабаваньня асобы, чалавека, яго стасункаў з грамадзтвам у дачыненьні да гісторыі. Адданы малому жанру, пераважна аповесьці, Быкаў стварыў адмыслова аграненую мастацкую прозу, якая арганічна ўпісваецца ў пошукі славянскіх літаратур пра вайну (асабліва польскай, югаслаўскіх, славацкай) на этапе, які пачаўся з канца пяцідзясятых гадоў, а потым у шасьцідзясятыя пазначаны ўзьнікненьнем фэномэну ваеннай прозы. Назаву хаця б некалькі імёнаў творцаў гэтага фэномэну: славакаў Ладзіслава Цяжкага і Рудольфа Яшыка, палякаў Тадэвуша Новака і Вацлава Біліньскага, македонца Ёвана Паўлаўскага, харвата Міркі Божыча, славенца Цырыла Космача.

Васіль Быкаў у парадыгме мастацкай літаратуры XX ст. — Творца, які, асэнсоўваючы лёс свайго народа ў гады другой сусьветнай вайны, усьвядоміў Трагедыю вайны наагул і агульныя страты чалавецтва ў ёй. Увасобіў гэта адмысловымі мастацкімі сродкамі, спалучаючы нацыянальную традыцыю (а беларуская літаратура пра вайну — адна з самых глыбока распрацаваных, у ёй адметны паэтычны код, сваё псыхалягічнае аблічча, свая нюансоўка канфліктаў, сюжэтных пошукаў) з сусьветнай.

Проза Васіля Быкава дасягае вышэйшага майстэрства. Уся яго творчасьць: ад першых апавяданьняў і аповесьцяў «Сьмерць чалавека» (1951), «Пастка», «Сваякі», «Адна ноч» да твораў апошніх гадоў «Падоранага жыцьця», «Пакахай мяне, салдацік» — прафэсійна вытанчаная і адмысловая.

Пісьменьнік зьдзіўляе сваёй цэласнасьцю, вернасьцю абранай праблематыцы: самай цяжкай псыхалягічна, ваеннай. Ён унікальны гэтай вернасьцю тэме, якая для яго адкрываецца безьліччу адценьняў. Яна дорыць яму непаўторнасьць сытуацыяў, псыхалягічнай інтэрпрэтацыі чалавечых паводзін на вайне, экзыстэнцыйнага выпрабаваньня.

Пісьменьнік неаднойчы выказваў сваё крэда: «Жыцьцё кароткае, і трэба сьпяшацца рабіць добрыя справы. Не сябе любіць, а бліжняга свайго, чалавека любіць. Каб пазьней, пасьля ўсяго, пасьля цябе ўзышла на зямлі зялёная трава памяці. Трава пасьля нас». Уяўляю сусьветную літаратуру як збор лепшых твораў розных нацыянальных літаратур, у якіх праз сваё, тутэйшае, роднае пісьменьнік ідзе да ўсяго чалавецтва. Сваю прастору і час упісвае ў сусьветны кантэкст, далучае да Вечнасьці. Экзюпэры, Гемінгуэй, Рэмарк, Фолкнэр, Кафка, Маркес, Камю, Сартр, Бёль... Менавіта праз засваеньне экзыстэнцыялізму ствараўся мастацкі фэномэн ваеннай прозы. Вопыт Сартра і Камю аказаўся вельмі блізкім літаратурам пра другую сусьветную вайну, створаным у шасьцідзясятыя гады ў славянскіх літаратурах (Лаліч, Мінач, Анджыеўскі, Шыкула, Братны, Путрамэнт, Някрасаў, Астаф'еў). Ваенная проза — гэта вынік эвалюцыі літаратуры пра вайну. Дыскурс літаратуры пра вайну менавіта ў гэтай яе зьмене назвы: у шасьцідзясятыя гады, калі яна стала называцца «ваеннай», яна пасьпяхова асвойвала філязофскія асновы літаратуры антываеннай. Новае вымярэньне Трагедыі вайны — у межах усёй чалавечай цывілізацыі. Абсурд забойства інэрцыйнага, ваеннага, забойства ад страху, забойства па абавязку. Жах чужаніцы сярод сваіх. Неабходнасьць амаральнасьці на вайне, брутальнасьць як быцьцё ў ваеннай прасторы. Непрыняцьце забойства і зьдзіўленьне перад веліччу жыцьця і каханьня, такіх кволых і бездапаможных на вайне. Эвалюцыя прозы пра вайну — у зьмене каардынат: ад баталістыкі да філязофіі, ад гераічнага да трагізму, ад функцыяў сьведчаньня да псыхааналізу, ад апісальніцтва да аналітычнасьці, ад нацыянальнага да сусьветнага.

Ёсьць адна якасьць, арганічная для прозы Васіля Быкава: прыпавеснасьць паэтыкі, якую стварае філязофскі падтэкст. Наяўнасьць другога, глыбіннага і нябачнага, пляну наталяе, здавалася б, ужо адпрацаваныя канфлікты і сюжэты. Замест баталістыкі — Душа, раскрыжаваная на вайне: паміж жыцьцём і сьмерцю, Каханьнем і Нянавісьцю, аданасьцю і здрадай, альтруізмам і эгаізмам. Архетыпічны абрыс набываюць яго вайскоўцы-пакутнікі, бясконцасьць шляхоў вайны, беларускія краявіды, неба і зямля. Мэтафарычна гучаць кароткія назвы «Пастка,» «Здрада», «Жураўліны крык», «Знак бяды», «Сьцюжа», «Аблава», «Сьцяна».

Менавіта прыпавеснасьць — характэрная рыса рэалізму XX ст. у яго адрозьненьні ад клясычнага. Яна праяўлена ў творчасьці Камю і Сартра, Экзюпэры і Гемінгуэя, Фолкнэра і Маркеса, Коба Абэ і Брэхта — у літаратурах розных краін сьвету. З гэтымі і многімі іншымі майстрамі сусьветнай літаратуры супастаўляецца проза беларуса Васіля Быкава. Параўнальны падыход дазваляе ўбачыць адметнае і непаўторнае як кожнай нацыянальнай традыцыі, так і саміх творцаў. Вывучэньне сусьветнага кантэксту беларускай літаратуры толькі пачынаецца, дакладней, аднаўляецца вялікая справа нацыянальнага Адраджэньня, якую ў свой час пачалі нашыя папярэднікі на старонках «Узвышша», вядомыя беларускія перакладчыкі.

Парадокс Быкава як пісьменьніка савецкага ў тым, што ён ім быў толькі па храналягічнай прыналежнасьці. Яго творы ад першых апавяданьняў да апошніх аповесьцяў, прысьвечаных вайне, асэнсоўваюць Трагедыю. Быкаў экзыстэнцыйны пісьменьнік па сваёй сутнасьці. Яго вайна пададзена як быцьцё. Вайскоўца, палоннага, мірнага насельніцтва. Быцьцё нацыі. Быцьцё краіны. Быцьцё паміж молатам і кавадлам, паміж «сваім» (савецкім) і чужым (гітлераўскім, які часта атаясамліваўся зь нямецкім) фашызмам. Генацыд супроць Асобы, Духоўнасьці, нармальнага Жыцьця, якое ўвесь час уціскалася ў пракрустава ложа камуністычнае ідэі і мары пра сьветлую будучыню.

Вайна для беларускага народа пачалася значна раней да другой сусьветнай.

Парадокс Быкава як пісьменьніка ваеннага ў тым, што ён не арыентаваны на Перамогу ў яе традыцыйна савецкім разуменьні. Мне ўяўляецца, што формула значна складаней: уцёкі ад Перамогі як уцёкі ад homo killera, ад забойства наогул. Ад вайны. Ад вайны ўсялякай, і той, якую ў трыццатыя гады навязалі саветы свайму народу. У Быкава вайна канкрэтная і, так бы мовіць, фэнамэналягічная, спраектаваная на ўсю гісторыю Беларусі і гісторыю чалавецтва. Быкаў услаўляе жыцьцё, а не вайну, гераізм як выбар асобы, унутрана заматываваны, не стыхійны. Ён народжаны дзеля ўсхваленьня Жыцьця і так гаворыць пра гэта: «... Пісаць толькі пра вайну альбо пісаць выключна аб міры проста немагчыма. Калі пісаць, то пісаць пра жыцьцё... А паколькі я пішу пра вайну, то, мабыць, толькі таму, што вайна — гэта тое ж жыцьцё...»

У парадыгме сьвядомасьці XX ст. войны адыгралі вырашальную ролю, яны сталі сусьветнымі, увасобілі набліжэньне канца сьвету. Яны многае вызначылі ў мастацтве. Але кіруючыся сваімі надзённымі праблемамі, творцы часам абарону межаў сваёй краіны вызначалі як галоўнае. Многа такіх дэвальваваных у мастацкіх адносінах, «прагматычных» кніг было напісана ў савецкай літаратуры, што склалі сваю «Ружовую бібліятэку» пра вайну. У яе не ўпісаўся аўтар «Мёртвым не баліць», якога ідэалягічнае начальства ня раз спрабавала «ставіць на месца». Васіль Быкаў, арыентаваны ня проста на Перамогу любой цаной, а на Жыцьцё. Не на алавяных салдацікаў, а на Душу чалавека. Не на маніпуляцыю сьвядомасьці, а на праўду і псыхалягічны аналіз.

Яго не аглушаюць парадныя літаўры і генэральскія загады, яго вуха чуе стогны радавых і цішыню сярод кананады, шоргат камельчыкаў зямлі, што падаюць у акоп ад лапак мураша. Чуе, як б'ецца закаханае сэрца і як яно баліць...

Чаму чалавецтва ня вучыцца на сваіх памылках, на трагічных уроках другой сусьветнай? — гэтае пытаньне Алеся Адамовіча сёньня, пасьля Чарнобыля, набывае новае гучаньне. Усеагульнай трагедыі чалавецтва і новых катаклізмаў.

Чаму ня чуюць сёньня Прарокаў, якіх вядзе любоў і Дабрыня, за якімі Сьвет Духа і Культуры?

Андрэй Хадановіч

Аповесьць пра сапраўднага чужынца

Я чужынец, які забівае раба...

З пэўнага няўісьненага верша.

Я насамрэч чужаніца й нішто насамрэч-чужынскае мне не чужое,
ненасамрэч-чужынскае ці насамрэч-нечужынскае ўжо я,
нібы раба, забіваю на пляжы і, быццам араба, зь сябе выціскаю па кроплі,
каб, стаючыся напраўду чужынцам ад капелюша да абцаса пантоплі,
з гонарам вымавіць: так, насамсправе, я ўжо наўсуцэль чужаніца,
бацька дый маці таксама чужынцы, чужынкай мая сужаніца,
сёстры й браты, і стрыечны пляменьнік, бабуля, і дзеці, і ўнукі,
нат ненароджаны праўнук ім зробіцца без аніякай прынукі,
нат спадкаемцы-нашчадкі, наступнікі покуль ня страцілі шанец –
кожны – прынамсі аднойчы – адчуе, што ён натуральны чужанец
(перапрашаю, чужынец), адчуе любою сваёю чужынскай вантробай,
кожнай чужынскай душэўнаю фібрай адчуе, што ён тут – пабочнай асобай,
ён тут сугней у самоце, мармоль у маркоце, закладнік такіх жа, як сам ён, дзікунак:
гэткія дзеўчыны не пакладуць ні жыцьця, ні каханьня на ўласны швайцарскі рахунак
сына сваіх марнатраўных бацькоў і наймарнатраўнага часу –
часу зацятых і палкіх чужынцаў, тае неўтаймоўнае, дзікае расы,
што аніколі ня будзе празь верных насьледнікаў, собскіх сыноў пераймацца
(хай ужо тыя насьледуюць і пераймаюць, калі не лякаюцца марнае працы!),
што прыбірае відзежы ў ядваб, аздабляе трызьненьні каштоўным каменьнем
і, імкнучы ў безназоўнай цямрэчы за пекным жаночым найменьнем,
кожнае ночы палюе на любасьць і песьціць запал запаволенай міны,
кожнага дня захлынаецца мрояй пра тое, чаго не было, але так, быццам проста гартае ўспаміны,
кожнага вечару ведае праўду, а зраньня ізноў дае веры – канец выдае на пачатак!
(мова мяне выдае, пане Фройд!) – натуральна, ізноў памыляецца – дурань! ніякі
ты мой не нашчадак! –
я ў тваім веку таксама жанчын унікаў, але гэта былі насамперш прыгажуні,
а, па-другое, сапраўдныя дзеўчыны, а не фантомы ўяўленьня – шальбера й шыбуні:
калі ўжо грэбаваць, дык найпякнейшаю ў сьвеце істотай,
каб, карыстаючы з добрай нагоды ўглядзецца ў суладную нагасьць і ўчуць п'яны водар лістоты,
бачыць ня плоць алімпійскай красуні, бо нат багавіца чужынцу ня роўня,
а звычайнейшыя грудзі, і сьпіны, і шыі, і рукі, і ногі ў мужчынскай пароўні
(зрэшты, у сьвеце празрыстых фіранак, дзе дома і сьцены віжуюць, за сьценамі ж – блазны і вязьні,
найпрыдатнейшае сховішча – у пары расейскае лазьні!).



Адам Глёбус

Інтымнае

Тэкстуальныя кантамінацыі, зробленыя на маргінэсе афарызмаў Франсуа дэ Лярошфуко

***

Сустракаць даўнюю каханку крышку сорамна.

***

Каханьне — ахова спакою любімай істоты.

***

Звычайна дапамагаеш толькі таму, што сам спадзяешься на дапамогу.

***

Калі пачнеш разглядаць каханьне з гледзішча навукі, а не эротыкі, дык можаш цалкам пагадзіцца з выказваньнем Ларошфуко: «Каханьне дакладней за ўсё параўноўваць з гарачкаю: цяжар і працягласьць іх ніколі не залежаць ад нашае волі». Але зводзіць эротыку да мэдыцыны — недаравальная загана абмежаваных матэрыялістаў.

***

Кастапраў і ў каханьні бачыць наступствы хваробы хрыбетніка.

***

Не патрабуй праўды ад каханкі — шчырасьць разбурае каханьне.

***

У палымянасьці страсьцей можаш і не заўважыць болю, які прычыняеш любімаму чалавеку.

***

Рэўнасьць — рашучы крок да страты каханьня.

***

Пра недахопы каханкі гавораць у мінулым часе, як і пра яе цудоўныя якасьці, бо каханка ў сапраўднасьці — таямніца за сямю пячаткамі.

***

Самая раўнівая жонка, як вядзецца — нечая кінутая каханка.

Die modernen Sagen-2

Гарачае месьцейка

У апэрацыйным аддзяленьні гарадзкое больніцы працавала неяк адна мэдсястра, якая аж задужа курыла. Як што ў апэрацыйным аддзяленьні курэньне было зусім забароненае, яна рабіла гэта звычайна ў кабінцы прыбіральні, бо не магла рабіць сабе адмысловых перапынкаў на тое. Усе іншыя з апэрацыйкі нат ня мелі здагадкі пра гэта, але надта злавалі на чад у туалеце. Нехта прапанаваў засабачыць ва ўнітаз супэраксыд кісларoду. Хтосьці іншы неўзабаве ўчыніў гэта. Калі курыльніца аднойчы ў чародны раз «запрапала», усе пачулі жудасны крык. Мэдсястра, як заўжды, кінула незагаслы канчарык ва ўнітаз і атрымала за тое моцныя апёкі ў раёне геніталіяў.

Занатавана ад мэдбрата, які сам ня курыць і ня раіць іншым, асабліва ў больніцах. У Беларусі бытуе анэкдот з падобным сюжэтам.

Порна ў шматпавярховіку

Маладыя муж і жонка, якія жылі ў шматпавярховіку з супольнай антэнай, хацелі зрабіць сваё сужэнскае жыцьцё траха весялейшым. Дзеля гэтага яны ў сваёй спальні ўсталявалі відэакамэру. Калі наступным вечарам блізу 23 гадзінаў яны ўлучылі тэлевізар, дык на свой жах убачылі па трэцяй праграме зьняты імі самымі мінулай ночкай фільмец.

З расповеду нямецкай студэнткі. За ім стаіць страх людзей перад магчымым «бунтам» машын, што служаць у паўсядзённы. У Беларусі, не зважаючы на НТР, аж дасюль многія баяцца тэхнікі толькі за тое, што яна ёсьць тэхнікаю.

Небясьпечныя нянькі

Муж і жонка нанялі на час заплянаванага наведваньня тэатру маладую пару для дагляду за дзіцёнкам. Ужо пры сустрэчы маладыя людзі падаліся ім, мякка кажучы, дзіўнаватымі. Таму з тэатру яны яшчэ раз затэлефанавалі дамоў, каб даведацца, ці ўсё йдзе ладна. «Так, усё файна, — быў адказ, — мы гатуем пячыстае і хутка паставім яго ў печку». Поўныя жаху сужонцы паляцелі дахаты і засьпелі акурат той момант, калі нянькі хацелі засунуць у духоўку палітага кетчупам дзіцёнка. У апошнюю сэкунду бацькі здолелі ўратаваць малога. Пазьней высьветлілася, што парачка наглыталася калёсаў і была зусім бесьсьвядомай.

Нямецкі варыянт клясычнай мадэрнай сагі. Хэпі-энд сустракаецца рэдка. Звычайна ў сагах з падобным сюжэтам разьвязка трагічная.

Сутарга

Адна крыху экзальтаваная кабета, калі аднойчы яе муж зьехаў на курорты, скарыстала з нагоды і запрасіла да сябе палюбоўніка. Дык вось, калі справа дайшла да любошчаў, кабету раптоўна замучыла сумленьне, і адбылася сутарга похвы, што палюбоўнік ня здолеў выйсьці зь яе. Неяк яны ўсё ж здолелі выклікаць хуткую дапамогу. Выносячы іх з дому, дактары прыхавалі іхны сорам прасьцінай. У больніцы з дапамогай шпрыца лекар змог супыніць наступствы сутаргі.

Занатавана ў Нямеччыне. У Беларусі бытуюць пэўныя гісторыі, што сюжэтна нагадваюць гэтую сагу. Досьвед сьведчыць, што досыць часта сюжэт згадваецца непасрэдна пад час злучэньня на любоў.

Сучасныя легенды

У абыдзёнцы словы кшталту «легенда», «паданьне», «сага» ўчастых нітуюцца зь нечым даўным, сівавусым, амшэлым. Цяжка бывае ўцяміць, што міжімклівае плыні інфармацыі, якая штодня абрынаецца на чалавечыя галовы, ёсьць і зусім сучасныя легенды. Інакш іх мянуюць «мадэрнымі сагамі», «урбаністычнымі легендамі», «гарадзкімі мітамі». Звычайна сучасная легенда мае выгляд праўдзівае гісторыі аб сапраўды адбытым здарэньні. «Адзін мой знаёмец распавёў...», «Нейкі знаёмы майго калегі паведаміў яму...», «Мая дачка распавяла пра выпадак, сьведкам якога быў хлопец ейнай сяброўкі...» — пачатныя формулы сучасных сагаў, закліканыя адначасна падкрэсьліць праўдзівасьць і дыстанцыявацца як апавядальніку ад адбытага. Апошняе, праўда, выходзіць не заўсёды. Дзеля глябальнага развою mass media, мадэрныя сагі перадаюцца ня толькі традыцыйна, з вуснаў у вусны, але й цераз прэсу, радыё, тэлевізію, Internet. Сюжэты многіх сучасных легендаў атрымалі сусьветны распаўсюд. Беларусь не застаецца ўбаку: сама спажывае і прадукуе сагі.

У сучасных легендах знайшло свой адбітак супрацьстаяньне чалавека з праявамі індустрыйнага і постіндустрыйнага грамадзтваў. Навакольны сьвет, які прынята лічыць рацыянальным, анатуецца ў сагах ірацыянальнымі сродкамі. Нямецкі прафэсар этналёгіі Р.В.Брэдніх мяркуе, што ірацыянальны сусьвет мадэрных саг сьведчыць пра нескарэненасьць у людзкай сьвядомасьці веры ў звышнатуральнае, невытлумачальнае і цікавасьці да яго, парадаксальна-кур'ёзнае, не зважаючы на дасягненьні навукі й тэхнікі. «Самота і экзыстэнцыйная няпэўнасць / неабароненасьць сілкуюць цікавасьць сёньняшняга чалавека да невядомага і небясьпечнага гэтаксама, як і эканамічныя крызы ці часы палітычнага напружаньня і няўстойлівасьці», — піша прафэсар. Таму ў сучасных легендах падсподна адчуваецца пэўная канцэнтрацыя страху: страх раптоўнай сьмерці, боязь умяшаньня чужынцаў у інтымную сфэру, страх прыродных і надпрыродных зьяваў, тэхнікі ды інш. Сьмерць у сучасных легендах зазвычай ёсьць нечым дурным і бесталковым. Тым самым адбываецца зусімная дэсакралізацыя сьмерці.

Фэномэн сучаснае легенды на захадзе дасьледуецца дзесьці з 60-х гадоў на дастаткова высокім навуковым роўні. У ЗША, Вялікабрытаніі, Нямеччыне, Швэцыі выдадзена некалькі дзясяткаў адпаведных анталёгіяў. З 1988 г. дзейнічае International Society for Contemporary Legend Research пры Шэфілдзкім універсытэце. Выдаецца інфармацыйны бюлетэнь «Loaftale News».

Сяргей Балахонаў

4 чэрвеня 1909 году

Ня кожны гаспадар можа выгадаваць сабе добрую карову, а часта прыходзіцца купляць на кірмашы. Тутака ня раз мужыка ашукаюць, бо ня ўсякі ўмее пазнаць добрую малочную карову. Каб памагчы людзям у гэтай бядзе, пагаманім, як пазнаць добрую малочную карову.

Пачнем аглядаць карову ад галавы: галава павінна быць невялікая, сухая, з тонкімі рагамі, лоб вузкі, вочы рахманыя і вясёлыя, вушы вялікія, морда мокрая, зубы моцныя. Бугаяватая галава — самая кепская. Шыя павінна быць тонкая, доўгая зь мяккай скурай і каб зьбіралася ў складкі і вісела пад грудзінай. Корпус (усё цела) каровы павінен быць даўгаваты, храбет — роўны, рэбры — тонкія і крутыя з добрым прасьветам (каб прамеж рэбраў зьмя-сьцілася тры пальцы). Зад у каровы мусіць быць шырокі, хвост стойкі і доўгі, ногі нізкія і простыя з добрымі капытамі (сьцеражыцеся клышавых і цыбатых кароў). Але самае важнае ў каровы — гэта вымя: вымя павінна быць вялікае і мяккае (не вясістае); выдаіўшы карову, на вымені павінны рабіцца складкі і, узяўшы рукой за вымя, можна яго адцягнуць як рызіну. На вымені павінны быць цыцкі тоўстыя і караткаватыя, а вымя без валасоў. Трэба аглядаць добра цыцкі, каб не было папсаваных. Жылы на чэраве ад вымені да пупа павінны быць тоўстыя, з гузочкамі, каб іх можна было разгледзець, не мацаючы рукою.

Па рагах і зубах можна пазнаць, колькі гадоў карове, бо на рагах каровы робяцца кружкі — рубцы, пасьля кожнага цяляці, а ведама ўсім, што карова целіцца не раней, як 3-х гадоў; дык калі ўгледзіш, што на рагах, напрыклад, рубцы тры, — значыць, карове шэсьць гадоў. Добрая карова павіна быць рахманая, не баяцца чалавека, стаяць спакойна і не затрымываць малака.

Іншыя гаспадары думаюць, што толькі «заводзкія» каровы даюць многа малака, а я вам кажу, што можна выбраць і з мужыцкіх кароў важныя, даць ім добры хорч, і яны багата заплацяць за корм.

Юрка Бусел з-пад Слуцка

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

М.Ф. зь Берасьця. У нас таксама няма даверу. Але ня справа газэты – быць арганізатарам. Гэта Вы мусіце быць арганізатарам. «НН» стаіць на пазыцыях палітычнага нацыяналізму. Этнічны нацыяналізм зь перадсудамі што да «р.» ці «х.» здаецца нам атавізмам і паскудзтвам, хаця пра этнічны падбор найважнейшых урадоўцаў вы слушна заўважаеце. Падбіраюць, каму давяраюць.

Уладзіславу Ж. зь Менску. А дзе ж мы возьмем грошы, каб Вам падпісаць газэту? Вы думаеце, нам грошы зь неба ляцяць?! Мы бясплатна нямала бібліятэк падпісваем, іншыя бібліятэкі самі выпісваюць – шукайце там нашу газэту.

«Чорную кнігу камунізму» хацела выдаць адно беларускамоўнае выдавецтва, шукала дабрачынцаў, што ахвяравалі б на выданьне гэтай таміны, дык усе адмовілі. Бо перабіла адно маскоўскае выдавецтва, што літаральна за пару тыдняў да таго купіла аўтарскія правы на расейскае выданьне. А ў дабрачынцаў такая ўстанова, што калі нейкую кнігу выдавалі парасейску, то на беларускае выданьне ўжо не ахвяруюць, кажуць: чытайце па-расейску. Дурасьць, вядома. Трэба нам, беларусам, самім на грошы выбівацца, каб ні ад каго не залежаць.

Хіба ж можна «ачышчаць» чыесьці мастацкія творы, пагатоў ад камуністычных догмаў? Так ня робіцца.

Калі нешта прападае са скрыні, дык скажыце паштаркам, мо якая памылка была, а падкопы тут наўрад ці могуць быць.

Кірылу зь Менску. Кніга добрая, але напісалі Вы пра яе менш, чым таго вартая кніга Кастуся Каліноўскага, прычым уласна пра яе – амаль нічога, усё, як Вы самі пішаце, «бясконцыя камэнтары». А чым яна адрозьніваецца ад папярэдніх падобных збораў – ня пішаце. А што ў ёй – таксама ня пішаце. А калі і кім выдаваліся папярэднія, хто іх складаў і хто сабраў гэтую? Дарэчы, адна «асаблівая падзяка» ў ёй чаго вартая і колькі дае глебы для разважаньняў! Рэцэнзія на кнігу можа быць і зусім малой, але ў такім разе яна мусіць быць найперш інфарматыўнай і ляпідарнай. Ваша ж у яе цяперашнім выглядзе выдае на матэрыял для газэты «Культура», перадусім адвольнасьцю меркаваньняў і блытанымі сэнсамі словаў (5 000 – наклад не маленькі, а рэкордны для беларускай кнігі за гэты год, калі не лічыць падручнікаў і слоўнікаў; «Кнігазбор» друкуе дакумэнты адносна больш-менш вядомых гістарычных асоб і падзей» – о Божа мілы, то-то напісалі!). Рэцэнзія – сапраўды адзін з самых складаных жанраў, які патрабуе вялізнага інтэлектуальнага досьведу й густу. Нездарма па-беларуску мала хто піша ў гэтай форме, хаця на Захадзе гэта найпершы з інтэлектуальных жанраў. Не пакідайце спробаў.

Ігару зь Менску. Адрас газэты «Беларус»: 166-34 Gothic Drive. Jamaica, NY, 11432 USA/ЗША

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Газэта прымае таксама платныя абвесткі

Шукаю працу (15 гадоў, ліцэй-філія пры БДУ). Тэл. 259-78-45. Стась

У Гарадні штопанядзелак і штосераду з 17 да 20 гадзінаў працуе выстава «Невядомая музыка». На ёй прадстаўленыя касэты і кампакты з лепшай беларускай музыкай. Слухай сваё, набывай беларускае! Прыходзь: К.Маркса 11, першы паверх. Тэл.: 72-11-83

Моладзь за ўсіх часоў максымалісцкая. Менавіта таму яна чытае «Слова Нацыі!» **Наша мэта – Рэвалюцыя. Дакладней,** дзьве ў адной: Нацыянальная й Сацыяльная. Набліжай яе – пашырай «Слова Нацыі»! Ахвочыя замовіць ультраправую газэту «Слова Нацыі», дасылайце капэрту з маркаю і купон б/а: 220086, Менск, а/с 121.

Можа, хто адважыцца ўзяць незаводнага, але ўпраўнага шчанючка? Тэл.: 253-80-81, Галіна

Відэафільм «Пяты элемэнт»ды іншыя па-беларуску. Продаж, запіс. Зьвяртацца: (017) 240-78-01, Віталь. 220107 Менск, а/с 150

Штосуботу Таварыства Беларускай Мовы (Румянцава, 13) праводзіць паказ відэафільмаў на беларускай мове. Тэл.: 284-85-11

Ахвочыя атрымоўваць нацыянал-дэмакратычную газэту, орган Народнага Сакратарыяту БНР – «Радавую Беларусь», дашлеце капэрту з маркай і купон б/а. Выйшла 5 нумароў. Неўзабаве будзе №6. Рэдакцыя «Радавае Беларусі». А/с 169, 220030, Менск

Алеся Карнієнку віншую з прамінулым радзінным днём -- ГАРТуйся ў змаганьні й перамажаш! З пашанаю -- Віктар

Рэдакцыя газэты «Радавая Беларусь» віншуе народнага песьняра Дзеда Карнея з днём народзінаў і зычыць яму вечнага творчага натхненьня і ўздыму, каб выКАРАняў трапным словам пустазельле з роднае зямелькі

Аматарку чырвона-зялёных шалікаў віншую з Днём народзінаў!!! Зычу шчасьця ў асабістым жыцьці і ваабшчэ. Гандрусь Міхельсон

Віншую партызанскую Раду МФ з Днём Народзінаў!

Мілая Алёна, віншую з Днём народзінаў. Жадаю здароўя, шчасьця, быць прывабнай і вясёлай. Андрэй

Віншую Какорына Аляксандра Еўдакімавіча з Днём народзінаў. Жадаю здароўя, шчасьця, посьпехаў. А.

Прапануем в/а працу ў хатніх умовах (250 у.а.) – даступна ўсім. Укладзіце 2 кап. + купон б/а. 220089, Менск-89, а/с 122

Прапануем працу дома з высокім заробкам (300 у.а.). Укладзіце 2 капэрты са зваротным адрасам + купон б/а: 220030 Менск-30, а/с 223

У сьпевах, у келіху звоне Разьвеюцца сэрца пакуты. За плугам хай ты ці на троне, Адно помні – нашы Статуты! Адам Міцкевіч

Слава маладым героям з Горадні! Хай хутчэй загоюцца Вашыя раны. Удзячныя суайчыннікі зь Менску

ТАА "СОКТАС"

першы пастаўшчык на Беларусі

СОДЫ КАЛЬЦЫЯНАВАНАЙ

Тел.: (017) 210 42 19, Тел./Факс: (017) 229 22 93

Піва за Беларусь

Мы працягваем стварaць рэйтынг самага беларускага напою. Дасылайце нам лісты з Вашымі сьпісамі пяці найлепшых і аднаго найгоршага піва.

У некаторых папярэдніх лістах прызнаюцца ў любові да лідзкага піва. Вось ужо чаго не разумею. Заўжды мае вадзяністы прысмак, прэснаватае. Але ўсё ж найгоршае — «Жыгулёўскае», асабліва — разьліўное (гідка глядзець, як электарат ля піўных жлукціць гэтую вадкасьць). Піць піва можна дзе заўгодна, а ў мяне асабіста ўлюбёнае месца — ля Траецкага, у тым месцы, дзе Няміга выцякае ў Сьвіслач. А яшчэ добра край куфля памазаць сольлю й так піць — таксама смачна.

Віталь Алісіёнак, Менск

Рэчыцкія гатункі спажываю даўно, а «Старажытнае» толькі некалькі разоў. Менскага гатунку няма ў гомельскіх крамах.

Андрэй Бандарэнка, Гомель

Часьцей п'ю піва з так званых кэг, яно заўсёды сьвежае й халоднае. Цёмныя півы мне падабаюцца больш, чым сьветлыя.

Уладзімер Брэк, Менск

Siolcta za dzień da światkavańnia 5-ch uhodkaŭ Kanstytucyi Miensk światkavaŭ 500-ja ŭhodki atrymańnia prava na samakiravańnic, praŭda, u SMI ab hetaj padzici amal ničoha nic havaryłasia. Upeŭnicny, što bolšaja častka žycharoŭ Miensku nia viedała i nia viedajc pra takuju kruhłuju datu. Vielmi pryjemna, što hety fakt znajšoŭ adlustravańnic na etykietcy piva «Minsk» novaha ŭzoru.

Jahor Hančaroŭ, Miensk

Літаратурны сэмінар

«Варштаты»

Лекцыі

Арт-акцыі

Практыкум

Дыскусіі

Дэклямацыя

Сустрэчы

Кожную нядзелю а 5-й гадзіне вечара (17.00) у сядзібе Таварыства Беларускай Мовы (Менск, вул. Румянцава, 13). Да ўдзелу ў Праекце ласкава запрашаем усіх ініцыятыўных і творчых грамадзянаў Рэспублікі, а таксама Фундатараў, Ахвяравальнікаў, Мэцэнатаў.

Сэмінар вядзе

Славамір Адамовіч

Мне 12 гадоў. Шукаю сяброў, з якімі хачу ліставацца.

Алесь Гайдук.

Вул. Съединение № 2, ап 28, 9000 Варна, България

✝

Ludmiła Bułhakava

1949—1999

Rana, rana ty pajšła

Spačyvaj spakojna, ziamla tabie ivianieckaja pucham

siabry

КУПОН БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Беларускія перадачы Радыё Свабода выходзяць у эфір тройчы на дзень:

· **ПЕРШАЯ ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА**
18.00-19.30 паводле менскага часу (16.00-17.30 UTC)
7295 кгц (41.00 м)
9610 кгц (31.00 м)
11725 кгц (25.00 м)
15565 кгц (19.00 м)

· **ДРУГАЯ (АБНОЎЛЕНАЯ) ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА**
22.00-23.30 паводле менскага часу (20.00-21.30 UTC)
6105 кгц (49.00 м)
9535 кгц (31.00 м)
9750 кгц (31.00 м)
11865 кгц (25.00 м)

· **РАНІШНЯЯ ПЕРАДАЧА**
(ПАЎТОР ПЕРШАЙ ГАДЗІНЫ ДРУГОЙ ВЕЧАРОВАЙ ПЕРАДАЧЫ)
6.00-7.00 паводле менскага часу (4.00-5.00 UTC)
6065 кгц (49.00 м)
7295 кгц (41.00 м)
9635 кгц (31.00 м)
9750 кгц (31.00 м)

ІНТЭРНЭТ: *http://www.rferl.org/bcl/be/belarus*

Паштовы адрас: 220005, Менск-5, п/с 111 • Vinohradska 1, 11000 Praha 1, Чэхія

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА СВАБОДАЙ!

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Набор Аляксандры Макавік. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050 Менск а/с 537. Tel/fax (017) 227-78-92 E-mail: niva@user.unibel.by http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 2838. 8 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 19[ГОД], 23.05.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова N2469

Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня N 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12